ЛіМ
Літаратура і мастацтва
газета творчай інтэлігенцыі Беларусі
8 мая 1998 г. № 19/3947 Кошт 4 000 руб.

МАСТАК СЛУЖЫЦЬ ПРАЎДЗЕ І ІСЦІНЕ
Справаздача старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Васіля ЗУЁНКА на XII з'ездзе СБП
5—7, 14—15

ПАКУЛЬ ЁСЦЬ ЛІТАРАТУРА — ЁСЦЬ НАРОД
Выступленні дэлегатаў XII з'езда СБП
6—7

"ШАПЧУ Я ВЕРШЫ, ЯК МАЛІТВУ"
Вершы Леаніда ЯЎМЕНАВА
8

ЖЫВЕ І БУДЗЕ ЖЫЦЬ!
Старонкі з рамана Генрыха ДАЛІДОВІЧА
8—9, 12

КРОЎ НАШАЙ ВЕРЫ
Уладзімір ГРАМОВІЧ: "У тэатры пачала працаваць творчая лабараторыя з удзелам усіх тэатраў рэспублікі. Дасць яна плён ці не, пакажа час, а наогул хвалюе становішча тэатра і артыста. Які ў іх шлях наперадзе?"
10—11

НАШЫ ПРАГНОЗЫ
Уладзімір КАЗБЯРУК: "Надта ж спакуслівымі з'яўляюцца спробы зірнуць у будучыню. Бяздольныя хацелі б верыць, што яны пазбавяцца ад сваіх бедаў, багатыя — бачыць памножанымі свае набыткі, а цэлыя народы? Тым больш канкрэтна — беларусы?"
13

НЯЛЁГКА БЫЦЬ СЕЙБІТАМ
Перачытваючы спадчыну Фёдара ЯНКОЎСКАГА
16

Надзея з "Белага дома"

"Я — артыстка, я — загадка..." Слушна. Гучыць, як эпіграф.Нездарма ж гэтай песняй пачынала сваю сустрэчу з публікай гераіня бенефісу. Праўда, эпіграфам да яго сталіся радкі з іншай песні: "Мая спеўная душа не стамляецца..." Таксама слушна! І ў гэтым жа таксама яна — артыстка, загадка. Хаця загадкавай артысткай яе не называлі, здаецца, ніколі. А між тым...

Між тым: хіба не загадка — ейны творчы лёс?

У "Чараўніцах" пачынала. У складзе "Верасоў" зведала гонар лаўрэата Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады. Як сольная выканаўца 15 гадоў таму атрымала дыплом Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады і адзіны спецыяльны прыз за лепшую апрацоўку народнай песні. Выступала ў Балгарыі, Бельгіі, Германіі, Лаосе, Сірыі, Чэхіі, Славакіі, Фінляндыі, Польшчы, у краінах СНД. Павандравала (і вандруе) па ўсёй Беларусі, дзе шматлікія прыхільнікі ўспрымаюць і прымаюць яе як сапраўдную народную артыстку. А яна — во дзіва! — нават заслужанай артысткі Беларусі звання не мае.

Ох ужо тыя званні: дадуць — не дадуць... Такой бяды! Галоўнае, мае яна іншае, тое, што Богам даецца і лёсам. Талент спявачкі. Вялікую добрую душу. Шчырыя вочы. Таварыскасць і ўменне сябраваць. Сваю публіку. Любоў блізкіх. Мае імя: Надзея МІКУЛІЧ.

(Працяг на стар. 2)

ЛіМ КОЛА ДЗЁН

Першамай і Дзень Перамогі своеасаблівым чынам павязаныя. Кажуць, Галоўнакамандуючы загадаў, каб традыцыйны першамайскі парад на Краснай плошчы стаў парадам Перамогі. А паколькі сталінскія загады і нават пажаданні выконваліся якім заўгодна коштам, Берлінская аперацыя стала для Чырвонай Арміі грандыёзным кровапусканнем — і ўсё роўна не паспелі... Такія страты ў час, калі вораг фактычна пераможаны, вайна, лічы, скончана і нікуды той Берлін ад Чырвонай Арміі не падзенецца, нельга растлумачыць звычайнай логікай і апраўдаць ваеннай неабходнасцю альбо дзяржаўнымі інтарэсамі.

Хтосьці сказаў, што перамога ва ўсіх падрабязнасцях надта ж нагадвае паразу. А яшчэ нехта — што пераможцы так не жывуць... І ўсё ж — з надыходзячым святам! З Днём Перамогі!

ПАДЗЕЯ ТЫДНЯ

У нашай "некаранаванай сталіцы" ўжо трэці год запар прайшоў фестываль "Музы Нясвіжа". Штораз — новыя музычныя праграмы, штораз — новыя мастацкія ўражанні. Абноўлены позірк на гістарычныя традыцыі, абноўленая відовішчнасць. Абнаўленне ў самой прыродзе... Так, зменлівы характар у нясвіжскіх муз, якімі апякуецца гурт неабыякавых таленавітых творчых людзей. Гэта і аўтар ідэі фестывалю, яго мастацкі кіраўнік М. Фінберг, і музычны кіраўнік Б. Нічкоў, і кіраўнік навуковы — У. Скараходаў, і каментатар канцэртаў В. Дадзіёмава, і гасцінны кіраўнік Нясвіжскага раёна У. Дражын. Поруч — нямала захопленых спадзвіжнікаў, чыннікаў імпрэзы, што збірае шматлікую публіку. Да яе далучаюцца і цікаўныя візіцёры з Мінска. Сёлета на заключны канцэрт прыехалі нават пасол ЗША на Беларусі сп. Д. Спекхард, пасол Рэспублікі Турцыя сп. Ш. Сойсал, прадстаўнікі дыпламатычных місій Венгрыі, Італіі... Вядома ж, ёсць падстава пагаварыць пра нясвіжскую падзею ў адным з бліжэйшых нумароў "ЛіМа".

Фота Віт. АМІНАВА

АДМЕТНАСЦЬ ТЫДНЯ

Як бы добра ні быў спраектаваны горад, ён усё роўна застанецца толькі нагрувашчваннем каменя і шкла, пакуль і ў ім не з'явяцца творы манументальнага і дэкаратыўнага мастацтва. Для Мінска гэтая праблема надзвычай актуальная. Помнікі ў горадзе можна пералічыць на пальцах, а скульптурнай пластыкі дэкаратыўнага характару і таго меней. Таму з'яўленне ў Міхайлаўскім скверы, што непадалёк ад чыгуначнага вакзала, паркавай скульптуры (прычым высокамастацкай) стала для горада падзеяй. Аўтары — скульптар У. Жбанаў і архітэктар Б. Юрцін. Іхні твор у пэўнай ступені функцыянальны, а не толькі эстэтычны. Бо гэта... лаўка, на якой сядзіць прывабная бронзавая жанчына. Можна прысесці побач.

ПОШУК ТЫДНЯ

У Нацыянальным мастацкім музеі экспануецца фотавыстава "У пошуках Беларусі: 12-ы год пасля Чарнобыля". На ёй творы Сяргея Брушко (Беларусь) і Хуга Еггі (Швейцарыя). Ініцыятары выставы — прыгаданы швейцарскі фотамайстар і журналіст Петэр Еггі. Іхнія партнёры ў Беларусі — Сямён Букчын і Сяргей Брушко. Разам яны вандравалі па нашай краіне. У выніку з'явіўся фотаальбом (на грошы швейцарскіх спонсараў) і гэтая выстава, з якімі ўжо азнаёміліся ў Швейцарыі. Цяпер такую магчымасць маюць і мінчукі. Праўда, швейцарскі варыянт альбома і выставы адрозніваецца ад беларускага. У нас альбом і выстава з "белымі плямамі". Шэраг здымкаў выразала цэнзура, знайшоўшы ў іх крамолу.

ВЫСТАВА ТЫДНЯ

У галерэі "Мастацтва" (праспект Ф. Скарыны, непадалёк ад Галоўнага паштамта) выстава жывапісца Аляксея Марачкіна — мастака, шырокавядомага не толькі сваёй творчасцю, але і выразнай грамадскай пазіцыяй. Ад жывапісу да інсталяцыі, ад язычніцкай міфалогіі да сац-арту — такое кола ягоных інтарэсаў. Дарэчы, у язычніцтве мастак знаходзіць тое, што цяпер мы завём "экалагічным мысленнем". Гарманічныя стасункі чалавека і прыроды, чалавецтва і Сусвету. Да таго ж, язычніцтва для Аляксея Марачкіна — гэта першая праява нацыянальнага духу і тое, што лагічна трансфармавалася ў беларускую версію хрысціянства.

ФЕСТЫВАЛЬ ТЫДНЯ

У Віцебску з 6 па 10 мая пройдзе Рэспубліканскі фестываль мастацкай творчасці студэнтаў "Студэнцкая вясна-98". Не іначай гэта робіцца, каб віцебчукі не сумавалі ў перапынку паміж "славянскімі базарамі" і каб не пуставалі фестывальныя пляцоўкі. Дарэчы, па колькасці маштабных культурніцкіх акцый Віцебск можа аспрэчваць лідэрства ў сталіцы краіны.

УШАНАВАННЕ ТЫДНЯ

75-годдзю народнага мастака Беларусі Віктара Аляксандравіча Грамыкі прысвечана выстава, што адкрылася 6 мая ў Нацыянальным мастацкім музеі. Мастак належыць да тых творцаў, пра якіх гавораць, што яны ўвасабляюць эпоху, па карцінах якіх можна вывучаць час. Калісьці маскоўскія крытыкі адзначалі як адметную з'яву беларускую жывапісную школу, беларускі станковы жывапіс. І сапраўды, за жывапіс 60—80-ых гадоў нам не сорамна і сёння. А Віктар Аляксандравіч і зараз працуе плённа.

З НАГОДЫ

Адсвяткавалі...

Свята Дня друку сур'ёзна падпсаваў зацяжны, як прамова бюракрата, травеньскі дождж. Ды і з часам пачатку сустрэчы журналістаў і прэзідэнта РБ атрымалася штосьці недарэчнае. Напярэдадні (4 траўня) рэдакцыю "ЛіМа" папярэдзілі па тэлефоне, што адбудзецца яна а першай гадзіне дня ў нацыянальным прэс-цэнтры. Але Форум журналістаў краін СНД, як высветлілася не без прыкрасці, распачалі ў канцэртнай зале "Мінск" у адзінаццаць. Так што трапіў я сюды, як і іншыя мінскія журналісты, на шапачны, так бы мовіць, разбор. А дакладней, у той момант, калі лепшым журналістам і работнікам друкарскай вытворчасці ўручалі прэміі, падарункі і кветкі. Прэзідэнт расійска-беларускай кампаніі "Слаўнафта" А. Фамін прэміяваў калектыў "Гомельскай праўды", адзначыў падарункамі Беларускую асацыяцыю журналістаў Чарнобыля. Крыху раней Дзяржкамітэтам па друку і Беларускім саюзам журналістаў былі прэміяваны пераможцы леташняга прафесійнага конкурсу: рэдактар брэсцкай абласной газеты "Заря" П. Суцько, прафесар журфака Б. Стральцоў, друкар Мінскага паліграфаб'яднання А. Жылінскі, карэспандэнт газеты "Звязда" А. Ляўковіч, супрацоўнікі часопіса "Беларуская думка" У. Вялічка, У. Глушакоў, В. Шырко, "Народнай газеты" — У. Самойлаў, часопіса "Беларусь" — В. Жылін, тэлежурналіст Л. Дубаневіч, А. Хазянін з "Маладзечанскай газеты", Э. Дамарацкі з газеты "Віцебскі рабочы". Абвяшчалася, што па выніках форуму будзе выдадзена кніга публіцыстыкі. Спонсар — тая ж "Слаўнафта". Канкрэтныя крокі інтэграцыі... І не толькі з Расіяй. У Форуме бралі ўдзел і прадстаўнікі іншых краін СНД.

Крыху раней прагучала прамова прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі. З імпэтам выступаў прафесар Б. Стральцоў — "бацька" многіх беларускіх газетчыкаў. Некалькі гадзін потым прэзідэнт адказваў на пытанні тэле- і радыёжурналістаў, прадстаўнікоў "папяровых" СМІ. Рабіў гэта, як і заўжды, пераканана, з аптымізмам і надзеяй на лепшае.

У гэты ж дзень у сталіцы быў урачыста адкрыты Дом журналістаў.

Карацей, Дзень друку адсвяткавалі. Зноў да рэдакцыйных сталоў, паважаныя спадары! Да чыстых аркушаў паперы!

Яўген РАГІН

На здымку: прэмія Беларускага саюза журналістаў уручаецца прафесару факультэта журналістыкі БДУ Барысу Стральцову.

Фота А. Нікалаева, БелТА

БРАВА!

"Калі за табою — краіна..."

Патэлефанавалі з Рэспубліканскага каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі: "У нас — вялікі поспех! 12-гадовы Алег Яцына, вучань Лініі Умновай, стаў лаўрэатам II прэміі Міжнароднага конкурсу скрыпачоў у Францыі. Конкурс вельмі складаны і прэстыжны, бо ягоны прэзідэнт — сам славуты Ягудзі Менухін. А ўдалае выступленне Алега — гэта, зразумела, і заслуга ягонага педагога, і заслуга канцэртмайстра — выдатнага саліста і чулага акампаніятара Цімура Сергяені, дарэчы, мужа Лініі Уладзіміраўны..."

Тэлефаную Л. Умновай. Віншую з поспехам, распытваю...

— Конкурс Ягудзі Менухіна, — расказвае Лілія Уладзіміраўна, — з'ява выбітная. Як, дарэчы, і легендарная асоба самога маэстра. У свае 82 гады ён здзіўляе энергіяй: прысутнічае на ўсіх конкурсных турах, іграе з аркестрам, дырыгуе... Сёлета на ўдзел у спаборніцтве скрыпачоў ва ўзросце да 16 гадоў было пададзена 250 заявак у выглядзе аўдыё- і відэакасет, у выніку адбору да конкурсу былі дапушчаны 24 музыканты з Японіі, Карэі, Расіі, Кітая, Беларусі, Германіі, Аўстраліі, Харватыі... Зразумела, у такой узроставай катэгорыі кожны год мае вялікае значэнне, і ў гэтым свая складанасць. 1-е месца заняла кітайская скрыпачка, якой ужо 16. Алег стаў другім. Што цікава, абодва ў фінальным туры гралі Канцэрт Кабалеўскага...

Уражанні — самыя добрыя. Конкурс адбываўся ў мястэчку Булонь Сюрмэр, што на беразе мора. Узровень арганізацыі — бліскучы, для рэпетыцый былі прадастаўлены класы з цудоўнымі раялямі. Жылі мы ў французскай сям'і, якая вельмі за нас "хварэла" — гаспадар дома нават узяў адпачынак на час конкурсу, каб сачыць за падзеямі, хаця сам — не музыкант, працуе ў банку. Поспех Алега быў для нашых гаспадароў не проста радасцю, а і гонарам. Увогуле, конкурс уразіў узроўнем падрыхтоўкі мададых скрыпачоў: вышэй за сярэдні, выбраць лепшых было нялёгка. Наш Алег зрабіўся ўлюбёнцам журы, у якім былі 9 вядучых скрыпачоў з Германіі, Вялікабрытаніі, ЗША. Захоплена прымала яго і публіка, многія проста падыходзілі да нас пасля выступлення.

Я не думаю, што ў гэтым поспеху ёсць выключная заслуга кагосьці аднаго. Мая — напэўна, у тым, што змагла разгледзець талент Алега Яцыны. І мне будзе цікава сустрэцца з ім некалі як з дарослым выканаўцам — вядома ж, музыкант па-сапраўднаму выяўляе, чаго ён варты, толькі гадам к 30-ці, калі працуе ўжо самастойна, без педагога. Прыемна было за Цімура Сергяеню, якога адзначылі аўтарытэтныя прафесійнікі, а лорд Менухін назваў "чалавекам-аркестрам". Нам, лічу, як нікому на гэтым конкурсе пашанцавала, бо мы паехалі **падрыхтаванай камандай.** І мы вельмі ўдзячныя за веру ў нашу каманду і за яе падтрымку — з боку кіраўніцтва каледжа, з боку Міністэрства культуры, якое знайшло магчымасць аплаціць усе выдаткі. Калі адчуваеш, як і ўсе іншыя ўдзельнікі конкурсу, што за табою — **краіна**, тады і адказнасць, і ўздым, і годнасць...

Адзінае, але вялікае засмучэнне — скрыпка Алега: ён вымушаны граць на інструменце, які не вытрымлівае ніякай крытыкі. Дзякуй Богу, гэта не адбілася на выніку ягонага выступлення...

С. Б.

Фота К. ДРОБАВА

ДУША

"Дні ружовай кветкі"

Усе мы пад Богам. Ні самі, ні сябры, ні нашчадкі нашы — ніхто не застрахаваны ад бяды, ад немачы. Чалавек здаровы рэдка зважае, што ў грамадстве нашым існуе сацыяльная дыскрымінацыя тых, у чыім нямоглым, фізічна непаўнацэнным целе трывае багаты і дзейсны дух або гарыць агеньчык творчага таленту... Нагадаць пра ўсё гэта, скіраваць грамадскую свядомасць на праблемы аздараўлення нацыі (і фізічнага, і маральнага) і сацыяльнай адаптацыі інвалідаў (стварэнне пандусаў для калясак на вуліцах, у месцах адпачынку, прыстасаванняў у транспарце і да т.п.), — з такой вось мэтай правялі сваю першую акцыю арганізатары "Дзён ружовай кветкі" ў Мінску.



Вядучы яе заключнай імпрэзы, старшыня аргкамітэта, навуковец і тэлежурналіст Данат Яканюк бачыць у сінтэзе міласэрнасці і мастацкай творчасці адмысловае адраджэнне колішняй традыцыі. Вядома, што пасля руска-турэцкай вайны, з часу якой спаўняецца 120 гадоў, у Мінску ды ў Вільні лячыліся шматлікія яе ваяры. Скалечаных і хворых даглядалі сёстры міласэрнасці, проста добрыя людзі. У знак удзячнасці нямоглыя дарылі ім зробленыя ўласнымі рукамі штучныя ружовыя кветкі...

Удзельнікі сённяшніх "Дзён ружовай кветкі" ладзілі сустрэчы і канцэрты. На заключнай дабрачыннай імпрэзе ў зале "Мінск" выступалі музыканты і салісты Эстраднага аркестра Беларускага таварыства інвалідаў па зроку (мастацкі кіраўнік С. Багданаў, дырыжор Л. Карпенка), калектывы Беларускага універсітэта культуры "Баламуты" (кір. В. Трамбіцкая), "Валачобнікі" (кір. С. Дробыш), гурт "Беларусы". А таксама ансамбль пантамімы "Рух" (кір. Т. Бекіш) Беларускага таварыства глухіх, дзіцячы ансамбль з Міханавічаў "Калыханка" (кір. Л. Рыжкова) ды знакаміты "Палац". Дыктар-сурдаперакладчык БТ В. Чудакова ды студэнты-валанцёры з БУКа дапамагалі ладзіць гэтую кранальную, шчырую, жыццесцвярджальную вечарыну, у якой на роўных удзельнічалі і тыя, каго прырода шчодра надзяліла здароўем, і тыя, каму Бог даў вялікую мужнасць змагацца з цялеснай нямогласцю, сцвярджаць чалавечую годнасць і талент. Усім удзельнікам канцэрта дарылі жывыя ружы...

С. Б.

На здымку: ансамбль пантамімы "Рух".

Фота А. ПРУПАСА

ВІНШУЕМ!

Стаў акадэмікам

Міжнародная акадэмія навук аб прыродзе і грамадстве на аснове свайго статута выбрала сапраўднага члена акадэміі Анатоля Сабалеўскага членам Прэзідыума гэтай установы па аддзяленні "Мастацтвазнаўства, музеязнаўства і калекцыяніраванне". Як вядома, Анатоль Вікенцьевіч — чалавек знакаміты ў навуковых колах. Доктар філалагічных навук, ён даўно і паспяхова даследуе праблемы сучаснага тэатра, у тым ліку пытанні ўзаемасувязяў і кантактаў беларускага тэатра з тэатрамі іншых краін, вядзе плённую выкладчыцкую дзейнасць, з'яўляецца галоўным рэдактарам часопіса "Тэатральная творчасць". Заслугі А. Сабалеўскага высока ацэнены не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, а і далёка за яе межамі. Тым больш прыемная навіна, якая прыйшла нядаўна...

Створаная ў 1994 годзе Міжнародная акадэмія навук аб прыродзе і грамадстве аб'ядноўвае больш чым 300 навукоўцаў і спецыялістаў з 20 краін. Сярод іх лаўрэаты розных прэмій, у тым ліку такіх прэстыжных, як Нобелеўская, акадэмікі нацыянальных акадэмій — для прыкладу: Расійскай, Н'ю-Йоркскай, Італьянскай і іншых. Галоўная мэта акадэміі — кансалідацыя вучоных, спецыялістаў розных краін і каардынацыя іх дзейнасці для вырашэння глабальных, агульначалавечых праблем, стварэння інтэрнацыянальнай інфармацыйна-пазнавальнай прасторы, свабоднага абмену ведамі, ідэямі, навуковымі і практычнымі вынікамі інтэлектуальнай дзейнасці.

Акадэміяй зацверджаны памятныя нагрудныя знакі і медалі, якімі ўзнагароджваюцца найбольш актыўныя і дастойныя яе члены. Анатоль Вікенцьевіч атрымаў памятны нагрудны знак, што ўяўляе сабой пазалочаны партрэт-барэльеф буйнейшага вучонага сучаснасці Альберта Эйнштэйна з надпісам "Міжнародная акадэмія навук аб прыродзе і грамадстве".

Надзея з "Белага дома"

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

Мае, што спяваць: народныя беларускія песні ва ўласнай апрацоўцы, творы Я. Глебава, Л. Захлеўнага, У. Будніка, В. Іванова, І. Лучанка, І. Паліводы, Д. Даўгалёва, В. Сярых, Э. Зарыцкага, Э. Ханка дый тыя, якія сама складае, — на вершы М. Танка, Н. Гілевіча, А. Вярцінскага, Н. Тулупавай, Э. Агняцвет, В. Аколавай, Л. Пранчака... Падчас бенефісу ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі Надзея Мікуліч выканала без малога тры дзесяткі песень, прадставіўшы і новых сваіх партнёраў па творчасці: М. Яцкова, Л. Ляпко, А. Харавец...

Дарэчы, не кожная эстрадная спявачка можа гэтак адзначыць свае 25 (калі прыгожая лічба азначае не колькасць пражытых гадоў, а ўзрост сцэнічны): у росквіце сіл і папулярнасці. Не кожнай хопіць душэўнай шчодрасці ды пачуцця гумару пахваліцца сваёй "пенсіяй за творчы стаж", якая дазваляе ўздыхнуць з палёгкай, расправіць крылы — і з яшчэ большым натхненнем спяваць. Спяваць пра жанчыну, пра каханне, пра душэўныя пакуты; пра тое, што выклікае ўсмешку і ўзнімае настрой. Спяваць пра жыццё і пра сябе.

"Вы не падумайце, што Надзя толькі на сцэне такая — шчырая, шчодрая, вясёлая, таварыская. Яна такая заўсёды", — прамовіла ў мікрафон артыстка, якая выйшла павіншаваць калегу і сяброўку. Вядома ж — заўсёды! Бо інакш не было б гэтай цёплай, упрыгожанай кветкамі, дасціпнымі экспромтамі, сюрпрызамі, вечарыны, якая доўжылася каля чатырох гадзін. Уяўляеце?

А з колькіх кранальных імгненняў складаліся тыя гадзіны! Пасля грымлівых "мінусовак" — жывыя галасы акустычных гітар ды губнога гармоніка. Пасля бліскучых какошнікаў ансамбля "Славянскі сувенір" — прачулае беларускае слова старшыні Бабруйскага райвыканкама Анатоля Глаза, які прывёз з сабою лепшых самадзейных танцораў раёна. А дасціпная музыкантка-руплівіца Валянціна Карэлікава, якой "хораша ў промнях славы" Надзеі Мікуліч; каларытная "Бяседа"; купка "Чараўніц" на чале з Генадзем Лятынскім — неспадзяваны напамінак пра Гародню 68-га! І дзівосная спявачка, настаўніца — Ірына Аляксандраўна Палянская, дзякуючы якой Надзея, страціўшы голас пасля нараджэння дачкі, заспявала зноў і вярнулася на эстраду...

Радасць святочнага выступлення падзялілі з ёю гітарыст Аляксандр Ляднёў; эстрадны музыкант Леанід Клунны ды оперная "зорка" Рыгор Палішчук (абодва — партнёры Н. Мікуліч у "Трыо таўстуноў"); незаслужана забытая жорсткім шоу-бізнесам сапраўдная прафесійніца, майстар жывога гуку Людміла Ісупава; "самы вялікі спявак" Алег Цівуноў, які падараваў канцэртны нумар... у выкананні Таццяны Арлоўскай.

І тое, што ў зале былі маці ды брат Надзеі Мікуліч; і тое, што віншаваць яе выходзілі старшыня Беларускага дзіцячага фонду Уладзімір Ліпскі з маленькай мужнай пакутніцай, мастачкай Сашай Гушчай, якая паведаміла пра ганаравание артысткі званнем "Сябра дзяцей"; і тое, што гучала новая песня "Волечка", прысвечаная дачцэ Надзеі Мікуліч, — усё наводзіла на думку пра загадкавую шчырасць нашай эстрады. Ну, а калі з'явіліся Ядвіга Паплаўская ды Аляксандр Ціхановіч, калі прытушылі пражэктары і над сцэнай засвяціўся экран з кіназдымкамі "Верасоў" сярэдзіны 70-х, калі пад воплескі здзіўленай публікі выйшлі яшчэ трое колішніх удзельнікаў ансамбля і ўрэшце заспявалі гэтым сціплым, але магутным складам папуры на тэмы сваіх лепшых тагачасных песень... Дайце веры, можна было расчуліцца!

Сябры гаварылі пра яе як пра шчодрую крыніцу любові ды цяпла. Хораша казалі пра ейны гасцінны дружны дом — "Белы дом". (Гэтую сям'ю называюць "Белым домам" з-за прозвішча гаспадара, адміністрацыйнага работніка філармоніі, — Барыса Белага).

І жартавала гаспадыня вечарыны: "Ну, вось: муж — Белы, дачка — Белая. І толькі я адна — Надзея Мікуліч".

Артыстка, загадка?..

С. БЕРАСЦЕНЬ

Фота К. ДРОБАВА

АБСЯГІ

ВІЦЕБСК...

Гран-пры "Белай амфары"

Рэспубліканскі конкурс мадэльераў-дызайнераў і манекеншчыц "Белая амфара-98", які чатыры дні радаваў Віцебск, падвёў свае вынікі. Як адзначыў на закрыцці "Белай амфары" першы віцэ-прэзідэнт канцэрна "Беллегпрам" Аляксандр Міхневіч, конкурс спалучыў мастацтва высокай моды і практычнае прамысловае мадэліраванне, з'явіўся сапраўдным стымулам творчасці мастакоў моды.

Дарэчы, у Віцебск з'ехалася 146 мадэльераў з 19 гарадоў Беларусі. Гран-пры і прэмія ў паўтары тысячы долараў у намінацыі "Прамысловае мадэліраванне" прысуджана Алене Мітт з Мінска за калецыю "Воблака на пяску". Першыя месцы ў конкурсе атрымалі мадэльеры Людміла Тараканава (Віцебск), Уладзімір Радановіч і Надзея Дайнека (Мазыр), Алеся Андраюк і Вольга Ламака (Мінск), Вольга Самошчанка і Святлана Афанасьева (Салігорск).

Святлана ГУК

БРЭСТ...

Каб не бавіць час марна

У Кобрыне і раёне прайшоў абласны семінар метадыстаў раённых і гарадскіх метадычных цэнтраў пры аддзелах культуры. Тэма семінара — "Вольны час і выхаванне асобы". Клубныя работнікі Кобрыншчыны паказалі шэраг мерапрыемстваў для розных узроставых і прафесійных груп насельніцтва: вечар адпачынку "Ля каміна", абрад "Ушанаванне сям'і", дзіцячую Спартландыю...

Праблема арганізацыі вольнага часу застаецца для работнікаў культуры адной з галоўных. Таму семінары такія праводзяцца ў вобласці рэгулярна.

Святлана ГУЛЯЕВА

МАГІЛЁЎ...

"Гукі Айчыны"

У Дрыбіне адбылася прэзентацыя зборніка вершаў "Гукі Айчыны" паэта і прыродазнаўцы з мястэчка Прылесіна Анатоля Андрэевіча Кананкова. Зборнік выйшаў дзякуючы садзеянню сярэдняй школы, бібліятэкі і пры фінансавай падтрымцы мясцовага райвыканкама. Дрыбінскі аддзел культуры райвыканкама з гэтай нагоды правёў сустрэчу за "круглым сталом", у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі мясцовай творчай інтэлігенцыі.

Свята духавых аркестраў

У Палацы піянераў прайшло сапраўднае свята духавых аркестраў, арганізаванае абласной філармоніяй. Жыхары Магілёва змаглі ўбачыць і пачуць выступленні духавога аркестра "Фанфары Беларусі" Беларускай акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам Аркадзя Берына, заслужаную артыстку Расіі, прафесара Маргарыту Шапашнікаву разам з яе вучнямі — квартэтам саксафаністаў Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных, камерны духавы аркестр Рэспубліканскага музычнага каледжа і пры Беларускай акадэміі музыкі пад кіраўніцтвам народнага артыста Расіі Льва Муранава. Скончылася свята выступленнем зводнага аркестра, які выканаў цыкл старажытных яўрэйскіх мелодый.

Творчая акцыя

На Магілёўшчыне завершана традыцыйная творчая акцыя "Чарнобыльскі шлях". Гэтая акцыя, арганізатарамі якой з'яўляюцца Міністэрства культуры і Міністэрства надзвычайных сітуацый, Дзяржаўны камітэт па справах моладзі, Беларускі дзіцячы фонд і БСМ, праводзіцца ўжо дванаццаты год. Сёлета творчая група, у склад якой увайшлі кампазітар Эдуард Зарыцкі, спявак Віктар Стральчэня, цыганскі ансамбль "Рунь", цыркавая група "Мінчанка", іншыя сталічныя калектывы і выканаўцы, наведалі Клімавіцкі, Касцюковіцкі, Краснапольскі і Чэрыкаўскі раёны. Разам з імі выступалі таксама і мясцовыя дзіцячыя калектывы. Пасля заканчэння акцыі юныя артысты, вучні мясцовых музычных і мастацкіх школ атрымалі ад удзельнікаў падарункі.

Алесь ПЯТРОВІЧ

ГОМЕЛЬ...

Сорак гадоў з мальбертам

Сёння ў Светлагорскім краязнаўчым музеі адкрываецца персанальная выстава жывапісца Міхаіла Андыка. Добра вядомы ён на Гомельшчыне. Нарадзіўся ў глыбі Палесся, на Тураўшчыне. Зараз жыве і працуе ў Светлагорску. Мастак адметны, сапраўдны пясняр беларускага Палесся. Яго шматлікія жывапісныя палотны экспанаваліся ў Гомелі, Мінску, Маскве, выстаўляліся ў мастацкіх галерэях Урала і Далёкага Усходу. Міхаіл Пятровіч — двойчы дыпламант усесаюзных мастацкіх выстаў. На гэтай экспануецца 80 работ. Кожная — сапраўдны гімн беларускім лясам, рэкам і азёрам. Выстава ў Светлагорску прымеркавана да 40-годдзя творчай дзейнасці мастака.

Памяць Веткаўшчыны

Пятага траўня ў Веткаўскім Доме культуры адбылася прэзентацыя кнігі "Памяць". Двухтомнік выйшаў у выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя". Падзея ў жыцці раёна надта адметная. Кніга ўвабрала ў сябе гісторыю знакамітага краю, звесткі пра лёсы загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне землякоў, інфармацыю пра культурную спадчыну, развіццё сельскай гаспадаркі і мясцовай вытворчасці, пра слынных людзей, якія нарадзіліся на гэтай зямлі (напрыклад, пра паэта Дзмітрыя Кавалёва, міністра замежных спраў былога СССР Андрэя Грамыку). Асобныя раздзелы двухтомніка прысвечаны мастацкім здабыткам веткаўцаў, восем з якіх з'яўляюцца членамі Саюза мастакоў.

У прэзентацыі кнігі "Памяць" прынялі ўдзел жыхары горада і раёна, журналісты, аўтары артыкулаў, мясцовая інтэлігенцыя.

Аляксей ШНЫПАРКОЎ

Быць "кніжнаму Оскару"?

Магчыма, неўзабаве падобная прэмія ў нашай краіне і на самой справе з'явіцца. Ва ўсякім разе, Беларуская асацыяцыя кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў вырашыла ўстанавіць спецыяльны прыз, які будзе прысуджацца "Кнізе года", "Лепшай дзіцячай кнізе" і "За лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэматыкі". Сама статуэтка ўжо зроблена, а вось назвы, прытым дакладнай, ёмкай, няма. Таму і запрашаюцца ўсе жадаючыя прыняць удзел у своеасаблівым конкурсе. Рэдакцыя газеты "Кніжны свет", якая змясціла выяву будучага прыза, просіць накіроўваць свае прапановы па адрасе: г. Мінск, Машэрава, 11, Беларуская асацыяцыя кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў, з паметай "Кніжны свет".

Госця з Гародні

Перасыпаю сонечны пясок,
вучуся простай шчырасці ў Купалы.
На кросенцах, дзе гукі не ступалі,
сную, не дыхаючы, паясок.

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА

Напрыканцы красавіка ў музеі Янкі Купалы адбылася вечарына "Вучуся шчырасці ў Купалы", прысвечаная творчай дзейнасці Дануты Бічэль-Загнетавай. Невыпадкова менавіта гасцінны Дом Купалы сабраў шчырых прыхільнікаў творчасці беларускай паэтэсы. Бо ў 1984 годзе за кнігу паэзіі "Дзе ходзяць басанож" Д. Бічэль-Загнетава ў ліку першых атрымала Дзяржаўную прэмію Беларусі імя Янкі Купалы.

Сваё ўдзячнае слова прыйшлі сказаць народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль, літаратары і сябры Дануты Янаўны: Хрысціна Лялько, Ірына Крэнь, Валянціна Коўтун, Ірына Жарнасек, Сяргей Панізнік, Леанід Дранько-Майсюк, Леанід Галубовіч, Міхась Скобла, Уладзімір Конан, Вера Буланда. На вечарыне гучалі песні на словы Д. Бічэль-Загнетавай у выкананні выхаванцаў дацэнта Беларускай акадэміі музыкі Валерыя Жывалеўскага, навучэнцаў музычнага вучылішча імя Глінкі і гурта "Дзень Незалежнасці". Да імпрэзы была прымеркавана выстава "Кахаю... Люблю. Беларускаму краю бясконца я слова "люблю" паўтараю", экспанаты якой распавядаюць пра жыццё і творчасць паэтэсы.

На здымку з гэтай выставы: Мар'ян Дукса, Славамір Хадаронак, Мікола Федзюковіч, Яўген Крупенька, Данута Бічэль-Загнетава, Жэня Янішчыц на V Усесаюзнай нарадзе маладых пісьменнікаў. Масква. 1968.

Дзіяна КАВАЛЕВІЧ,
старшы навуковы супрацоўнік музея Янкі Купалы

І тчэ ўпэўнена рука

Заўсёды была багатай на народныя таленты капыльская зямля. Не паменела іх і цяпер. Як і раней, тут жыве нямала сапраўдных самародкаў. Адна з іх — Н. Сіманчук. Жанчыне споўнілася 70 гадоў, але яна па-ранейшаму не развітваецца з любімым заняткам. Умее са звычайных нітак сплесці такія рэчы, што душа радуецца. У гэтым змаглі пераканацца ўсе, хто пазнаёміўся з персанальнай выстаўкай Н. Сіманчук, наладжанай у памяшканні Капыльскай раённай бібліятэкі. На ёй можна было ўбачыць вазы, розныя дэкаратыўныя вырабы і нават грацыёзных лебедзяў.

НОВАЕ

Інаугурацыя Беларускага Калегіума

8 мая а шостай гадзіне ў музеі Максіма Багдановіча адбудзецца інаугурацыя Беларускага Калегіума і першая публічная лекцыя (яе прачытае паэт Алесь Разанаў), з якой, уласна, і распачнецца рэальная дзейнасць гэтага унікальнага для нашай сітуацыі, праекта.

Беларускі Калегіум паўстаў у лістападзе 1997 г. з ініцыятывы шэрагу беларускіх арганізацый і прыватных асобаў. Практычна ён будзе рэалізоўвацца ў супрацоўніцтве з Польскім інстытутам у Мінску і выкладчыцкімі асяродкамі Варшаўскага і Львоўскага універсітэтаў.

Ідэя Беларускага Калегіума аб'яднала вакол сябе многіх нацыянальна заангажаваных інтэлектуалаў, навукоўцаў, літаратараў, журналістаў, дзеячаў мастацтва і культуры. Але шырокая беларуская грамадскасць пра гэты праект амаль нічога не ведае, таму я папрасіў дырэктара Беларускага Калегіума, кандыдата філасофскіх навук Алеся АНЦІПЕНКУ адказаць на некалькі пытанняў, якія натуральна ўзнікаюць на пачатку кожнай новай справы.

— Спадар Алесь, найперш патлумачце, калі ласка, што азначае слова "калегіум"?

— Прамое значэнне слова "калегіум" — "саюз", "супольнасць" і "таварыства", але ў корані слова хаваецца і яшчэ адно значэнне — "збіраць". Думаю, што для нашай цяперашняй сітуацыі гэтае значэнне мае сімвалічнае гучанне. Урэшце, традыцыя — гэта і ёсць тое, што збіраецца ці што збіраюць. У сучасным, трансфармаваным выглядзе "калегіум" гэта тое самае, што і "каледж".

— Наколькі я разумею, у нас няма недахопу ў адукацыйных установах самага рознага тыпу і кшталту. Скуль жа тады і чаму ўзнікла патрэба ў стварэнні Калегіума?

— У свой час, пэўна ўжо каля дзесяці год таму адзін беларускі філосаф-мадэрніст сфармуляваў тэзу: быць прысутным і існаваць азначае быць укарэненым у тэкст, быць рэпрэзентаваным праз яго і ў ім. Пад тэкстам пры гэтым не трэба разумець толькі тэксты пісьмовыя, тэкстам, да прыкладу, можа быць музычны твор ці твор жывапісу, увогуле любы сапраўдны твор мастацтва. Вялізным тэкстам ці гіпертэкстам з'яўляецца і тая ці іншая культурная традыцыя.

Тэза была сфармуляваная якраз у той час, калі, з аднаго боку, сталася відавочным, што шматлікія тэксты, створаныя сацрэалістамі і спецыялістамі па дыялектычным і гістарычным матэрыялізме, з'яўляюцца тэкстамі фальшывымі і па сутнасці не маюць аніякага дачынення да беларускай культурнай традыцыі, а з другога боку, беларускі гіпертэкст выглядаў яўна недапісаным, прычым у самых важных ягоных фрагментах.

З таго часу, нягледзячы на цяжкасці і перашкоды, быў створаны даволі істотны корпус культуралагічных, філасофскіх, мастацтвазнаўчых і іншых тэкстаў, якія публікаваліся ў "Нашай Ніве", "ЗНО", "Фрагментах", "ЛіМе" і іншых выданнях. З'яўленне гэтых сур'ёзных тэкстаў безумоўна сведчыць пра аднаўленне ці, калі заўгодна, частковую рэстаўрацыю тэксту беларускай культурнай і інтэлектуальнай традыцыі.

Назапашванне "крытычнай масы" тэкстаў заўсёды мае сваім вынікам пашырэнне кола дыскурсу і цікаўнасці да гэтага дыскурсу. Адсюль і паўстае праблема перадачы альбо трансляцыі тэксту, а гэта і ёсць праблема адукацыі. Таму Беларускі Калегіум — гэта перадусім адукацыйная інстытуцыя, адзін з прынцыпаў дзейнасці якой — навучэнне і крытычнае мысленне, заангажаваныя ў беларускую культурную традыцыю і сучасную сітуацыю.

За гэтыя гады яскрава выявілася яшчэ адна істотная акалічнасць: беларускі гіпертэкст і беларускі дыскурс з'яўляюцца натуральнай часткай сярэднееўрапейскай культурнай і інтэлектуальнай традыцыі і прасторы. Дарэчы адзначыць, што менавіта ў гэтым (сярэднееўрапейскім і заходнееўрапейскім) канктэксце і існавалі калегіумы на Беларусі ў XVI—XIX стст. А зніклі яны разам з гвалтоўнай "пераарыентацыяй" беларускай культурнай традыцыі на ўсход.

— У чым канкрэтна будзе палягаць дзейнасць Калегіума? Якія формы, метады, прынцыпы вы маеце намер выкарыстоўваць? І яшчэ: дзейнасць Калегіума будзе сканцэнтравана выключна на адукацыі ці мяркуецца распаўсюдзіць яе і на іншыя гуманітарныя сферы?

— Вышэй ужо адзначалася, што Калегіум — гэта адукацыйная інстытуцыя, і ў якасці такой прапануе дадатковае бакалаўрскае і магістарскае навучанне па спецыялізацыях філасофія/літаратура, журналістыка і найноўшая гісторыя. Падкрэслім, што гэта менавіта дадатковае навучанне, якое не замяшчае традыцыйнай вышэйшай адукацыі і рэалізуецца ў тых курсах і ў тых фрагментах ведаў, якія адсутнічаюць у традыцыйных навучальных праграмах. Пры гэтым праз пэўны час будзе распрацавана сістэма дыстанцыйнага навучання, збудаваная паводле прынцыпу Адкрытага Універсітэта.

Але Калегіум — гэта не толькі адукацыйная інстытуцыя, гэта таксама месца публічных лекцыяў, семінараў і дыскусій, урэшце аб'яднанне выкладчыкаў, навукоўцаў, інтэлектуалаў, людзей мастацтва і культуры. Публічныя лекцыі якраз і распачынаюцца ў маі.

Калегіум плануе таксама займацца навуковымі праектамі, выдавецкай дзейнасцю, стварыць бібліятэку навуковых, перыядычных і метадычных выданняў.

— Сёння цяжка сабе ўявіць, што хоць які праект можа быць маштабна разгорнуты без адпаведных фінансавых сродкаў. Адсюль і пытанне: Калегіум будзе функцыянаваць, абапіраючыся выключна на добраахвотную дзейнасць валанцёраў ці мяркуецца недзе знайсці грошы і тым самым забяспечыць належны ўзровень прафесіяналізацыі і стабільнасці гэтай грамадзянскай ініцыятывы?

— Часткова Калегіум будзе дзейнічаць на валанцёрскіх пачатках, але што тычыцца распрацоўкі курсаў лекцый, правядзення семінараў і г.д., то, безумоўна, мы будзем шукаць спонсарскую падтрымку як унутры краіны, так і ў міжнародных фондах і дабрачынных арганізацыях.

— Ну што ж, як кажуць, — у добры шлях. Плёну вам і вашым калегам!

Гутарыў Валянцін АКУДОВІЧ

КОНКУРСЫ

Ад сустрэчнага руху тэатра

90 п'ес 60 аўтараў бралі ўдзел у леташнім конкурсе драматургіі "Чалавек і час", — конкурсе, які абвяшчала Міністэрства культуры Беларусі. 19 чалавек атрымалі прызы. Лепшая п'еса прэтэндавала на заахвочванне памерам каля тысячы даляраў.

Між тым драматургія — ці не самая датклівая галіна літаратурнае творчасці. Хоць бы таму, што п'еса і шуфляда стала, гатовая прыняць і захоўваць яе на нявызначаны тэрмін, — рэчы мала сумяшчальныя. Або таму, што падзеі ў галіне драматургіі, як і ў кожнай іншай літаратурнай галіне, залежаць ад асобаў надта рэдкага таленту і дужа адмысловага гарту, а розгалас ды поспех забяспечвае надта зменлівы, надта размаіты кантынгент, імя якому — тэатральная публіка. І толькі ў тым выпадку, калі ўзровень падзеі драматургічнай падтрымае тэатральнае ўвасабленне... Чым жа тлумачыцца такое рэдкае намаганне "Чалавека і часу" паразумецца й вызначыцца? Гэтае пытанне адважыўся паставіць і прааналізаваць галоўны рэдактар рэпертуарнай калегіі Міністэрства культуры Беларусі Вацлаў ВАЛАДЗЬКО.

— Быў час, калі мы не рызыкавалі абвяшчаць конкурсы: аўтараў зусім не набіралася. Мы перажывалі пазачасоўе, само грамадства нібыта вытрымлівала паўзу. Нават нашы намаганні заказаць п'есу не давалі вынікаў. Аўтары адмаўлялі. Маўляў, п'еса — гэта ж не фельетон... Дый матэрыяльнае заахвочванне аўтараў было не надта высокім. "Чалавек і час" быў няблага забяспечаны фінансава. Лепшая п'еса для драматычнага тэатра прэтэндавала на прэмію памерам каля тысячы даляраў. Па розных намінацыях прэмій таксама было шмат. Мяркую, да ўсяго драматургі адчулі сваю запатрабаванасць. Драматург, калі піша, павінен ведаць, што напісанае ім калісьці камусьці спатрэбіцца. Калі няма гэтага адчування, дык, напэўна, працаваць не дужа хочацца...

Новую эру драматургічных конкурсаў Міністэрства культуры распачало ў 1994 годзе, абвясціўшы конкурс пад назвай "Гісторыя і сучаснасць". Да гэтага Міністэрства культуры, не разлічваючы на вялікую колькасць аўтараў, намагалася хоць бы звесці драматурга і тэатр у супольнай працы. Агляды драматургіі і тэатральнага мастацтва якраз і мелі на ўвазе гэтую работу: драматург і пастановачная група атрымлівалі ўзнагароду (разлік) па выніку — спектакля. Фестываль беларускай драматургіі ў Віцебску ў 1987 годзе якраз і быў цалкам прысвечаны падобным работам. Але ж ці ўсе патэнцыйна перспектыўныя аўтары мелі магчымасць дапяць да тэатра? Адзінкі, на жаль, адзінкі...

У 1994 годзе зрабілася відавочным: жаданне пісаць і выказваць сябе праз тэатр у драматургаў не знікла. Праўда, яны празмерна захапляліся фальклорнымі матывамі, інсцэніроўкамі, вельмі надзённым было і намаганне ўзняць тэму нацыянальнай самасвядомасці, адчування свайго месца ў гісторыі...

Ужо тады на конкурс Алена Папова прадставіла "Дзень карабля", — п'есу пра, так бы мовіць, людзей у скрутах дзяржаўнае сістэмы, таленавітых, адметных, але няздольных прабіцца ды спраўдзіцца... П'еса бліскуча ўвасоблена на сцэне Коласаўскага тэатра ў Віцебску рэжысёрам Віталем Баркоўскім.

Новы конкурс пусціў у прафесійны ўжытак п'есу Паповай "Развітанне з радзімай" (з людскімі праблемамі постсавецкага часу). Калі арыентавацца на Алену Папову, дык просіцца назіранне: перамены ў нашым постсавецкім грамадстве ўжо далі падставы для з'яўлення новай драматургіі — новага мастацкага ўзроўню новага мастацкага аб'ёму. Тэатр без падобнай драматургіі, як бы ні абагаўлялі класіку, нездатны паразумецца з сучаснікам напоўніцу...

Побач з "Весніцамі" Алега Ждана легла "Карона Вялікага княства Літоўскага" Уладзіміра Бутрамеева ды "Уладзімір і Рагнеда" Аляксея Дударава. Падобная тэматыка (як відаць з назоваў) гледачу вельмі падабаецца. Папулярнасць "Князя Вітаўта" ў Нацыянальнай драме гэта бліскуча пацвярджае.

З'явіліся п'есы для дзіцячага тэатра, асабліва для сярэдняга школьнага ўзросту. Упершыню на конкурсе прадстаўлена шмат інсцэніровак, дарэчы, у асноўным інсцэніравалі творы Уладзіміра Караткевіча.

Конкурсных п'ес, якія ўпалі ў вока рэжысёрам, шмат; заяўкі на пастаноўкі далі тэатры не адно нацыянальныя ды акадэмічныя, але і абласныя. Узнік нават аўтарскі фестываль — праўда, драматурга Дуніна-Марцінкевіча, але чаму б падобную практыку не распаўсюдзіць на нашых сучаснікаў — Алену Папову, Сяргея Кавалёва, Аляксея Дударава? Яны сёння — несумненныя драматургі-лідэры...

Можна казаць і пра тое, што вартыя творы, якія заўжды вылучаюцца на конкурсах, амаль не бяруцца ў работу тэатрамі. Чаму? Таму што чужое нібыта лепш за сваё? У 1995 годзе Алена Папова зрабілася першай на Еўрапейскім конкурсе драматургіі. Толькі ў 1996 яе п'есу паставілі ў Акадэмічным рускім тэатры, — тады, калі спектакль паводле гэтай п'есы ўжо прагучаў у Маскве ды ў Таліне. Паставілі, дарэчы, на грант Фонду Сораса...

Вядома, у такой далікатнай, такой датклівай галіне як драматургія і тэатральная творчасць, шмат што залежыць ад жадання аўтара працаваць на нейкі пэўны тэатр. Яшчэ больш залежыць ад сустрэчнага руху тэатра. Але паранейшаму галоўным заказчыкам, галоўным рупліўцам беларускіх пастановак у нашых тэатрах застаецца Міністэрства культуры Беларусі. Толькі стаўце! Сродкі знойдзем.

Запісала Жана ЛАШКЕВІЧ

XII З'ЕЗД САЮЗА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Мастак служыць праўдзе і ісціне

СПРАВАЗДАЧА СТАРШЫНІ САЮЗА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА

Паважаныя сябры! XII пісьменніцкі з'езд сабраўся ў нялёгкі, можна сказаць, крызісна складаны час існавання нашага творчага Саюза.

І таму гаворку трэба пачынаць і весці найперш пра набалелае, пра тое, што вызначае моманты нашага выжывання як арганізацыі.

Падрабязны аналіз, крытычная характарыстыка творчасці кожнага з нас — надзённая справа органаў друку, нашай шматлікай літаратуразнаўчай кагорты.

Задача з'езда — іншая. Асабліва сёння...

Між людзей не надта дасведчаных у літаратурных варунках існуе ўяўленне, што Саюз пісьменнікаў — гэта такая ўстанова, такая кантора, дзе збіраюцца творцы — больш ці менш здатныя — і пішуць кнігі, а нехта, пэўна ж самы таленавіты, той, хто паспеў ужо раней за ўсіх адлісацца, пахаджае між сталоў і падказвае, як яно робіцца хутчэй і лепш, — словам, пішацца гэтакае сачыненне на зададзеную тэму...

Дык вось — пры ўсёй прымітыўнасці гэтага наіўнага "літаратуразнаўства" самае дзіўнае, што гэты самы "Нехта" заўсёды існаваў ці, прынамсі, імкнуўся і імкнецца існаваць у рэальнасці.

"Нехта" — зусім канкрэтная сіла: уладная сістэма — сама па сабе ці персаніфікаваная, — гэта ўжо не мае істотнага значэння...

Улада і мастак, улада і пісьменнік, у прыватнасці, — тэма вечная і спрадвечная: як з'явіліся яны на свет, так і выпрабоўваюць адно аднаго на трываласць. Улада патрабуе ўслугавання, мастак прагне творчай свабоды. Не сакрэт, што ў гэтым баруканні той-сёй прадаецца, схіляецца ў паклоне: то за пярсцёнак з брыльянтамі, то за футра з царскага пляча, то за лакейскае жыраванне на прыдворных "хлябах", іншы нават і за бясцэнак гатовы аддацца...

Але ў вышынных праявах духу перамагае мастак творча не заняволены, які згодны служыць толькі Праўдзе і Ісціне:

Небу справу здае сэрца, думка мая
Сонцу, зорам, арлам толькі роўна...

Янка Купала сказаў гэтыя словы ў 1910 годзе. А ўжо ўсяго праз нейкія два-тры дзесяцігоддзі народнаму песняру давялося адстойваць сваё мастакоўскае права быць падсправаздачным толькі перад небам і сваім геніем, а яму ўпарта даводзілі — увесь астатак жыцця, да трагічнага фіналу, — каму і як ён павінен спяваць...

Да гэтага "выпрамлення" паэта, безумоўна ж, дачыняўся, не мог не дачыняцца, і Саюз пісьменнікаў. Бо і створаны ж ён быў, побач з іншым, і дзеля "арганізацыі" і "накіравання" "літаратурнага працэсу"...

Час ідзе, мяняецца, але гэты "іміджны хвост" пісьменніцкага Саюза так і цягнецца ўслед за ім, і само яго існаванне выклікае перманентныя спрэчкі: быць ці не быць?.. (Я спецыяльна паўтараю гэта сакраментальнае пытанне, прачытаўшы ў "ЛіМе" прадбачанне Ігара Пракаповіча)...

Так, нямала папрокаў можна выказаць "літаратурнаму калгасу"... І ўсё ж... Ідэя, якая нас аб'ядноўвала, яднае, і трэба спадзявацца, будзе яднаць, — ці была яна?.. Ідэя, якая рабіла саюз Саюзам...

Нядаўна прыпыніў мяне, сустрэўшы на вуліцы, пытаннем нечаканым і нават нейкім чынам зашыфраваным Барыс Іванавіч Бур'ян: "Ну дык што будзе?.." — як быццам быў упэўнены, што я дакладна ведаю, які сэнс ён разумее за гэтым самым "што"... І амаль не памыліўся — з першых жа слоў гаворка пайшла ў нас пра лёс Саюза пісьменнікаў. І я не мог не пагадзіцца з Барысам Іванавічам, бо і сам гэтак думаў і думаю: Саюз нам трэба ўберагчы. Не як інстытут "упарадкавання" і падпарадкавання літаратурных талентаў, а як выказніка і, можа быць, апошні фарпост нашай нацыянальнай ідэі, яе сутнасці і існасці. Хай сабе ў нас розныя погляды і падыходы на яе здзяйсненне, — але пакуль ёсць адзінства мэты павінен быць і адзіны творчы Саюз.

Розныя тэндэнцыі — і ў творчасці, і ў грамадскіх разуменнях, — рэч натуральная. Але бясспрэчнаю між імі і над імі павінна застацца ў нас адна, галоўная, вызначальная, мэта: захаваць нашу нацыянальную самабытнасць, адрадзіць і ўзвысіць нашу гістарычную памяць, узняць яе з каленяў, даводзіць народу, што ён Народ. Канешне, хто зракаецца гэтага шляху — такому: вось бог, а вось парог, — але не мы павінны пакідаць наш Саюз, а адшчапенцы...

Ды і сабрацца пагаманіць пра надзённыя справы, ды і, будзем шчырымі, правесці таварыша ў апошнюю дарогу, — як жа тут без гэтага самага Саюза: хто нават пазвоніць, абвестку дасць, калі мы рассыпемся на купкі і групкі...

Зразумела, не лёгка і не проста ўтрымацца над палітычнымі схільнасцямі, сімпатыямі і амбіцыямі. Але гэтыя асабістыя бар'еры нейкім чынам трэба пераадольваць. Якія формы набудзе наша творчая суполка, падкажа, налэўна, жыццё, але і самі мы мусім шукаць свежых падыходаў і арганізацыйных ідэй.

Пэўна, наспела неабходнасць функцыянальнай пераарыентацыі структураў СП — як сакратарскай, так і кансультацыйнай (бо, не сакрэт, няма каго асабліва кансультаваць, апроч рэдкіх графаманаў, — асноўная праца з аўтарамі ідзе ў рэдакцыях). Магчымы адзін з арганізацыйных накірункаў, які б непасрэдна займаўся пытаннямі прапаганды літаратуры і мовы (у кантакце з ТБМ). Магчыма арганізацыйнае афармленне службы па сацыяльных праблемах, паяднаўшы намаганні з Літфондам... Хоць і перасцерагчыся варта: ствараць нейкія штучныя праекты сёння занятак марны.

Сёння ясна адно: мы апынуліся ў такім стане, калі ўлада не можа "ўпраўляцца" з літаратурай па-старому, не можа па-ранейшаму кіраваць "літпрацэсам", а літаратары не хочуць тварыць па былых стандартах і мерках: пад дыктоўку, у ілюстрацыйным рэчышчы ўладных указаў і пастаноў.

З горыччу, пры гэтых роздумах, ступаеш па асацыятыўных мосціках, што пракладвае ў сваім новым гістарычным рамане "Залатая жрыца Ашвінаў" Вольга Іпатава: "Мы страцілі жывую радасць ад жыцця — проста жыцця, здрабнелі ў жаданнях і забыліся, што мы лісты аднаго дрэва. А яшчэ, — горка дадаў Святазар, — нават мы, жрацы, спрабуем дагадзіць сіле, аднак жа князі — гэта ўсяго толькі маленькія чалавечкі, якія падскокваюць, каб вышэй паказаць сябе"...

Творчаму чалавеку не трэба падскокваць. І ўсё ж апора і ў яго павінна быць...

З надзеяй аб нашай будучыні хацелася б глядзець на наш творчы Саюз. Каб і чорт не радаваўся, і сабака хвастом не круціў...

Матэрыяльная падтрымка нацыянальнай культуры, і літаратуры як неад'емнай часткі яе, ва ўсім цывілізаваным свеце лічыцца за справу не толькі тактычную, але і стратэгічную. І гэта зусім зразумела: падтрымліваць духоўны патэнцыял народа, нацыі — абавязак дзяржавы як гаранта суверэннага існавання гэтага народа, гэтай нацыі. І тут у рэчышчы асноватворных дэмакратычных прынцыпаў зусім не выпадае атаесамляць уладнасць з дзяржаўнасцю. Пастулат: у каго ўлада, той і ўвасабляе дзяржаву — далёка не бездакорны. Улада катэгорыя не вечная, у дачыненні да канкрэтных абставінаў і асоб — часовая: сёння ёсць, заўтра няма; дзяржава ж — калі яна сапраўды народная — застаецца назаўсёды: яна ствараецца народам для ўласнага ўсталявання ў зямным агульнажыцці.

І калі падыходзіць з гэтых пазіцый, то дзяржаўная падтрымка нашых творчых клопатаў і патрэб мусіць быць з'яваю не выключнай, не выбарачнай, а зусім натуральнай і ўсеахопнай, — гэта значыць дзяржаўнай палітыкай, а не чыёйсьці высокаю ласкай. Палітыкай на ўсіх узроўнях. Як робіцца гэта, да прыкладу, у Францыі, — пра што неаднойчы са здзіўленнем (капіталістычная ж сістэма!) ды і з зайздрасцю сведчылі нашы таварышы, якім давялося пабываць у гэтай краіне і пазнаёміцца са стройнай дзяржаўнай сістэмай падтрымкі нацыянальнай культуры: як кажуць, ад федэральнага да муніцыпальнага ўзроўню. І гэта ў першую чаргу тычыцца літаратурных і мастацкіх часопісаў, якія ў сілу сваёй спецыфікі не могуць самафінансавацца, да прыкладу, скажам, як рэкламадаўцы.

Не будзем крывіць душой: і нашы літаратурна-мастацкія выданні часткова датуюцца праз сістэму Дзяржкамдруку. Не забываюць там, праўда, нагадваць, каб і самі часопісы варушыліся, шукалі дадатковыя крыніцы фінансавання. І гэта не так ужо і страшна, — і тут ёсць прыкметныя зрухі. Нядаўна, захадамі галоўнага рэдактара Сяргея Законнікава, арганізаваны фонд падтрымкі часопіса "Полымя" — "Гронка", — да супрацоўніцтва далучаюцца ініцыятыўныя, уплывовыя людзі. Ёсць такі фонд і пры "Нёмане". Робяць самастойныя, хай сабе і сціплыя крокі да папаўнення сваёй касы "Маладосць", "Беларусь", іншыя выданні. Але — паўторымся — без дзяржаўнай фінансавай асновы, асабліва ў наш эканамічна складаны час, ім не абысціся.

Выклікае занепакоенасць і трывогу звужэнне, калі не сказаць рэзкае падзенне, намінацый і тыражоў беларускай кнігі. Кажуць не заказвае кнігагандаль: няма попыту, — маўляў, не чытаюць... Але — патлумачце, будзьце ласкавыя: пра які попыт можа ісці гамонка, калі Белспажыўсаюз наогул ухіліўся ад продажу беларускай кнігі?!

Можна было б паспачуваць працаўнікам кнігагандлю, стаўшы на момант на іх месца: так, сапраўды, попыт падае. Але ці толькі на беларускую кнігу? І ці толькі ў Беларусі? Не, і далёка — не. Паглядзіце на шэрагі класікі — разнамоўнай, не толькі рускай, — і раней афіцыйна прызнанай і забаронена-паўзабароненай: ва ўсім бляску паліграфічнага выканання пакоіцца яна на прылаўках. Ды гадоў дзесяць таму за ёю — такія ж бясконцыя — шэрагі пакупнікоў стаялі!.. Пэўныя прычыны такой з'явы як бы відавочныя, ляжаць на паверхні. Перанасычанасць рынку? Налэўна... Яшчэ — абвальнае збяднення народа, а гэта значыць — пакупніка: 100-150 тысяч рублёў — хто гэта адважыцца так лёгка выняць з кішэні, і аддаць за кнігу, калі рублёў тых і на харч — у абрэз...

Але ці толькі ў гэтым корань зла?

Ёсць прычыны куды глыбейшыя, і ці не ідзе побач з матэрыяльным збяднеццем людзей збяднення духоўнае — тых, хто мае гэтыя рублі, ды бяздумна і бяздушна шпурляе іх на д'ябальскае вогнішча маскультуры?..

Наша ж, беларуская, сітуацыя ўзводзіцца ў ступень яшчэ і ўнясеннем афіцыйна-нігілістычнага разладу ў працэс адраджэння, станаўлення і ўмацавання нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальнага духу.

Тут на першае месца выступаюць пытанні беларускай мовы і нацыянальнай школы.

Так, наша шматпакутная мова цягам стагоддзяў сама сцвярджае сябе: глыбінна, можа, нават касмічна затоена і загадкава — сваёй жыццястойкасцю, а публічна — творчасцю нашых слынных майстроў слова, у іх стылёвай і лексічнай разнастайнасці, шматфарбнасці і багацці.

Да гэтага аргумента далучаецца — і ўсё больш пераканаўча — яшчэ адзін штрых. Ён, можа, самы такі відавочны. Гэта — пераклады на родную мову твораў сусветна вядомых, што сталі адзнакамі вышынных узлётаў духу зямной цывілізацыі. Васіль Сёмуха: ад "Фаўста" Гётэ да Кнігі кнігаў "Бібліі", Уладзімір Скарынкін — "Боская камедыя" Дантэ... Хто пасля такіх доказаў можа сцвярджаць, у каго язык паварочваецца гаварыць аб функцыянальнай беднасці, недзеяздольнасці беларускай мовы, аб яе абмежаваных магчымасцях — ці то творчых, навуковых, ці хай сабе камунікацыйных?..

Сутнасць у тым, што мовай не пагарджаць трэба, а трэба яе шаноўна ахоўваць, як душу нашу беларускую: не мова памірае, а народ без мовы робіцца мёртвым. Недарэмна ж — як на скрыжалях — высвечана класікам: "Каб не ўмерлі..."

І яшчэ адзін шчыры працаўнік на ніве беларускага адраджэння паэт Уладзімір Жылка гаварыў у 1922 годзе: "Народ гібеў і зносіў нядолю і здзек таму, што Дух часова адляцеў ад яго, а разам з ім і Слова, бо не дарма гаворыцца ў Евангеллі Яна, што Бог ёсць Слова..."

І калыскай любові да роднай мовы — як несмяротнай душы народа — павінна быць школа. Павіннна... Але:

"У Савецкім раёне (г. Мінск. — **В. З.**) няма ніводнай беларускамоўнай школы, а ў першы клас увосень мінулага года тут прыняты ўсяго 32 вучні. На радзіме выдатнага пісьменніка (г. Орша. — **В. З.**), усенародна любімага Уладзіміра Караткевіча няма ніводнага беларускамоўнага вучня ў першым класе..." — гэта сведчыць паэт Генадзь Бураўкін, старшыня рады Таварыства беларускай мовы ("Звязда", 24.III.98).

А вось яшчэ адно сведчанне — латвійскага дыпламата пані Інгрыды Леўрэнцэ, якая валодае шасцю мовамі і перакладае з іх творы мастацкай літаратуры, — з горыччу заўважае яна, што ўжо, дарэчы, неаднойчы зазначалася і іншымі нашымі гасцямі: "Мяне вельмі здзіўляе, што на вуліцах Мінска я практычна не чую беларускую мову. А гэта гаворыць пра многае..." ("Народная воля", 3.IV.98).

У прэзідыуме Аляксей Дудараў, Васіль Зуёнак і Іван Навуменка.

Фота А. ПРУПАСА

Сапраўды — пра многае... Асабліва калі пачынаеш параўноўваць. Да прыкладу: 65 працэнтаў школ Украіны — украінскамоўныя, а ва ўкраінскія класы ў гэтым навучальным годзе прыйшоў 71 працэнт усіх першакласнікаў...

Дык вось: як гаварыў стары Архімед: "Дайце мне кропку апоры, і я зямлю зрушу", — так маем усе падставы сказаць і мы: "Дайце нам беларускую школу — і тады пабачым, каго чытаць будуць..." (Маецца на ўвазе школа і агульнаадукацыйная і вышэйшая).

Гэта, дарэчы, і адказ на з'едлівую і зневажлівую ўхмылку члена нашага Саюза Анатолія Аўруціна ў адным з газетных опусаў: "...смешно в русскоязычной и русскодумающей республике всерьёз рассуждать о том, что книги на белорусском читатель берет охотнее. Нет и еще раз нет! Просто... среднестатистический читатель покупает лишь то, к чему его вынуждает жизнь. Например, книжку для своего чада, которому велено то или иное произведение изучить по школьной программе..."

Трохі доўгая цытата, але паказальная. Паказальная ў тым сэнсе якраз, якога мы так дашукваемся: чаму зніжаюцца тыражы, чаму вузее намінацыйнае кола аўтараў у выдавецкіх планах. А што тычыцца супрацьстаўлення: "беларускамоўная кніга" — "рускамоўная кніга" і як бы змушанасць чытача купляць выключна першую, то заўважым: школьнай праграмай "велено изучить" не толькі Купалу і Коласа, але і Пушкіна, і Талстога, яшчэ і Шэкспіра з Гамерам, што натуральна і ад чаго ніхто з беларусаў ніколі не адмахваўся і, па апошніх агентурных звестках, не збіраецца гэта рабіць...

І калі ўжо чытач, патэнцыяльны пакупнік кнігі, матэрыяльна не можа цалкам забяспечыць свае чытацкія інтарэсы і патрэбы, то дапамагчы яму ў гэтым павінны бібліятэкі —

(Працяг на стар. 6—7)

Дыскусіі ў горадзе над Нёманам

Пры канцы красавіка ў Гродзенскім універсітэце імя Я. Купалы адбылася міжнародная канферэнцыя "Узаемадзеянне літаратур у сусветным літаратурным працэсе". Гэта ўжо шостая па ліку канферэнцыя, якую праводзіць кафедра рускай і замежнай літаратур. Мне давялося ўдзельнічаць у трох, таму магу засведчыць, што з кожным годам яны становяцца і больш прэстыжнымі, і больш прадстаўнічымі. Важна, што ў рабоце прымалі ўдзел даследчыкі з Расіі, Польшчы, Славакіі. Вельмі шырока была прадстаўлена расійская правінцыя — Пскоў, Варонеж, Смаленск, Ялец, Самара, Каломна. Навуковы ўзровень — параўнаўча з канферэнцыяй, што праходзіла восенню ў Мінску — быў значна вышэйшы. Інстытут літаратуры НАН удзельнічаў трыма секцыйнымі паведамленнямі, хаця заяўлена было каля дзесятка. Становіцца ўжо традыцыяй — пасылаць заяўкі, а пасля не ехаць у надзеі, што паведамленне надрукуюць і так. Вось чаму заяўлена было 240 удзельнікаў, а прыехала 150. Гэта стварае пэўныя цяжкасці для арганізатараў.

Старшынёй аргкамітэта, як і ў мінулым годзе, была Т. Яўтуховіч (у прамежку паміж канферэнцыямі яна абараніла доктарскую, з чым яе і віншуем). Культурная праграма таксама адрознівалася разнастайнасцю і добрай арганізацыяй. Нам пашанцавала напярэдадні Вялікадня наведаць Жыровіцкі манастыр. Такога роду паездкі не толькі збліжаюць удзельнікаў, але і пашыраюць кругагляд.

Л. ТУРБІНА,
навуковы супрацоўнік
Інстытута літаратуры НАН

Першыя караткевічаўскія...

"Любая літаратура можа сказаць, што яна багатая і сталая, калі мае свайго Уладзіміра Караткевіча", — так напісаў у прадмове да зборніка У. Караткевіча "Быў. Ёсць. Буду" сябра пісьменніка Р. Барадулін.

Мы, беларусы, ганарымся, што маем У. Караткевіча. Так, маем, таму што ён заўсёды з намі: сваімі творамі, сваім жыццёвым прыкладам, сваёй геніяльнасцю. Яго творы вучаць нас любіць Радзіму, любіць сваю мову, яны ратуюць нас ад бездухоўнасці, дапамагаюць зразумець значнасць сваіх каранёў.

Пісьменнік, драматург, паэт, крытык, перакладчык, сцэнарыст, публіцыст — і ўсё гэта Уладзімір Караткевіч. Невыпадкова такая зацікаўленасць моладзі яго жыццёвым і творчым шляхам. Невыпадкова і мерапрыемства — Першыя караткевічаўскія чытанні школ Мінскага раёна, — што адбылося ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

У чытаннях прынялі ўдзел 32 школы. З 34 рэфератаў, прадстаўленых на канферэнцыю, 12 атрымалі права прыняць у ёй удзел.

З прывітальным словам да прысутных звярнулася сястра У. Караткевіча, даўні сябра музея, захавальніца спадчыны пісьменніка Наталля Кучкоўская.

Сяргей Законнікаў расказаў аб тым уздзеянні, якое аказаў і аказвае на яго жыццёвы і творчы шлях Уладзімір Сямёнавіч.

Анатоль Верабей, даследчык творчасці У. Караткевіча, аўтар "Летапісу жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча" і кнігі пра пісьменніка "Абуджаная памяць", падвёў вынікі канферэнцыі і даў станоўчую адзнаку ўсім працам вучняў.

Карысным і цікавым для настаўніцкай і вучнёўскай аўдыторыі было выступленне выкладчыцы вышэйшага педагагічнага каледжа з Баранавіч Алены Барадзіной. Тэма яе даклада — "Фарміраванне гістарычнай свядомасці сродкамі літаратуры пры вывучэнні творчасці У. Караткевіча ў сярэдняй школе".

Хочацца адзначыць даклады, якія занялі першае, другое і трэцяе месцы: "Заклік стагоддзяў" (па аповесці "Сівая легенда") вучаніцы 10 класа Міханавіцкай СШ Наталлі Яраш і "На Беларусі Бог жыве..." (Біблейскія сюжэты і матывы ў паэзіі У. Караткевіча) вучаніцы 11 класа Трасцянецкай СШ Яны Трыпуцінай (III месца); "З вякоў мінулых" вучня 11 класа Папярнянскай СШ Дзяніса Мардаса (II месца); "Прыцягненне любові" вучаніцы 11 класа Прывольненскай СШ Людмілы Чыжык (I месца).

Ад імя кіраўніцтва музея выказваем вялікую ўдзячнасць усім, хто прыняў удзел у чытаннях.

Дзякуй настаўнікам, якія кіравалі напісаннем рэфератаў. Маем надзею, што гэта не апошняе спатканне на Караткевічаўскіх чытаннях у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Зінаіда КУЧАР

XII З'ЕЗД САЮЗА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Мастак служыць праўдзе і ісціне

(Працяг. Пачатак на стар. 5)

школьныя, масавыя і, можа, найперш — сельскія. Тут і газета павінна быць, і часопіс, і кніга патрэбная. Камплектацыя бібліятэк сапраўды робіцца справай дзяржаўнай важнасці.

Мы звяртаем свае спадзяванні да Міністэрства культуры: справу гэтую мы можам па-людску вырашыць толькі агульнымі намаганнямі.

Хацелася б каб бібліятэкі ўсіх узроўняў і падпарадкаванняў не прайшлі міма такога серыйнага выдання, як "Беларускі кнігазбор" (ініцыятар і натхняльнік паэт Кастусь Цвірка, а вакол яго — дасведчаныя, творчыя людзі — Вячаслаў Чамярыцкі, Язэп Янушкевіч, Міхась Скобла, Галіна Тычка... — і кола іх шырэе...), — сціплыя, з густам афармленыя томікі, з добрым, навукова абгрунтаваным укладаннем і каментарыем. Выданне як бы спецыяльна робіцца для стварэння даступнага бібліятэчнага фонду, адрасаванага масаваму чытачу.

А школьныя бібліятэкі, відаць жа, павінны стаць дзейснымі партнёрамі серыі "Сусветная літаратура для дзяцей", якую ўжо неаднойчы дакляраваў дырэктар выдавецтва "Юнацтва" Валянцін Лукша, — выданне архінеабходнае для беларускай школы.

Наспела пільная патрэба пашыраць кола і спектр беларускіх перыядычных выданняў для дзяцей. Трэба адваёўваць іх неакрыленыя душы ў бяздумных і бяздушных тэлебачэвікоў. І ўцешна, што побач з добрымі даўнімі сябрамі юных чытачоў — "Бярозкай" і "Вясёлкай", набіраецца моцы "Лесавічок" — часопіс-плакат, апякуемы Уладзімірам Ягоўдзікам. Пабольш бы такіх заявак!

З настальгіяй згадваюць пісьменнікі, і асабліва старэйшы прапагандыст і выканаўца мастацкага слова Аляксей Слесарэнка, Бюро прапаганды мастацкай літаратуры. Сапраўды, пры пэўным шумавінні ўсё ж гэта быў брысты ручаёк, што нёс нашы творы ў самую глыбінку. Не было такога куточка, дзе не пабывалі б пісьменніцкія дэсанты... Але — па трапнай заўвазе Галіны Каржанеўскай — "думкі скачуць з мінулага ў сённяшняе..." Рыхтык у той рускай прыпевачцы: "Горе скачет, горе пляшет, горе песенки поёт..."

Што ж здарылася цяпер? А ўсё тая ж банальная — фінансавая — прычына. Ёсць зараз арганізацыя — спадкаемца Бюро прапаганды мастацкай літаратуры — літаратурна-інфармацыйнае прадпрыемства "Роднае слова". Аднак любы арганізаваны ім пісьменніцкі выезд выліваецца ў такія камандзіровачныя выдаткі, што "Роднае слова" адразу робіцца безнадзейным банкрутам.

А надзея ўсё ж ёсць — у дзяржаўнай падтрымцы памкнення пісьменнікаў данесці сваё слова да людзей у вусным выкананні. І ёсць ужо добры прыклад — для пачатку: арганізаваныя сумесна з Міністэрствам культуры і мясцовымі органамі ўлады пісьменніцкія выступленні, прысвечаныя 200-годдзю Адама Міцкевіча.

Гэткім жа шляхам прапаганды беларускай літаратуры павінен актыўней і шырэй карыстацца кнігагандаль. Упэўнены: ніхто з пісьменнікаў не адмовіцца ад сустрэчы і выступлення, калі кнігарня выставіць такі аргумент: "А там ваша кніжачка будзе прададзена, а вы аўтографы чытачам пакінеце..." Па сабе ведаю, супрацоўніцтва такое прыносіць плён.

У сістэме культурна-асветных устаноў не апошняе, а хутчэй даволі прыкметнае, нават злітнае, месца займаў наш Дом літаратара — з яго бібліятэкай, метадычным цэнтрам, іншымі службамі.

Дом літаратара быў і стрыжнем творчай працы секцый і камісій Саюза пісьменнікаў: паэзіі (старшыня Казімір Камейша), прозы (старшыня Леанід Левановіч), крытыкі і літаратуразнаўства (старшыня Міхась Мушынскі), перакладаў і літаратурных узаемасувязей (старшыня Іван Чарота), драматургіі (старшыня Алесь Петрашкевіч), літаратуры для дзяцей і юнацтва (старшыня Артур Вольскі). Праца секцый арыентавалася на самае цеснае ўзаемадзеянне з Домам літаратара. Творчыя пытанні адольвалі вузкія цэхавыя рамкі, набывалі тут шырокі грамадскі рэзананс. Маю на ўвазе і прэзентацыі новых кніг, і "круглыя сталы", і творчыя вечары з абмеркаваннямі і дыскусіямі. Для маладых аўтараў, для пачаткоўцаў гэта была сапраўдная творчая школа. Дастаткова для прыкладу сказаць, што толькі секцыя паэзіі за апошнія чатыры гады абмеркавала творчасць каля 90 аўтараў, з іх 53 былі рэкамендаваныя для прыёму ў Саюз пісьменнікаў.

Галоўнае ж, што асяродак гэты — Дом літаратара — быў заўсёды нацыянальна зарыентаваны, плённа працаваў на ніве адраджэння, прапагандаваў творчасць не толькі пісьменнікаў, але і славутых дзеячаў іншых мастацтваў.

Інакш і быць не магло, бо Дом літаратара праектаваўся і ўзводзіўся па заказе Саюза пісьменнікаў Беларусі як будынак спецыфічнага прызначэння — менавіта Дом літаратара, са сваімі спецыфічнымі літаратурна-

Пакуль ёсць літаратура

ВЫСТУПЛЕННІ Ў СПРЭЧКАХ

З'езд прадоўжыў сваю работу справаздачай старшыні рэвізійнай камісіі Вячаслава Стомы. Дакладчык звярнуў увагу прысутных на недахопы ў працы кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў, несправядлівае размеркаванне матэрыяльнай дапамогі, якой збольшага карысталіся самі члены кіраўніцтва; на негаспадарлівасць, з-за якой заняпаў і Дом літаратара, і Дом творчасці пісьменнікаў "Іслач". Рэвізійная камісія ўнесла свае прапановы па змяненнях у Статуце Саюза пісьменнікаў, сярод іх — вызваліць ад членскіх узносаў пісьменнікаў ва ўзросце больш за 70 гадоў, а таксама інвалідаў, чарнобыльцаў і ўдзельнікаў вайны ў Афганістане; скараціць склад рады, а таксама колькасць штатных супрацоўнікаў СБП у тры разы, таму што на сёння, на думку рэвізійнай камісіі, гэты штат непамерна раздуты.

Намеснік кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта **Іван Пашкевіч** у сваёй прамове адзначыў, што крытыка з боку пісьменнікаў у адрас афіцыйных уладаў не заўсёды бывае канструктыўнай. У многіх непаразуменнях, на думку дакладчыка, вінаватая безініцыятыўнасць кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў, нежаданне ісці на супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі, якія не атрымалі нават запрашэнняў на гэты з'езд. Не былі падтрыманы адпаведнымі сустрэчнымі ініцыятывамі прапановы па матэрыяльнай дапамозе ў правядзенні з'езда, пераглядзе памеру ганараў, заснаванні фонду па падтрымцы стварэння твораў літаратуры і мастацтва. Параіў спадар Іван Пашкевіч не ператвараць і праблему перадачы Дома літаратара "пад крыло" Адміністрацыі Прэзідэнта ў палітычную. Па сцвярджэнні дакладчыка, падставы дзеля гэтага чыста эканамічныя і вымушаныя.

Наступным слова ўзяў галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі пісьменнік **Генрых Далідовіч**. На яго думку, непаразуменні між пісьменнікамі і ўладамі справакаваны найперш моўна-нацыянальнай палітыкай дзяржавы, вынікамі сумнавядомага рэферэндуму аб мовах. Дзяржаўныя чыноўнікі не валодаюць беларускай мовай, на беларускай мове не складаюцца афіцыйныя паперы, знікае беларускамоўнае навучанне. Найлепшае выйсце з гэтага, на думку дакладчыка, пераканаць прэзідэнта Беларусі выдаць дэкрэт аб дзяржаўным забеспячэнні раўнапраўя беларускай мовы ў дзяржаве.

Анатоль Сабалеўскі, галоўны рэдактар часопіса "Тэатральная творчасць", прыцягнуў увагу з'езда да праблем выдання, якое

Ігнат Дуброўскі, Сяргей Грахоўскі і Анатоль Клышка.

ўзначальвае. Ім быў зачытаны ліст на імя прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падпісаны знакамітымі дзеячамі тэатра, літаратуры і мастацтва, з просьбай знайсці сродкі для далейшага выдання часопіса "Тэатральная творчасць".

Народны пісьменнік Беларусі **Ніл Гілевіч** згадаў, як 32 гады таму, у сваёй першай прамове на чарговым з'ездзе Саюза пісьменнікаў, ён гаварыў аб праблемах існавання беларускай мовы. І сёння ён зноў вымушаны гаварыць пра тое ж. Мова вызначае натуральны шлях развіцця нацыі. Мова вывела нас у свет і абазначыла дадзенае нам Богам месца. Культурны ўзровень нацыі вызначаецца па адносінах да нацыянальнай мовы. На "трасянцы" інтэлектуальная асоба вырасці не зможа. На думку прамоўцы, працэс удушэння беларускага слова набірае сілу. Ён заўважыў, што, на яго думку, звышнаіўнасць думаць, быццам у нашых умовах існаванне дзвюх дзяржаўных моў — справядлівасць. Непазбежна гэта прывядзе да заняпаду беларускай мовы. Першы абавязак беларускага пісьменніка — змагацца за суверэнную, незалежную Беларусь.

Сёння адбываецца глабальны наступ антыбеларускіх сіл на дзяржаўнасць, суверэннасць, мову беларусаў. Канчатковая мэта гэтага — уз'яднанне Беларусі з Расіяй і стварэнне адзінай, рускай, дзяржавы, знішчыць беларускі народ. Сапраўднае брацтва між славянскімі народамі будзе тады, калі на Беларусі запануе беларуская мова. А між тым ідэя беларускага нацыянальнага адраджэння магла б мабілізаваць духоўныя сілы народа. Выступоўца з горыччу заўважыў, што ніводзін рускі дзеяч культуры — артыст, пісьменнік і г.д. — не выказаў абурэння тым, што робіцца зараз з беларускай культурай. Фактычна яны падтрымліваюць этнагенацыд беларускага народа. "Нас падзялілі і зрабілі выгляд, што мы самі гэтага хочам", — сказаў Н. Гілевіч і напрыканцы зазначыў: "Час ніколі не даруе тым, хто сёння застанецца ўбаку ад змагання за лёс народа".

Паэт **Кастусь Цвірка** расказаў пра ўтворанае самімі пісьменнікамі выдавецтва "Беларускі кнігазбор", якое паставіла за мэту выданне 200 тамоў адметных твораў беларускай літаратуры XIX—XX стст.

Міністр культуры **Аляксандр Сасноўскі** зазначыў, што сярод творчых саюзаў Беларусі самыя неналаджаныя сувязі ў яго міністэрства — з Саюзам пісьменнікаў, віну за што прамоўца ўсклаў на кіраўніцтва Саюза. На думку А. Сасноўскага, дзяржава падтрымлівае беларускую мову і літаратуру, у прыватнасці, у Міністэрстве культуры беларуская мова — працоўная. Ніякім дэкрэтам не прымусіш усіх адразу загаварыць на беларускай мове. Але шматзначны факт — на апошніх уступных экзаменах у інстытут культуры 80 працэнтаў абітурыентаў выбралі для пісь-

творчымі і культурна-асветнымі функцыямі.

Больш дваццаці год беларускія пісьменнікі — ужо не адно пакаленне — працавалі, наладжвалі творчае жыццё ў Доме літаратара, па праве лічылі яго сваім другім домам. І сваёй калектыўнай уласнасцю, дарэчы...

Непаразуменні ж вакол Дома літаратара пачаліся, як на падставе распараджэння Прэзідэнта РБ "О передаче в оперативное управление Управления делами Президента Республики Беларусь зданий в г. Минске", у даволі доўгім пераліку будынкаў, у самым канцы сціпла было пазначана: "Фрунзе, 5". Недасведчаны чалавек мог і не здагадацца, што маецца на ўвазе Дом літаратара, а нам недвухсэнсоўна было заяўлена: "Забудзьце гэтую назву — Дом літаратара. Ёсць адміністрацыйны будынак па вул. Фрунзе, 5".

У сваёй заяве "Аб Доме літаратара СПБ" прэзідыум рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, якая была змешчана ў друку і паслана Прэзідэнту РБ, пераканаўча даводзіў, што разбурэнне функцыянальных асноў Дома літаратара — з'ява антылітаратурная, антыкультурная.

Прыводзілася аргументацыя, што будынак, перададзены ў 1976 годзе на баланс Саюза пісьменнікаў УКБ Мінгарвыканкама (як непасрэдным выканаўцам заказу) паводле адпаведнага рашэння Саўміна БССР, з'яўляецца калектыўнай уласнасцю нашага творчага Саюза. Бо сродкі на будаўніцтва выдзяляліся Літфондам СССР са звышпланавых капітальных укладанняў для творчых саюзаў СССР. А паступалі яны ў рэспубліку па тагачасных законах з Саюза пісьменнікаў СССР праз Дзяржплан СССР. А па-другое, і гэта, можа, самае галоўнае: адкуль бы сродкі ні паступалі адпаведнай грамадскай арганізацыі, яны рабіліся ўласнасцю гэтай грамадскай арганізацыі. У Статуце ж Саюза пісьменнікаў СССР (1971 г.), па якому дзейнічаў і працаваў і Саюз пісьменнікаў Беларусі, ясна сказана: "Средства Союза писателей СССР образуются из... — ідзе пералік — і пункт... б) специальных ассигнований, выделяемых в установленном порядке советскими учреждениями и общественными организациями". А гэта значыць, калі так — "не мудрствуя": далі Саюзу пісьменнікаў рубель (хто б ні даў!) — гэта ўжо наша ўласнасць, — можам яго прагуляць у "пульку", можам Дом літаратара будаваць...

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Іван Пашкевіч і пісьменнікі Уладзімір Бандарэнка (Расія), Эдуард Скобелеў.

Гэты момант вельмі і вельмі важны. Дарэчы, па ўсіх фінансавых дакументах праходзіць фармулёўка: не на "будаўніцтва Дома літаратара", а "Саюзу пісьменнікаў для будаўніцтва Дома літаратара". І мы звярталі ўвагу суддзі Вышэйшага гаспадарчага суда РБ, дзе разглядалася справа аб праве ўласнасці Саюза пісьменнікаў на Дом літаратара, на гэтыя акалічнасці. Суддзя як быццам бы і пагаджаўся, ды прысуд быў усё ж не на нашу карысць, — пераважылі іншыя аргументы... Рашэнне суда было апошняй кропкай: можам пагаджацца, можам не пагаджацца, а справа закрыта. Мы выкарысталі, здаецца, усе магчымыя спосабы і сродкі, якія вызначаліся калектыўна радай і Прэзідыумам рады Саюза пісьменнікаў, каб даказаць слушнасць сваіх пазіцый — ад публічных заяў і зваротаў, інтэрв'ю і выступленняў у друку да пікетавання. Былі і непасрэдныя афіцыйныя звароты і асабістыя пісьмы вядомых пісьменнікаў да Прэзідэнта.

Адказ прагучаў на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, сэнс такі: мы навядзём парадак у Доме літаратара". Што ж — спрачацца ніхто не будзе: не ўсё, можа, дастойна пахвалы ў ягонай працы. Але ж гэта не падстава закрэсліваць Дом літаратара, пакідаць у няпэўнасці ягоны калектыў. Сэнс пісьменніцкіх выступленняў быў і застаецца зусім просты і гранічна ясны: Дом літаратара павінен быць захаваны як адзіны цэнтр літаратурнага жыцця, як відны культурны асяродак рэспублікі.

Мае ласку дзяржава падтрымаць Дом літаратара, прафінансаваць часткова яго дзейнасць — калі ласка. Бо не ад добрага ж жыцця здавалася Домам літаратара частка плошчы ў арэнду, а каб выжыць, каб не спыніць працу... А праца была — цікавая, творчая...

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Максім Гарэцкі, Язэп Лёсік, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Драздовіч, Максім Танк, Пімен Панчанка, Алесь Звонак, Ізі Харык, Сяргей Грахоўскі, Мікола Аўрамчык, Ніл Гілевіч, Ігар Лучанок, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Данута Бічэль, Ніна Мацяш, Раман Тармола, Анатоль Зэкаў, Леанід Дранько-Майсюк... і г. д. і г. д., з году ў год, кожны месяц — сама меней паўдзесятка літаратурных вечароў:

(Працяг на стар. 14-15)

— ёсць народ

мовых работ беларускую мову.

Старшыня Саюза кампазітараў Беларусі **Ігар Лучанок** падзякаваў ад імя свайго саюза пісьменнікам за плённае супрацоўніцтва і выказаў упэўненасць, што такое супрацоўніцтва прадоўжыцца.

Паэт **Генадзь Бураўкін** адзначыў, што ў перадз'ездаўскіх выступленнях некаторых асоб сцвярджалася, быццам Саюз пісьменнікаў канае. На думку прамоўцы, Саюз сапраўды хворы, пра што сведчыць паспешлівы прыём у яго апошнім часам не толькі кепскіх пісьменнікаў, але і малапісьменных людзей. Прамоўца звярнуўся да гасцей з Расіі. На яго думку, рускія пісьменнікі вязуць сюды свой вопыт расколу пісьменніцкага саюза. Лагічней было б тым, хто хоча на Беларусі стварыць асобны саюз рускамоўных пісьменнікаў, уступаць у іх расійскі саюз. Прамоўца адзначыў нерашучасць і няўмеласць былога кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў Беларусі. Звярнуў увагу на тое, што на адкрыты ліст народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна да Прэзідэнта так і не было ніякага адказу, што з'яўляецца пэўным паказчыкам культуры вярхоўнай улады дзяржавы. На думку прамоўцы, калі ўлада хоча, каб яе паважалі, трэба, каб яна паважала культуру народа, якім кіруе. Пакуль жа нацыянальнай культурай кіруюць чыноўнікі, раўнадушныя да яе, беларуская інтэлігенцыя не будзе заадно з урадам.

Дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура", лаўрэат Дзяржаўнай прэміі пісьменнік **Георгій Марчук** распавёў пра нялёгкае становішча з выданнем беларускіх кніг. На сённяшні дзень кнігі ў выдавецтве яшчэ выходзяць толькі дзякуючы бескарыслівасці супрацоўнікаў Дома друку і друкарні імя Я. Коласа, бо грошай за іх працу выдавецтва выплаціць не ў стане. Сёння выдавецтва вымушана само займацца распаўсюджваннем беларускай літаратуры, а рабіць гэта вельмі складана. Бібліятэкі не маюць сродкаў для фармавання фондаў; у вёску беларуская кніга зусім не даходзіць... А між тым пакуль ёсць кніга — ёсць народ, ёсць культура. Адзначыў прамоўца і няўважнае стаўленне да пісьменнікаў з боку дзяржаўных прэсы і тэлебачання.

Пісьменнік **Уладзімір Дамашэвіч** выказаў спадзяванне на тое, што мова, культура Беларусі ўсё роўна адродзяцца — як адраджаецца трава там, дзе з зямлі прыбіраюць каменную пліту.

Пасля перапынку на абед з'езд прадоўжыў сваю работу.

Авяр'ян Дзеружынскі — і не без падстаў — наракаў на нявытрыманасць пісьменніцкай аўдыторыі, на недахоп культуры. "Выхоўваць і яшчэ раз выхоўваць" — такой была асноўная думка яго выступлення.

Данута Бічэль, зазначыўшы, што літаратура па ўсім свеце ў крызісе, звярнулася да мясцовых рэалій. На яе думку, наша творчая арганізацыя не здольная рэфармавацца. Застаецца адно — выдаваць рукапісныя зборнікі ды здаваць іх у архіў. Яна кінула папрок мінчукам — маўляў, яны як сабакі на сене: толькі сябе шануюць і выдаюць, — і досыць падрабязна распавяла пра "польскія" справы ў Гародні і канфлікт вакол будынка абласнога аддзялення СБП.

Пра недахоп увагі да пісьменнікаў, што жывуць на перыферыі, гаварыў і **Алесь Касько**. Ён да таго ж гразіўся стварыць свой берасцейскі саюз, праўда, сам жа сябе і астудзіў: "Тамтэйшыя інтэгратары не дадуць нам выжыць". У дадатак ён прапанаваў выключыць з нашай суполкі А. Аўруціна, які "праславіўся" антыбеларускімі публікацыямі ў друку.

Выступленне **Віктара Яраца** сваім пафасам нагадвала прамову Н. Гілевіча: бядотны стан мовы, жалезабетонная сцяна чынавенства, фарысейства многіх літаратараў, якія пабаяліся выступіць супраць апошняга рэферэндуму... У раённых газетах Гомельшчыны беларускімі засталіся адно загалоўкі, няспынна падаюць тыражы "Звязды" і "ЛіМа". "Даравання гісторыі не будзе" — такім быў ягоны прысуд уладу маючым

Вольга Іпатава выказала сумненне адносна таго, ці зможам мы паразумецца з уладай. У крайнім выпадку дадуць нам торбу з аўсом, каб ціхенька хрумсцелі. Тым часам свядомую моладзь будуць па-ранейшаму збіваць і знявольваць. Хіба можна не бачыць гэтага? Саюз пісьменнікаў павінен стаць апорай для тых, хто яшчэ не адвык чытаць па-беларуску, стаць асяродкам прыстойнасці. мужнасці, урэшце — беларускасці.

Вячаслава Адамчыка трывожыць непамерны колькасны рост нашай арганізацыі. "Чым болей нас, тым болей мы раз'яднаны. Хто запісаны ў Пэн-клуб, хто адданы п'ян-клубу, хто ў агрэсіўным ультрасаюзе, хто ў заціснай павятовай філіі". Ён — за саюз прафесійных літаратараў, які будзе заснаваны на наступных прынцыпах:

1. Мы шануем нашых продкаў.
2. Мы аб'ядналіся, каб ратаваць Беларусь і вярнуць ёй гонар нацыі.
3. Мы супраць тых, хто арыентуе нашу незалежнасць як на Усход, так і на Захад.
4. Літаратура — наша прафесія.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Аляксандр Сасноўскі, Васіль Івашын і Генадзь Бураўкін.

Янка Сіпакоў і Янка Брыль.

Фота А. ПРУПАСА

5. У нас роўнасць паміж членамі і роўнасць абавязкаў. У нас няма літаратурных генералаў.
6. Мы за разнастайнасць літаратурных жанраў і формаў.
7. Мы за творчыя кантакты з усім прагрэсіўным літаратурным светам.
8. Мы, не будучы ў апазіцыі да дзяржаўных структур, мусім быць, аднак, у цэнтры грамадскіх падзей.
9. Мы мусім зберагчы маладое пакаленне ад бязроднага касмапалізму, СНІДу і наркаманіі, а нашу Бацькаўшчыну — ад экалагічнай катастрофы.
10. Мы за гуманны лад у жыцці і за беларускасць як у боскіх святынях, так і ў дзяржаўных структурах.

Выступілі таксама **Анатоль Маісееў** (ад імя пісьменнікаў-інвалідаў), **Яраслаў Клімуць, Аляксей Слесарэнка,** а таксама старшыня Дзяржкамдруку **Міхаіл Падгайны.**

Працэс вылучэння кандыдатаў на старшыню саюза прайшоў досыць арганізавана, у чым ёсць заслуга і А. Дударава, каму даверылі весці гэты адказны перыяд работы з'езда. Склад абраных на з'ездзе рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, Літфонду СБП і рэвізійнай камісіі будуць надрукаваны.

ЛіМ ЧАСАПІС

Беларускаму чытачу — беларускую кнігу...

15 красавіка ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце адбылася прэзентацыя кнігі Уладзіміра Жылкі "Выбраныя творы". Гэта ўжо 5-ты том "Беларускага кнігазбору".

Як сказаў Васіль Зуёнак, "Беларускі кнігазбор" мае перад сабой мэту: даць беларускаму чытачу беларускую кнігу з самага пачатку яе ўзнікнення і да сённяшняга часу". І чарговым крокам стаў зборнік паэзіі Уладзіміра Жылкі — таленавітай і трагічнай асобы, творчасць якога была забаронена да 60-ых гадоў.

На прэзентацыі выступілі таксама прэзідэнт "Беларускага кнігазбору" Кастусь Цвірка, Міхась Скобла — укладальнік і аўтар прадмовы, Язэп Янушкевіч — літаратуразнавец, загадчыца кафедры беларускай літаратуры БДПУ Марыя Шаўлоўская. Прысутныя мелі магчымасць пазнаёміцца са сваякамі У. Жылкі, якія выказалі шчырую ўдзячнасць усім, хто мае дачыненне да выпуску зборніка і ўвогуле да даследавання творчасці У. Жылкі. Прагучалі вершы У. Жылкі ў выкананні артыста тэатра юнага гледача Міколы Лявончыка і песні на вершы паэта, якія прапанавалі ўвазе прысутных бард Алесь Камоцкі і студэнтка Вольга Бурак.

Алена КЛЯШЧОНАК

Сёстры-паэтэсы

А да ўсяго — аўтаркі калектыўнага зборніка паэзіі, што стаў другой кніжкай "Бібліятэкі часопіса "Маладосць" за сёлетні год. Пры гэтым кожная з аўтарак мае як бы ўласны зборнічак. Таіса Трафімава назвала яго "Усміхнуся вятрам". Родам яна з пасёлка Манькова Слуцкага раёна, скончыла Мінскае педагагічнае вучылішча, Маскоўскі народны універсітэт мастацтваў, факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Друкавалася ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", часопісах "Полымя", "Маладосць", "Роднае слова", "Першацвет", калектыўным зборніку "Нас слова Купалы да творчасці кліча". Працуе ў Цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей і падлеткаў у Маладзечне і ўзначальвае дзіцячае літаратурнае аб'яднанне "Узлёт". А вось Зоя Падліпская (абедзве яны ў дзявоцтве — Янучок) засталася на любай сэрцы Случчыне — працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Слуцкай сярэдняй школе N 10. Перад гэтым скончыла Слуцкае медыцынскае вучылішча. Мае і вышэйшую адукацыю — скончыла філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага універсітэта. Таксама друкавалася ў "ЛіМе", "Полымі", "Родным слове", у "Першацвеце" і ў тым жа калектыўным зборніку маладых літаратараў Міншчыны "Нас слова Купалы да творчасці кліча". Кніжачку сваю назвала "Палон нябёсаў".

Прадмову да гэтага калектыўнага зборніка ("Замова сэрцам") напісаў Казімір Камейша. Сваё слова ён заканчвае такімі радкамі: "Вітаючы паэтычны дэбют Таісы Трафімавай і Зоі Падліпскай, хочацца пажадаць ім шчаслівай творчай дарогі. Хай менш будзе ў іх радках сумнага і больш светлага. Але гэта не заўсёды залежыць ад паэта, гэта амаль заўсёды залежыць ад самога жыцця.

А прысвяцілі сёстры-паэтэсы сваё прачулае слова памяці маці Ганны Канстанцінаўны Янучок. Яны ж выказалі падзяку фундатарам Уладзіміру Карачуну, Наталлі Пшанічнай, дырэктару МП "Квант" г. Слуцка Мікалаю Чарняўскаму, а таксама ўсім, хто паспрыяў выданню гэтага зборніка.

Вітко — не Вітка, але...

Жывапісец Уладзімір Вітко жыве і працуе ў Віцебску. Але ўжо ягонае прозвішча сведчыць, што нарадзіўся ён на Случчыне — усе мы ведаем імя слыннага паэта-случака Васіля Вітку, хоць гэтае прозвішча для Цімоха Васільевіча — усяго псеўданім. Абодва яны ніколі не забывалі пра сваю малую радзіму. У. Вітко памятае пра яе і цяпер. Тым больш і нагода надарылася, каб наладзіць перад зямлякамі творчую справаздачу — 10 мая Уладзіміру Ільічу спаўняецца 65 гадоў. І хоць мастак прымае ўдзел у выстаўках з 1962 года, а яго асобныя творы трапілі і ў замежныя калекцыі, гэтая, што ладзіцца цяпер у памяшканні Случкага краязнаўчага музея, — ці не адна з самых дарагіх для яго. Вядома, сабрана на ёй толькі самае лепшае. А калі акінуць позіркам творчы шлях, пройдзены У. Вітко, зроблена ім нямала. Уладзімір Ільіч працуе ў жанры тэматычнай карціны, пейзажа, нацюрморта, партрэта. Ды і самыя розныя тэмы яго цікавяць — і наша сучаснасць, і мінулая вайна, чаму ён дае сваё мастакоўскае вытлумачэнне і раскрыццё.

ПАЭЗІЯ

Леанід ЯЎМЕНАЎ

"Шапчу я вершы, як малітву"

Нараджэнне паэта

Дзесьці горла дзяруць драчы,
Дзесьці фыркаюць сонныя коні —
Я накрыюся небам начы,
Уладкую пад голаў поўню.

Буду слухаць аер ля ракі
І дзівіцца, як жмурацца зоркі,
Як шапочуць з дубровай вякі
На сівым ураселым золку.

Я на мрояў чароўных мяжы,
Дзе пачуцці зліваюцца й гукі,
Буду слухаць малітвы душы
Ды дзівіцца, як рояцца думкі...

Гэта час нараджэння, калі
Прачуваешся раптам паэтам,
Кропляй сціплаю роднай зямлі,
Неад'емнай часцінкай сусвету.

Прадвесне

Няўлежна зіме, нібы ў тропіках —
Гукаюць цяпло пугачы,
Брыняе гаючым кляновікам
Прадвесне у чуйнай начы.

Мілуецца люты з мяцеліцай
Па капішчах даўніх Багоў —
Вясною зіма ужо целіцца
Пад сцюжнага неба страхой.

Пачуцці у сэрцы не месцяцца,
Бы ў вырай лятуць у радок —
Люляю я ласкаю месяца
Адвечнасці родны куток...

●

Штодня ўсё шчыльней сіло
Здзічэлых спрытнюг базару:
Як шчасце — у хаце цяпло,
Бляшанка хамсы — як мара.

Між намі дабро ўсё радзей,
Знікае ў нябыт спагада,
Спраўляе нядоля свой рэй
Па змучаных лёсам хатах.

Няведама, будзе ці не
Тут лад хоць якісь калісьці?
Ні кропелькі сонца ў акне,
З начы аніякага выйсця...

У стыні ваўчыцай прыпоўз
Дагэтуль забыты голад,
За плечы бярэ мароз,
За сэрца — магільны холад...

Не пакінь мяне

З. Я.

Пражыву я без сонца,
Пражыву я без вершаў,
Пражыву без бароў.

Пражыву я без буры,
Пражыву я без птушак,
Пражыву без вясны.

Ды ніводнага года,
Ды ніводнага тыдня,
Ды ніводнай гадзіны
Не змагу — без цябе.

Не пакінь мяне ў свеце,
Гэткім жорсткім, драпежным,
Не пакінь, мая вера,
Не пакінь аднаго...

●

Люты мароз,
Зыркае сонца,
Стынь да нябёс,
Скруха да донца.

Змучаны край,
Немач сусвету, —
Шэрасці рай,
Баль прайдзісветаў.

Гора людзей,
Роскіды меры,
Сконы надзей, —
Могілкі веры.

Святы кляцця,
Леты расстання, —
Захад жыцця,
Попел кахання.

Стынь да нябёс,
Скруха да донца, —
Скручаны лёс,
Змерзлае сонца...

●

Шматкроць жыццём і лёсам збіты,
Сябрамі здраджаны не раз,
Шапчу я вершы, як малітву,
Як паратунак ад параз.

Пакуль барок якісь сасновы
Не прыме сумна на клады,
Яны мой стогн, мая замова
Ад чорнай крыўды і бяды...

Крыжаносцы

Імкнуць натоўпам маладыя
Без пэўнай мэты, без развагі, —
Хрыстовы крыжыкі на шыях,
Расхлістаныя на распахі...

Мо ім няма куды падзецца,
Мо ім святлом — даўно былое,
Мо крыж ратуе ў юных сэрцах
Зніч вечнай веры у святое?..

Якая вера? Посмех горкі! —
Базарная какотка мода:
У душах — ні крыжа, ні зоркі,
На шыях — крамная блазнота...

Плач у ліпеньскую ноч

А. Ё.

Душны морак ахутаў сяло:
Цішыня, зоркапад, цвыркуны...
Што было, ўсё быллём парасло —
Крыўды боль дзесь пад сэрцам заныў....

Бо няма ў роднай хаце цяпла,
Бо агеньчык кахання патух, —
Жонка з хаты уночку сышла,
З хаты стаўся астылы катух...

І заплакала скрыпка ў глушы
Болем жалю у чорнай начы,
Чалавечай бядою ў душы
Хоць і сам галасі ды крычы...

Што было, то быллём парасло —
Плача зорны ліпнёвы прасцяг...
Душны морак ахутаў сяло,
Горкі стогн яго сэрца працяў...

Апошняе жаданне

З. Я.

Без цябе, што пры полі дубок
Ці у небе самотны птах —
Асірочаны слых і зрок,
Ненатолены сум і жах...

Мо таму у кашмарных снах
Я губляю у цемры твой след,
Мо таму сцерагу па начах
Твой начны летуценны свет.

Толькі болей пакутлівых сноў
Я баюся, што буры набег
Ірване маё сэрца ізноў
У неадольнай далі ад цябе.

Там, дзе стогнуць чужыя вятры,
Дзе бядуюць чужыя лясы, —
Без вачэй, што ад сумнай зары,
Без агорклай ад гора слязы...

Я не многа прашу у жыцця,
Хай дазволіць мне лёсу рака
Адысці у быццё небыцця
На тваіх спрацаваных руках...

ПРОЗА

ЯК І ТРЭБА БЫЛО чакаць, сам Міндоўт не зажадаў ехаць на паклон да Данілы ў Холм; падаліся Войшалк і Усяслаў — праўда, рашылі не ва ўсім слухаць Данілу, не прыхапілі з сабой Усяслававых сыноў.

Выбраліся ў слотную восень, калі нізка навісла шэрае неба, не толькі абляцела, зрыжэла, але і пачарнела на доле лісце, ліў і ліў дождж, выў і выў вецер, а перад самым ад'ездам нечакана ўсё заціхла і дыхнула ледзяным поцягам — значыць, вось-вось павінны былі пабыць сухія дні, пасці з паветра на зямлю мароз, пайсці снег і ўлегчыся новая, адзін толькі Бог ведае якая па ліку зіма.

Пабудаваны па Данілавым імпэце Холм стаяў на прыгожай, лясістай і ўзвышанай мясціне, многія будыніны былі з белага і зеленкавага камянёў, абкладзеныя пунсовым мармурам, свяціўся пазалочанымі купаламі, — але ў гэтым горадзе, што па багацці, красе і пышнасці не саступаў некаторым старым гарадам, Войшалку і Усяславу было маркотна на душы: іх упусцілі ў Данілаву сталіцу, але, хоць ім спачувала, употай падкормлівала Данілава жонка, Войшалкава стрыечная сястра Юрата, усё ж абыходзіліся з імі холадна і насмешліва, як з пераможанымі прасіцелямі. Яны нудзіліся тут глыбокай восенню, чакаючы, калі вернецца Даніла ў Холм і пакліча іх да сябе.

Цяпер яны добра ведалі, чаму нядаўна Даніла гэтак паспешліва адступіў ад Навагародка: на яго землі з карніцкай місіяй рушыў Батыеў намеснік на іх хан Курамса, а яшчэ Данілу, адбіўшы манго-ла-татарскі напад, прыйшлося з немалой сілаю тут жа ісці ў Чэхію і выратоўваць з аблогі сына Рамана (з Данілам у паход хадзіў і беспрытульны літоўскі князь Таўцівіл). Хан Курамса, не ўзяўшы Крамянца, адступіў у "земли своя", Раман не ўсеўся на аўстрыйскі пасад, але быў выратаваны ад зняволення, а то і пагібелі, вярнуўся дахаты, але Даніла не спяшаўся бачыць Войшалка і Усяслава, таміў іх, каб папакутавалі і пасля, на яго думку, былі больш згаворлівыя і паслухмяныя — гэтак уладары рабілі і задоўга да Данілы, і будуць рабіць нашмат пазней за яго. Нават Данілава любіміца, маладая і прыгожая Юрата (а ёй па-ранейшаму падносілі багатыя падарункі) не магла ім паспрыяць — як казала, яе заступніцтва за сваіх землякоў Даніла ўспрымаў з жартам і пацвельваннем, а калі яна крыўдзілася, плакала, суцяшаў і ўталкоўваў, што яна — не проста Войшалкава сваячка, а жонка караля Галіцка-Валынскай дзяржавы, дык павінна паводзіцца інакш, з яго, мужавых і дзяржаўных інтарэсаў.

Наздзекаваўшыся, толькі напрыканцы зімы — больш ранняй тут, у цяплейшым краі, чым у Навагародку, калі ачысцілася, амаладзела за холад і аблакітнілася неба, павышэла і паярчылася сонца, весела закапалі капяжы, пачаў асядаць, раставаць у зацішках снег, загалёкалі па наваколлі гракі, — знуджаных па сваім доме Войшалка і Усяслава паклікалі ў Данілаў палац. Не проста на сустрэчу і на гутарку, а на лёсавызначальнае для ўсёй Навагародскай зямлі. Летапісцы пра гэта напішуць адзін-два радкі, але для гісторыі тое будзе шмат значыць.

Войшалка і Усяслава познім вечарам прывялі ў прасторную, размаляваную яркімі фарбамі, заморскімі вялікімі і дзівоснымі птахамі палату, дзе, патрэскваючы і мігаючы, гарэла шмат свечак у бронзавых свечніцах на стале і паабапал яго на сценах, сваім святлом яшчэ больш адзівоснівяючы тыя райскія птушкі, некаторыя з якіх чамусьці былі з жаночымі галовамі, а таксама траву ды кветкі, што ўсё было складзена з шматкаляровага шкла і эмалі, пасярэбрана і падзалочана — Даніла не ў прыклад князям Ізяславу і Міндоўгу любіў не ўсё простае, а пышнотнае.

Калі яны, запрошаныя, як і раней, селі насупраць адны адных за накрытым зялёным сукном сталом, то з самага першага мігу не маглі не ўгледзець яшчэ, апроч птаства і разнатраўя, і выкладзены шматколерным шклом малюнак Галіцка-Валынскай зямлі, дзе таўставатым залатым дротам былі абазначаны знаёмыя вялікія рэкі, танчэйшым — меншыя, а вялікія гарады — буйнымі рубінамі (сярод іх былі і Бярэсце, Гарадзен, Услонім, Ваўкавыск, Ноўгарадак і Кіеў, што цяпер належаў Залессю). Асобна была выява і іншых зямель — польскіх, яцвяжскіх, полацкай, літоўскай, жамойцкай і яе суседзяў.

Даніла — па-ранейшаму прыгожы з ацяжэласцю і асівеласцю, у сваёй, як вядома любімай апратцы, у сінім карзне, зашпіленым на правым плечуку залатой фібулаю, пад плашчом — саф'янавая безрукаўка і ружовая кашуля, сінія

шырокія шаравары і жоўтыя боты. Як і раней, на левым баку на скураным поясе — прадзедаўскі меч.

— Здаровы былі, — недружалюбна адказаў на іхняе прывітанне Даніла і рукі не падаў. — Поўныя злосці на мяне?

Войшалк і Усяслаў змаўчалі.

— Зацяліся! — пазлараднічаў Даніла, мігнуўшы брату Васільку, сынам. — Крыўдзяцца, што столькі месяцаў чакалі доступу да мяне!

Зноў на ягоныя словы — маўчанне.

Бачачы іхнюю вытрымку, Даніла яшчэ больш атакаваў:

— Ну, з чым прыехалі? Зноў цягнуць ката за хвост, самім на сябе наклікаць вайну?

— Войны, кароль, аслабілі Навагародак, але і цябе не ўзмацнілі, — падаў голас Войшалк. — Шмат патраціў ты сіл на мунгалаў, на яцвягаў, на нас і чэшскага караля. Няма цяпер у цябе моцы пачаць новую вайну.

— Дарма не трацілі тут часу, вывіжоўвалі! — ухмыльнуўся Даніла.

— Ды відаць усё і без вывіжоўвання, — уставіў сваё слова Усяслаў. — Хопіць аднаго позірку, уздыху, каб усё зразумець. Захапіўся ты войнамі, Даніла. Шкодзіш сам сабе. Вось так, кароль!

— Ды перастаньце вы: "кароль" ды "кароль!" — скрывіўся гаспадар. — Я такі ж кароль, як і ваш Мендог... Што-што, а гэта патаемнае мы ўсе ведаем: я і Мендог былі, ёсць і будзем князямі, праваслаўнымі!.. — А пасля гэтага да Усяслава: — ты чаму прыехаў адзін? Хіба табе не перадалі, што ты павінен прыехаць з сынамі?

— Суровая зіма, дык як марозіць малых дзяцей у доўгай дарозе? — апраўдаўся Усяслаў, хоць для Данілы не было ніякім сакрэтам, што гэта ўсяго толькі загадзя прадуманы падход, нават пэўная смеласць.

— Зіма зімою! — незалюбіў Даніла і ў яго ўзбоч вачэй ды пад імі паглыбеліся зморшчыны немаладога ўжо і спражыванага эмацыянальнага чалавека. — Ты, ліс, падумаў: выкручваліся раней — выкруцімся і цяпер! Ды не выкруціцеся! Дацісну! Даб'ю! Пастаўлю на коленцы!

— Калі і з апошніх сіл даб'ешся перамогі, то ніяк не спажывеш яе! — усміхнуўся адмыслова Войшалк. — Надарвешся! Нават больш — сам станеш камусьці лёгкай здабычаю!

— Вы да мяне прыехалі зноў толькі з такім? — занегадаваў, запунсовеў Даніла, стукаючы па стале кулаком. — Ушчуваць, запалохваць мяне? Зацягваць перамовы і выйграваць час?

— Упарты ты, князь-кароль, — сказаў Войшалк. — Ніяк не можаш пераадолець сваю хцівасць, злосць і помсту. Адумайся, набярыся мудрасці: Навагародская зямля і Літва — ужо новая дзяржава. Так ужо распарадзіўся сам Бог. Разлучыць нас, скарыць табе не хопіць сілы!

Гэтыя словы проста ашаленілі Данілу:

— Надарвуся, траплю ў кіпцюры іншага, але па-вашаму не будзе! Я не дам вам амацавацца!

— І, па-твойму, няма выйсця з гэтага неразумнага супрацьстаяння? — зноў Войшалк прамовіў з усмешкаю, што была непрыемнай Данілу.

— Ёсць! — выгукнуў той. — Навагародак і Літва разлучаюцца, ты і твой бацька вяртаецеся ў сваю вотчыну, а ў Навагародку сядзе і будзе княжыць як мой васал мой сын. Раман альбо Шварн. Без вашай згоды на гэта адсюль я вас не выпушчу! Нават і не думайце спасылацца на нейкія пасольскія правы! Задушу, атручу і — апраўдаюся! — Махнуў рукою. — Ды хто ў Еўропе ці ў мангольскай Азіі заступіцца за вас! Вы засумленнічалі, выпусцілі жывым вашага ж здрадніка, нягодніка, якога я вам наўмысна аддаў, а я вось павядуся з вамі іначай! Знішчу і — усё! Нават, — ткнуў пальцам на Войшалка, — твой бацька не папомсціцца мне! Ён баіцца цябе і во гэтага зубра! Так што вашу сілу, а гэта значыць Навагародак я магу лёгка падкасіць тут!

— Верым, — ухмыльнуўся Войшалк. — Падсыпаць атруты, ударыць нажом у спіну — праўда, не цяжка! Вунь якая ў гэтым доблесць!

— Не блазнуй! — раззлаваўся Даніла. — Хопіць слоўных перапалак! Запытваю, як кажуць, у лоб: каго хочаце мець князем у Навагародку? Рамана? Шварна?

— Давай, князь-кароль, спачатку перамовімся пра тое, што раней раіў мой бацька, — вёў сваё Войшалк. — Якому сыну ты хочаш мець жонкай маю сястру?

— А вы з кім, — Даніла кіўнуў галавой на сыноў, — не супраць парадніцца?

— З абодвума. Мужа нашай Дануце выбірай сам.

— Давайце пажэнім Рамана і вашу Дануту, — памякчэў Даніла. — І Раман — князь у Навагародку.

Войшалк ухмыльнуўся, адмоўна закруціў галавою: хто ж згодзіцца на такое? Калі Раман ашлюбуецца з Данутай і будзе мець дзяцей, то яго нашчадкі будуць мець права валодаць Літвою — гэта значыць, Даніла даб'ецца мірна таго, чаго цяпер вымагаецца сілай.

— Мы добра ведаем твой смач, тваю прагу мець у сваіх руках Навагародак, — ужо сур'ёзна сказаў Войшалк. — І каб ты не падкошваў нас, не знясільваўся сам, мы можам пайсці на ўступку. Шлюбім Дануту з адным тваім сынам, але да нас на княжанне прыбудзе халасцяк. Мы іншую знойдзем яму жонку.

— Гэтага мне мала, — не задаволіўся Даніла.

— Наадварот. Гэта, кажу, вялікая наша ўступка. Праўда, агаворымся: твой сын княжыць у нас не як твой васал, а як васал майго бацькі!

— Уступка! — хмыкнуў Даніла. — Гэтым вы змушаеце мяне прызнаць, як вы любіце казаць, Навагародска-Літоўскую дзяржаву пад Міндоўгавым вяршэнствам!

— Нас прызнаў Рым, як нядаўна і цябе, — адказаў Войшалк. — І калі ты хочаш у яго даверу ды яшчэ для таго, каб сабраць еўрапейскую сілу супраць манголаў, стаць славутым, то запыні славянскую міжусобіцу!

— Інтрыгуеце на маім "каталіцтве"!

— Паколькі ты сам хітруеш, то і ведаеш: хітрує і мой бацька. Але нам трэба запыніць войны супраць адзін аднаго. Імі мы знясільваемся, яны — на карысць Заходняй Еўропы і Азіі.

— Ладна, — узмахам рукі перапыніў Войшалка Даніла. — Згодны: Дануту аддаяце за Шварна, яны будуць тут, Раман — навагародскі князь, Міндоўгаў васал. Гэта — ужо мая вялікая ўступка! Але гэтую маю ўступку мы падмацуем Раманавай бяспекаю...

— Які ты недаверлівы! — паматляў галавою Войшалк.

— Мяне вы не абведзяце вакол пальца! — патрос пальцам Даніла. — Добра спазнаў вашу хітрасць! Умееце спажыць спрыяльную часіну, замышляеце не малое! Я проста так не пашлю да вас свайго сына. Каб во ён, хітрун з хітруноў, — паказаў на Усяслава, — сам аберагаў майго нашчадка, я мушу запатрабаваць: няхай ён выкліча сюды сваіх сыноў. Мне ў закладнікі. Тады сам завязе Рамана ў Навагародак і пакажа яго Міндоўгу і навагародскаму люду. Будзе жыць Раман — будуць жыць і яго дзеці!..

Як і ў Навагародку, пачуўшы Любаміравы словы пра сваіх сыноў, зноў ва Усяслава зайшлася душа, а да галавы хлынула кроў — так, ажно пацямнела ўваччу. Якой паною трэба здабываць волю! Жыццём сваіх дзяцей! Як такое вытрымаць самому, як такое сказаць такой адданай жонцы і маці, як Любка?! Яна ж пасля такога не толькі адчаіцца, але можа і ўзненавідзець яго, лічы, згубцу сваіх і яе крывінак!

— Што? Забалела сэрца? — пазлараднічаў Даніла. — Як табе шкада сваіх чад, так і мне, дарагі, неабыякава маё чада! Дык будзем берагчы: я — тваіх, а ты — маё!

Вось дзе трэба з усёй моцай розуму, душы і пачуццяў усклікнуць: бацькі, станьце на калені перад гэтым чалавекам і бацькам, які дзеля Дзедаўшчыны гатовы ахвяраваць сваімі дзецьмі! Найбольшага яго гора, найбольшага яму папроку няма, як і няма найбольшай ягонай славы, а гэта значыць і карысці для роднага люду!!!

— Я згодзен, — цяжка выдыхнуў Усяслаў, прадбачачы, колькі ляманту, слёз, справядлівых папрокаў выкліча ў яго горача любімай, самай дарагой Любкі гэтая ягоная самаахвярная згода, што ў любы — канечне ж, самы патрэбны для Навагародка час — можа выліцца ў самае страшнае іхняе сямейнае няшчасце. Ды трэба, трэба і, яшча раз варта паўтарыць, мусова ісці на такі, лічы, антычалавечы крок!

— Не, гэта яшчэ не ўсё, Усяславе! — пацяшаўся Даніла. — Не, гэта яшчэ не ўсё, даражэнькі Войшалачак! Сын мой будзе Міндогаў васал, але Міндоўг і ты, Войшалк, будзеце не ў Навагародку, а ў сваёй законнай Руце!!! І ён, — яшчэ раз ледзь не тыцкнуў пальцам ва Усяслава, — сваімі дружынамі, вернымі яму, акі псы, даб'ецца гэтага! Я, паважаны мною ваяр, палкаводзец, даўно хацеў і хачу звесці цябе са свету, але ты зберажэш маё чада, падначаліш Холму свой любімы Навагародак!!!

Вялікі сорам, вялікая ганьба цярпець такое, але трэба! Дзеля сябе, жонкі, дзяцей, Навагародка і патомнага часу!!! Тут ужо ні да таго, каб думаць, ці хто калінебудзь успомніць, узважыць твае асабістыя пакуты. А гэта змушае на іншы, канечне ж, брыдкі крок: лічы, выдаліць вернага Міндоўга з Навагародка, адкінуць яго ў Літву, дзе яго зноў будуць абкладаць, як ваўка. Усяслаў падняў вочы на Войшалка: якая твая думка, Міндоўгаў сын? Ці даруеш ты мне, калі я згаджуся ўнізіць, аслабіць твайго бацьку? Войшалк вытрымаў гэты цяжкі позірк і вачыма паказаў: не супраціўляйся, любы мой дзядзька-пястун, не пярэч гэтаму сатрапу, што дзеля сваёй задумы, мары, хцівасці гатовы пайсці і на самазнішчэнне!

— Даціскаеш ты нас, Даніла, — здаўся Усяслаў. — Але, прашу, не злуй наш люд да канца: Раман без нашай згоды не будзе мець права пачынаць войны ці браць удзел у тваіх авантурах! Толькі пасля твайго такога запэўнівання я даю слова зберагчы твайго сына, наш уступак табе!

— Даю такое слова, — ужо радасна ўсміхнуўся Даніла.

— Князь-кароль, зноў, але ўжо нечакана для Усяслава ўступіў у размову Войшалк, — я перавышаю свае паўнамоцтвы, іду супраць бацькі, але я асабіста хачу быць зарукай бяспекі твайго Рамана.

— Не зусім зразумеў, — пацепнуў плячыма Даніла.

— Ты добра ведаеш: ад першай жонкі ў майго бацькі я адзіны сын, — ужо не абмоўлена з Усяславам пачаў тлумачыць сваё, мабыць, глыбока запаветнае Войшалк. — Як добра ведаеш і іншае: я не вой, як мой бацька, як вось ён, баярын Усяслаў, як ты і як твае сыны. — Войшалк прамаўляў і бялеў усё больш і больш. — Я змалку прывучаны маёй любімай, самай найлепшай на свеце маці да глыбокай боскай веры, да павагі, любові, сардэчнасці да кожнага чалавека, хто б ён ні быў. Я даўно марыў пасвяціць сябе царкве, ды бацька мне гэта забараняў, заўсёды проста ўбіваў мне ў галаву: ты — адзіны мой сын, ты — княжыч, цябе любіць Навагародак, ты з ім узвысішся! Я, як і кожны сын, павінен слухацца свайго бацькі. Я і спаўняў яго волю. Але я тут, на тваёй зямлі, князь-кароль, упэўніўся: я не магу служыць звадам, хцівасці, мячу, я хачу служыць Богу! Таму прашу: недаверлівы да нас, варожы, але мудры ўладар, дазволь мне застацца тут, каб пайсці ў ваш манастыр, усяго сябе аддаць праваслаўнай веры, а пасля, калі ты дасі сваю высокую згоду, вярнуцца ў бацькавую Літву і ахрысціць яе ў праваслаўе. Я ж душой адчуваю: ты быў і ёсць праваслаўны чалавек!

Гэтыя Войшалкавы словы разгубілі як Данілу, так і Усяслава: ён, Войшалк, сам набіваецца ў Данілавага закладніка. Нават самы старэйшы Данілавіч, Леў, вырачыў вочы: што за самаахвярнасць? На такое можа рашыцца толькі вельмі моцная ці, наадварот, слабая асоба.

— Княжыч!... Войшаль!.. — Не мог і пры Данілавай свіце ўстрымацца Усяслаў. — Ты ідзеш супраць бацькі!

— Дарагі мой дзядзька-пястун, я скажу і пры князі-каралі Даніле: так трэба, — Войшалк горка ўсміхнуўся, паклаў сваю халодную руку на яго. — Пасля гэтага князь-кароль Даніла пачне нам больш верыць і я споўню сваю і матчыную даўнюю мару — ахрысціць Літву.

— Ну, княжыч! — нарэшце заззяў вясёлай усмешкай Даніла. — Ты змусіў мяне, бывалага, запаважаць цябе, па гадах майго сына, за мудрасць. На такі крок не кожны сам пойдзе.

— Я, князь-кароль, аддаюся Богу, — апусіў галаву Войшалк. — Ён, толькі Ён — для нас усіх дарадца і суддзя! А вы, Холм і Навагародак ды Літва, сустракайцеся не на полі бою, а за бяседным сталом!

Даніла зацягла паўзіраўся ў Войшалкавы вочы, а пасля ўражана пацісну плячыма:

— Не ведаю, княжыч. Можа, я і дабіўся ад вас таго, чаго хацеў, але... За тое, што ты сам захацеў застацца тут, ты мне спадабаўся! Руку, дай руку, слаўны сын славутага бацькі!

Войшалк падняўся — таксама проста ўскінуты пружынаю Даніла моцна сціснуў слабую руку аднаго са сваіх сапернікаў, а пасля і аблапіў за плечукі:

— Саюзнікі?

— Саюзнікі, князь-кароль.

— Кажу ж, не ўспамінайце нават гэтага слова "кароль"! Мы — адно! Славяне! Праваслаўныя! Суседзі! Браты!

Затым гэтак жа ўсцешана Даніла абласкаў і Усяслава.

Калі позна ўжо вярталіся з багатай вячэры, дзе былі з Данілам, яго сынамі і баярамі, падпіты Усяслаў, застаўшыся сам-насам з Войшалкам у познюю зімнюю паўясную, з серабрыстым адлівам ноч, не мог не сказаць таго, што, як кажуць, увесь час ліпела на кончыку языка:

(Працяг на стар. 12)

Генрых ДАЛІДОВІЧ

ЖЫВЕ І БУДЗЕ ЖЫЦЬ!

СТАРОНКІ З РАМАНА "КЛІЧ РОДНАГА ЗВОНА"

Закончыў раман "Кліч роднага звона".

У першай частцы, што друкавалася ў "Полымі" ў NN 10—11 за 1995 год, а летась выйшла кнігай у выдавецтве "Юнацтва", была мая празаічная версія пра падзеі вакол Навагародка ў 1245—1246 гады, калі ён, ацалеўшы ад мангольскага нашэсця, даволі мірна аб'яднаўшы вакол сябе слонімскія, ваўкавыскія, гарадзенскія і іншыя землі, зноў жа без вайны замахнуўся на Літву, што была паміж сённяшнімі Маладзечнам, Мінскам, Слонімам і Наваградкам. Для гэтага знайшлі просты, але мудры ход: запрасілі княжыць у Навагародку ўладара Літвы Міндоўга.

У другой, заключнай частцы — маё асэнсаванне 1250—1270 гадоў, калі многія суседзі насцярожыліся ростам, узмацненнем Навагародска-Літоўскага гаспадарства і пачалі супраць яго войны, у тым ліку і кааліцыйныя. Асабліва намагаўся раскалоць Навагародак і Літву, падуладзіць іх уладар Галіча і Валыні князь (услед за Міндоўгам і кароль) Даніла. Ён і яго сыны нават не брыдзіліся наводзіць сюды чужынцаў — полаўцаў і манголаў. Ды нашы продкі і ў войны, і дыпламатыяй не толькі ўстоялі, але пазней утварылі адну з буйнейшых у Еўропе дзяржаву, дзе ва ўсім пераважаў беларускі лад.

Ва ўрыўку, што прапаноўваю ўвазе чытача, маё разуменне таго, на мяжы 1253—1254 гадоў, ходу, да якога прыбеглі навагародцы, каб уратавацца ад Данілы, калі апошні ўжо тры разы за пяцігоддзе ўцягваў у войны, спусташаў Навагародскую зямлю і ледзь не ўзяў саму яе сталіцу.

АЎТАР

ЧАСАПІС

"З надзеяй — у будучыню"

Такую назву мае фотавыстава, што адкрылася ў Мінскай абласной бібліятэцы імя Пушкіна па лініі "Беларускага дабрачыннага фонду" (старшыня — Я. Фядзюшын). На выставе прадстаўлены работы журналісткі Гіззлы Шварц, што прыехала з гарадка Гумерсбах (ваколіца Кёльна). Разам з дабрачыннай арганізацыяй "Дапамога дзецям Чарнобыля" Г. Шварц неаднойчы была ў забруджаных раёнах Расіі, Украіны, Беларусі. Гэта дзесятая па ліку паездка журналісткі ў нашу рэспубліку. Зноў прывезены сродкі, лекі, медыцынскае абсталяванне. І на гэты раз — кранальныя фотаздымкі, з якіх пазіраюць нейкія вельмі дарослыя вочы хворых дзетак.

Па словах фотажурналісткі, яе задачай было не столькі ўвасобіць на фотаплёнцы воблікі пацярпелых ад радыяцыі дзяцей, колькі зазірнуць у іх душы. А больш за ўсё здзівіла яе, што дазвалялі сябе здымаць і прыгнечаныя горам бацькі. "Трэба, каб свет ведаў пра трагічныя наступствы чарнобыльскай бяды. Выкарыстанне атамнай энергіі — праблема ўсяго чалавецтва, усёй цывілізацыі".

Адкрыла выставу пісьменніца Вольга Іпатава. Сказаў слова і прачытаў верш Мікола Мятліцкі, адзін з ініцыятараў кнігі "Прайсці праз зону". Гэтую кнігу паэт і падараваў гасцям з Германіі.

На адкрыцці выставы прысутнічалі прадстаўнікі медыцыны — як з нашага, так і з нямецкага боку. У іх ліку і анколаг Г. Баймаер, які робіць усё магчымае для выратавання дзяцей, што лечацца ў Германіі.

Г. К.

Арыгінальны слоўнік

Чытаючы творы гістарычнай спадчыны беларускага народа,мы часта сустракаем незразумелыя старажытныя словы і выразы, якія ўжываюцца ў помніках пісьменства. Нават мастацкія творы на гістарычную тэматыку патрабуюць хоць пэўнага азнаямлення з назвамі шматлікіх з'яў і паняццяў, прадметаў рознага прызначэння, з якімі нашы далёкія продкі сутыкаліся ў паўсядзённым жыцці. Многія з гэтых слоў даўно выйшлі з ужытку і зараз выкарыстоўваюцца толькі ў мэтах мастацкай стылізацыі.

Настаўнікам і студэнтам, старшакласнікам і навукоўцам розных галін ведаў, пісьменнікам і дзеячам культуры прызначаны "Старабеларускі лексікон", падрыхтаваны загадчыкам кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ Мікалаем Прыгодзічам і дацэнтам гэтай жа кафедры Галінай Цівановай. У падручным перакладным слоўніку даецца больш за 6 тысяч старабеларускіх беззэквівалентных слоў, якім у сучаснай беларускай літаратурнай мове адпавядаюць адрозныя лексемы. Створаны на шырокім фактыкалагічным матэрыяле, слоўнік стане незаменным спадарожнікам пры чытанні самых разнастайных тэкстаў старажытнага пісьменства, літаратурна-мастацкіх твораў гістарычнага зместу.

"Старабеларускі лексікон" надрукаваны ў Беларускім выдавецкім таварыстве "Хата", якое ўзначальвае пісьменнік і журналіст В. Санько. Набыць слоўнік можна ў кнігарнях, а таксама на філалагічным факультэце БДУ.

На Радаўніцу

Раней за ўсіх на Гомельшчыне вішні расцвітаюць у вёсцы Белы Бераг Нараўлянскага раёна. Толькі каму цяпер радасць ад гэтага на апаленай чарнобыльскай радыяцыяй зямлі? Свежымі магіламі адзначаны яе журботны шлях на мясцовых могілках. Толькі на Радаўніцу ажываюць пакінутыя людзьмі вёскі: памянуць сваякоў прыязджаюць не толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА

ТЭАТР

Кроў нашай веры

У 1939 годзе ў Гомелі адкрыўся дзіцячы тэатр. Назвалі яго Дзяржаўным тэатрам лялек БССР: імя далі гучнае... невялічкаму гурту аматараў, які і базы сваёй не меў.

Тры гады павандравалі артысты па Беларусі. Пачалася вайна. Яна раскідала ўсіх па свеце так, што замест гісторыі тых вандровак засталіся сведчанні артысткі Нэлі Янаўны Далгі, з якой я пазнаёміўся ў 1966 годзе ў Рызе. Яна расказвала, што вандравалі на возе, а калі не было каня, дык у каляску, куды складаліся дэкарацыі і лялькі, запрагаліся самі... Былі маладыя, лялькі і тэатр так забралі душу, што аб іншым і не марылася. Яны ўжо ведалі пра тэатр Абразцова і хацелі, замахваліся зрабіць нешта падобнае...

...Умоўна я падзяліў 60 гадоў тэатра на пяць "колаў" тэрмінамі ў 3, 10, 15 гадоў. Такім чынам, я апісаў першае "кола". Я абапіраўся на ўсё, што сабраў ды прачытаў, — не так і шмат, дарэчы...

Пасля вайны тэатр паўстаў у новым аблічы — з новым акцёрскім складам. Склад — са сваімі надзеямі, закаханы ў мастацтва: В. Калашнікаў, Л. Мікула, Е. Сопат, Я. Травулька...

Па другім "коле" пайшла гуляць лялечная ідэя, збіраючы і натхняючы моладзь. Мінск, што падымаўся з папялішчаў, даў прытулак лялечнікам — пад дахам Вялікага тэатра оперы і балета. Але яны, як і першая трупа, часам вандравалі па Беларусі, забіраючыся ў самыя глухія мястэчкі, дзе чакалі іх дзеці і дарослыя. Рэпертуар надзвычай розны: і патрыятычныя казкі — беларуская і руская, і бытавая камедыя з выхаваўчым зместам... Я і сам яшчэ заспеў часіну, калі давалі спектаклі ў вёсках — гадзін у 9 вечара, як кароў падояць...

Вясковы глядач — з гумарам, шчыры ў сваёй непасрэднасці і вельмі ўдзячны.

У драўляным маленькім клубе заўсёды збіралася амаль уся вёска — і старыя, і малыя. Нават у вокнах тырчэлі бялюткія галоўкі хлапчукоў і дзяўчынак з аблупленымі ад сонца насамі. Праз шчыліну ў шырме мы назіралі за імі, а яны рабілі заўвагі кшталту: "Вой глядзі, як вылупляецца, як Донік перад Антунінай, калі вып'е!" — гэта быў каментар да ролі Блазна са спектакля "Папялушка" Грабэ...

Іншым часам на спектакль прыходзіла якая-небудзь маладзіца з немаўляткам, і калі той пачынаў енчыць, давала яму грудзі — той сціхаў, вочкамі лыпаючы на лялькі, і калі адпускаў сасок, малако капала яму на падбароддзе...

Можна шмат успамінаць вясёлага і смешнага з гастрольніцтва тых часоў, дзе артысты бачылі жыццё людзей горада і вёскі. Гэта багаціла акцёрскі досвед, запасіўся скарб чалавечых характараў, якія пазней увасобяцца ў пэўныя рысы будучых персанажаў...

Самае вялікае свята трэцяга "кола" — калі ў 1964 годзе палову кінатэатра "Піянер" аддалі лялечнікам. І, на вялікі жаль, гэтым "шчасцем" мы душымся ўжо трэцюю частку стагоддзя...

У тэатры ўзору 1964 года працуюць В. Уласаў, У. Калашнікаў, М. Каладзінскі, С. Стэфановіч, А. Іванова, Л. Пахомава, Л. Мікула; з моладзі — В. Пражэва, Я. Рагачоў, В. Кабелеў, В. Зельскі, А. Сюцюкоў... На пасадзе галоўнага рэжысёра — Анатоль Ляляўскі, галоўнага мастака — Леанід Быкаў. Ужо напоўніцу занятыя мастачка Аліна Фаміна і рэжысёр Вікторыя Казлова.

Дзякуючы ім, а ў першую чаргу таленту нашага Анатоля Аляксандравіча, пачынаюць з'яўляцца спектаклі для дарослых — "Чортаў млын", "Прыўкрасная Галатэя", "Скарб Сільвестра", "Мой, толькі мой", "Клоп", "Ляўша", "Да трэціх пеўняў", "Прыгоды бравага салдата Швейка", "Жаўрук". Л. Быкаў ставіць балеты І. Стравінскага — "Вясну Свяшчэнную" і "Вучня чарадзея" Дзюка. А дзіцячых назваў — 12 ці 13!

У Мінску — лялечны бум. У лялечны тэатр не дастаць білетаў! Іх пытаюць за два месяцы наперад! Мінчукі займаюць чэргі аж у шэсць гадзін раніцы!

Асноўны глядач — студэнты. Што можа быць больш прыемным для артыста, калі ў яго бяруць аўтограф за квартал ад тэатра?

А трэба адзначыць, што са спецыяльнай акцёрскай адукацыяй у тэатры — толькі 3-4 чалавекі, астатнія — моладзь. Мы ўсе як сляпыя кацяняты ідзём за нашым павадыром Анатолем Ляляўскім. У яго заўсёды можна знайсці падтрымку, у яго заўсёды да нас ёсць цікавасць, ён для нас — родны чалавек з багацейшай эрудыцыяй і далікатнасцю, дыпламатычны, тактоўны. Жыццё і творчасць Анатоля Ляляўскага мусяць быць апісаны і зведзены ў "Евангелле" нашага лялечнага жыцця...

У гэты ж час ужо існуе фестывальная праграма рэспублік Прыбалтыкі і Беларусі. На працягу 20 гадоў ладзяцца фестывалі ў Таліне, Рызе, Коўні, Вільні, Мінску. З'язджаюцца з замежжа майстры лялечных навук. Побач з айчыннымі кітамі С. Абразцовым, А. Ляляўскім, М. Каралёвым, В. Сударушкіным, — чэх Ян Малек, палякі Ян Вількоўскі і Хендрык Рыль...

Кожны дзень з дзесяці гадзін раніцы — канферэнцыі, дыскусіі, абмеркаванні. Выступаюць крытыкі з Масквы і Ленінграда на чале з самой Леанорай Шпет. Леанора Густаўна, дачка сусветна вядомага філосафа Густава Шпета — крытык першай велічыні. Хворая, яна трымала аўдыторыю моцна, хоць прамаўляла вельмі ціха. Яна аддала сябе мастацтву — без перабольшання. Жыць ёй тады заставалася вельмі нямнога...

Мы, маладыя, ловім кожнае яе слова. Цікавыя агляды І. Жараўцавай і Я. Калманоўскага, Б. Паюроўскага і А. Смірновай даюць магчымасць і нам трэніраваць свае мазгі, спрачаючыся далёка за поўнач.

Мы ўзрушаны спектаклямі В. Мазураса і Раткявічуса, Ц. Хэрцбэрг і Вейке. Адбіваем далоні, вітаючы таленты П. Шэнгафа і Р. Агура. Зоркай свеціць амаль 20 гадоў Хендрык Таомперэ, а артыст з Рыгі Леў Бірманіс, душа ўсіх фестываляў, назаўсёды застаецца сябрам нашага тэатра.

Беларусь рушыла паперадзе са сваімі акцёрскімі талентамі, сярод іх да сёння вылучаецца У. Матрос. "Тыграня Петрык" і "Званы-Лебедзі" адкрывалі для замежжа імёны А. Ляляўскага і Л. Быкава, В. Казловай і А. Фаміной.

Ішоў інтэнсіўны працэс развіцця, паглыбленне ў веды, законы жанраў. У 1978 годзе тэатр упершыню выехаў за мяжу: у Балгарыю, у Варну, на фестываль "Залаты дэльфін". Вікторыя Казлова і Ларыса Герлаван прадстаўляюць свой спектакль "Арэшак" — ён адзначаны "Бронзавым дэльфінам". Нашыя артысты ў цэнтры ўвагі, яны лаўрэаты фестывалю!

У Беларусі лялечным тэатрам захапляюцца, і ўсё больш — моладзь. Наступства захаплення — адкрыццё аддзялення лялек у нашым тэатральным інстытуце. Яго вядуць Анатоль Ляляўскі, Вікторыя Казлова і Аліна Фаміна...

У Анатоля Аляксандравіча Ляляўскага выяўляецца талент выкладчыка і выхавацеля. У бліжэйшым будучым ён "укладзе розум" і "ўвалье кроў нашай веры" многім маладым, — яны цяпер працуюць амаль ва ўсіх тэатрах рэспублікі. З часам здаецца, што мы, лялечнікі, — нейкі асаблівы тэатральны клан. Хоць заўсёды поруч з творчасцю — матэрыяльныя цяжкасці, не вытрымліваюць іх адзінкі. Асноўныя "вар'яты" нясуць "лялечную ідэю" высока, хоць часам трагічна. ...Памёр малады Лёня Кулага, выпускнік М. Каралёва — толькі зрабіўшыся галоўным рэжысёрам Магілёўскага абласнога тэатра лялек... Ужо колькі гадоў няма нашага Валодзі Палякова — у яго, здавалася б, была наперадзе такая бліскучая артыстычная будучыня... Няма і Уладзіміра Аляксандравіча Калашнікава — лялечніка-першапраходца; няма першага лялечнага крытыка Міхася Каладзінскага, мастачкі Ларысы Герлаван і нашага Анатоля Аляксандравіча Ляляўскага...

У Дзяржаўны тэатр лялек прыйшлі аднадумцы. Дырэктарам — Яўген Клімакоў і галоўным рэжысёрам — Аляксей Ляляўскі, распачаўшы "чацвёртае кола". Наш бацька саступіў дарогу ўласнаму сыну, з якога сам выхаваў рэжысёра. Прыходзяць выхаванцы розных школ і педагогаў: Маланкіна і Луцэнкі, Андросіка і Громава.

Тэатр падобны да вулкана: ён фантануе новымі ідэямі, бруіць, струменіць... З'яўляецца "Дзед і Жораў" В. Вольскага, а потым — і "Майстар і Маргарыта" М. Булгакава...

Чэргі ў касе! Пасля фестывалю ў Рызе — цэлы шэраг паездак па Еўропе, нават Парыж з усімі прыўкрасамі свету, на чыім фоне наш дырэктар Жэня Клімакоў... адзін загружае кантэйнер з дэкарацыяй з прычыны нейкай арганізацыйнай нявыкруткі.

Усе ажываюць, ізноў свеціць сонца ў тэатральнае ваконца. Мы бачым, як фарміруецца новая тэатральная канцэпцыя руху. Мы бачым лідэра Аляксея Ляляўскага, які ўжо сталы творца са сваім адметным светапоглядам, са сваёй мэтай. Ён ставіць спектаклі, якія выводзяць тэатр за межы нашай дзяржавы. Яго лічаць адным з цікавейшых рэжысёраў краіны. Беларускія лялькі мо-

Першы ў чарадзе

1998 ГОД НАЗВАНЫ ГОДАМ РЭЖЫСЁРА С. ЭЙЗЕНШТЭЙНА

Стогадовы юбілей кінематографа і стогадовы юбілей С. Эйзенштэйна падзяляе хіба колькі гадоў. Першым нарадзіўся Кінематограф, другім — ягоны прарок С. Эйзенштэйн.

Дзіўна: аснова Кінематографа — сінтэз мастацтваў — зрабілася і жыццёвым стрыжнем С. Эйзенштэйна. Яго называюць Леанарда да Вінчы XX стагоддзя — за рознабаковую геніяльнасць. Сапраўды, спачатку Эйзенштэйн захапіўся цыркам і архітэктурай, потым, больш сур'ёзна, — тэатрам, графікай, кінематографам. Прарокамі робяцца выпадкова. Калі С. Эйзенштэйн пакінуў тэатр свайго настаўніка Мейерхольда (які потым напіша "Ганаруся вучнем, які ўжо зрабіўся майстрам"), то дзеля таго, каб здымаць кіно. Наватарскае. Прароцкае.

Ужо першы фільм С. Эйзенштэйна — "Дзённік Глумава" — эксперыментальны: героі своеасабліва вытлумачанай п'есы Астроўскага "На ўсякага мудраца хапае прастаты" — блазны. Цыркавыя атракцыёны выкарыстаны маладым рэжысёрам і ў другой карціне — "Стачка" (1924). С. Эйзенштэйн жартаваў: "У маім тастаменце напісана: хаваць мяне будзеце пад цыркавы марш". Аднак сапраўдным падручнікам па рэжысуры зрабіўся наступны фільм Эйзенштэйна — "Браняносец "Пацёмкін" (1925). Менавіта пасля "Браняносца" загаварылі пра "мантаж атракцыёнаў" (спалучэнне псіхалагічна вострых эпізодаў, кожны з якіх выклікае неабходныя перажыванні ў гледачоў), кінаметафары пра "час крупным планам". С. Эйзенштэйну і аператару Э. Цісэ запляскаў у ладкі ўвесь свет. Але як успрымаецца гэта нямая, чорна-белая стужка сёння? Скажу ад сябе: глядзела на адным подыху. Цікава, што і сам "Браняносец" можна параўнаць з дыханнем. Уздых — незадавальненне матросаў, словы Вакулінчука: "Браты! У каго страляеце?", паўстанне. Выдых — элегія начнога туману. Зноў працяглы ўздых — мітынг каля намёта з мёртвым Вакулінчуком: "Зямляцам!" Выдых — адэсіты сустракаюць "Браняносца "Пацёмкіна". Уздых — расстрэл на пацёмкінскіх сходах. Нельга забыцца і на метафары Эйзенштэйна: каменнага льва, які з дапамогай мантажу ўскочыў ад прыкрасці, дынамічную пульсацыю рухавікоў браняносца, нібыта чалавечага сэрца. А якія ёмістыя дэталі: завостраны, нібыта лязо, крык святара, дзідападобныя цені салдатаў, дзіцячая каляска, якая коціцца па сходах...

Як успрымаецца "Браняносец "Пацёмкін" сёння? Па ўспамінах Э. Цісэ, дваццацісямігадовы Эйзенштэйн увесь час шукаў усё новыя і новыя сродкі выразнасці. Напрыклад, каб рэгуляваць асвятленне кадра на вуліцы, ён разам з Э. Цісэ, які здымаў усе фільмы Эйзенштэйна, упершыню выкарыстаў люстэркі. Эйзенштэйн першым вынайшаў (а, можа, прадбачыў?!) і каляровае кіно. Памятаеце той эпізод у "Браняносцы", калі нечакана ў кадры з'яўляецца размаляваны чырвонай фарбай сцяг? "Мастак павінен дамагчыся таго, каб глядач апынуўся ў свеце, дзе ніколі не быў, і паверыў, што гэты свет мае права на існаванне", — гаварыў польскі рэжысёр А. Вайда. Маладому рэжысёру Эйзенштэйну і больш дасведчанаму калегу Цісэ гэта ўдалося...

А вось маладым рэжысёрам 90-х не ўдаецца. Кіно зашыфраванае, метафарычнае, сёння ігнаруецца. Абывацеля не цікавяць аўтарскія пошукі. Але і я была ў свеце, які стварылі модныя цяпер рэжысёры Н. П'янкова ("Дзіўны час"), Д. Мясхіеў ("Над цёмнай вадой", "Экзэрсіс N 5", "Амерыканка"), Г. Сукачоў ("Крызіс сярэдняга ўзросту"), але вяртацца ў яго больш не хочацца. Наогул цяжка не пагадзіцца з расійскім кіназнаўцам Р. Юрэневым: "Якімі б ні былі сучасныя фільмы — гукавымі, каляровымі, стэрэафанічнымі, шыроказкраннымі, — нямы, чор-

гуць ужо самі быць заканадаўцамі мод, і ўжо Мінск з'яўляецца "мекай" для лялек свету, — з поспехам прымае два міжнародныя фестывалі, з цікавейшымі гасцямі, што з Амерыкі, што з Еўропы.

А між іншым тэатр прымае ўдзел у шматлікіх міжнародных фэстах. Спектакль "Дзед і Жораў" В. Вольскага (аж у чацвёртым рэжысёрскім прачытанні!) усё роўна ўяўляецца візітоўкай тэатра. Цікава, што менавіта гэта п'еса ва ўсіх рэдакцыях мела поспех. Апошняя рэдакцыя ўзняла цэлы шэраг праблем з жыцця чалавека і яго імкнення да розуму, у тым ліку і да вышэйшага. У спектаклі арганічна выкарыстаны батлейкавы прынцып існавання артыста; падставовым для сцэнаграфіі Алы Ганіёдскай зрабіўся ганчарны круг... Лялькі — амаль копія "дымкаўскай" цацкі"; у руках таленавітых В. Белаш і А. Казакова яны робяцца надзвычай адухоўленымі і цікавымі. Сам спектакль узважана дапускае імправізацыю двух акцёраў...

"Дзед і Жораў", "Салавей" Г.-Х. Андэрсена, "Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты", "Сымон-музыка" Я. Коласа, "Папялушка" Маснэ, "Кот Максім", "Майстар і Маргарыта", "Цар Ірад" Г. Барышава, "Снежная каралева" А. Ляляўскага паводле Андэрсена — гэта этапныя работы рэжысёра Аляксея Ляляўскага і мастака Аліны Фаміной.

І, нарэшце, "пятае кола" вызначаюць спектаклі Алега Жугжды — "Прыгоды алавянага салдаціка"... А. Жугжды паводле Андэрсена і спектаклі Ірэны Мацкевіч "Гэта ты, Моцарт?", "Запіскі вар'ята" паводле М. Гогаля. Першыя пастаноўкі гэтых рэжысёраў у нашым тэатры даюць падставу для аптымізму, іх прыхільна сустрэлі і гледачы, і крытыка. Напрыклад, тое, што ў Ірэны Мацкевіч артысты заспявалі, ды оперны рэпертуар дае магчымасць пашырыць межы ўласна лялечнага спектакля. Артыст мусіць не толькі валодаць рознымі сістэмамі лялькі, але можа скарыстацца з усяго, чым яго Бог адзначыў.

Студэнцкі праект Ірэны Мацкевіч "Запіскі вар'ята" адразу знайшоў сабе месца ў рэпертуары нашага тэатра. Удзел у дзесяці міжнародных фестывалях і "Гран-пры" ў Мінску ў 1993 годзе сведчаць самі за сябе. А артыст тэатра Валерый Глазкоў, здаецца, першы на Беларусі прачыніў дзверы ў так званы тэатр прадметаў, аб'ектаў. Дарэчы, якасці сучаснага артыста акумулююць і аб'ядноўваюць у сабе цэлы кірунак — тэатр аднаго акцёра.

У тэатры пачала працаваць творчая лабараторыя з удзелам усіх тэатраў рэспублікі. Дасць яна плён ці не, пакажа час, а наогул хвалюе становішча тэатра і артыста. Які ў іх шлях наперадзе? Ці знойдзецца якая падтрымка, каб працерабіць дарогу ў невядомае творчае заўтра?..

Я не ўспамінаю пра ўсіх артыстаў, якіх бы далучыў да акцёрскага залатога фонду; не ўспамінаю працаўнікоў усіх тэатральных службаў — яны жывуць тэатрам і шчыра слугуюць яму.

Агледзець 60 гадоў надта складана... І ўсё ж я хачу сказаць добрыя словы лялечнаму тэатру і людзям адной крыві нашай тэатральнай веры. Няхай яны жывуць доўга — тады буду жыць і я...

Уладзімір ГРАМОВІЧ,
заслужаны артыст Беларусі

МУЗЫКА

Пяць загадак С.П.Б.

Што ні кажыце, а кампазітар Бельцюкоў Сяргей Пятровіч — гэта суцэльная загадка. І нават тое, што апошнім часам ён куды часцей здымае цёмныя акуляры, не змяншае яго таямнічасці. Бо загадкай успрымаецца ўжо само ягонае

І М Я.

Гэта ж трэба так умудрыцца, каб яго абрэвіятура нагадвала і Беларускі саюз пісьменнікаў, і якое-небудзь Беларускае сумеснае прадпрыемства. А ў скарочаным выглядзе (С. Б.) станавілася "сваячкай" фестывалю "Славянскі базар", газеце "Советская Белоруссия" і нават лімаўцы Святлане Берасцень.

Але ж самае цікавае ў іншым. Бо, паводле такой колькасці супадзенняў, кампазітар мог бы ўсюды лічыцца "сваім" — нават "сярод чужых". Насамрэч жа ўсё зусім інакш: куды часцей ён бывае "чужым сярод сваіх", не знаходзячы паразумення нават сярод калег у Саюзе кампазітараў. І вінаватая ягоная

П Р А Д П Р Ы М А Л Ь Н А С Ц Ь.

Там, дзе многія аўтары выглядаюць бездапаможнымі дзецьмі, Сяргей Бельцюкоў пачувае сябе натуральна, без залішніх ваганняў паміж сціпласцю і творчай прапановай. Яшчэ на досвітку перабудовы, калі ўзнікла нечаканая магчымасць наўпростых кантактаў з замежжам, ён даслаў ноты трохвіліннай "Музыкі для габоя і магнітафоннай стужкі" на Міжнародны фестываль "Сусветныя дні музыкі" ў Осла. Тое, што твор прагучаў (прытым, што з усёй тэрыторыі былога Саюза былі адабраныя толькі два опусы — С. Бельцюкова і Г. Канчэлі), выклікала рэакцыю выбуху бомбы.

Другі раз "бомба выбухнула" падчас прэм'еры ягонай Першай сімфоніі "Гравюры", прысвечанай Францішку Скарыне. Гэтым творам, як мне падаецца, ён не толькі дасціпна і адкрыта прадэманстраваў моц свайго таленту, але і акрэсліў мяжу, за якой музычнасць ператвараецца ў

П А З А М У З Ы Ч Н А С Ц Ь.

Уласна кажучы, балансаванне паміж музычнымі і пазамузычнымі сродкамі развіцця заўсёды было ўласціва С. Бельцюкову, гэтаксама, як Я. А. Глебаву, у якога ён вучыўся кампазіцыі, — балансаванне паміж акадэмічнымі традыцыямі і эстрадным ухілам. Але ж калі ў Першай сімфоніі ўвесь прыцягальна чорны магнетызм касмічнай энергіі ўзводзіў на п'едэстал Музыку ў яе новым, санорна-экспрэсіўным асэнсаванні, дык многія іншыя творы, наадварот, вялі ад музыкі да "лекавай медытацыі" (электронныя кампазіцыі), аголенага камп'ютэрнага мыслення (сімфанічная карціна "Гефсіманія") і нават да перавагі літаратурнага тэксту — нібы ў літаратурна-

музычнай радыёкампазіцыі паводле нейкага рамана (араторыя "Светлае азарэнне").

Апошнія два прыклады займаюць у гэтым пераліку асобнае месца, бо яднаюць такія дзве несумяшчальныя, на першы погляд, рэчы, як пазамузычнасць і...

Д У Х О Ў Н А С Ц Ь.

У тым, вядома ж, сэнсе, як яе разумее С. Бельцюкоў. Бо, як ні дзіўна, усе яго самыя, здавалася б, духоўныя творы патыхаюць нейкім холадам. І "прычапіцца", як кажуць, няма да чаго: усё нібыта гожа, правільна, дакладна. Але ж не ўражваюць яны тым самым "светлым азарэннем", сапраўдным узлётам душы, калі робіцца балюча і соладка на сэрцы — так, як гэта было на прэм'еры яго "Сумнага прынашэння Моцарту" ці Канцэрта для габоя і камернага аркестра. Але ж кампазітар працягвае распрацоўваць менавіта гэтую галіну мастацтва — прычым амаль з дзіцячай упартасцю: чым больш яму даводзяць пра небяспечнасць "моды" на духоўную тэматыку, тым больш апантана ён піша такія творы. І, нарэшце, дасягае надзвычай узнёслай, узвышанай гармоніі ў невялічкім творы "Nenia" для двух сапрана і камернага аркестра. Парадокс?

Што ж да асабістага жыцця кампазітара, дык найбольшай загадкай у ім застаюцца не жанчыны, як гэта бывае часцей за ўсё, а

Д З Е Ц І.

Тым, што ў музыкантаў і дзеці вырастаюць музыкантамі, ужо нікога не здзівіш. Але ў Сяргея Бельцюкова, які многімі ўспрымаецца як сімвал жорсткага рацыяналізму і поўнай адсутнасці рамантычна-чалавечых памкненняў, іх — трое. І ўсе музыканты. Злыя языкі пляткараць: маўляў, спецыяльна гадуе, каб было каму выконваць бацькавы творы. І дадаюць з усмешачкай, што дзеці хутка пераўзыйдуць бацьку ў папулярнасці. Бо ўжо сёння флейтыстка Даша — лаўрэат міжнароднага конкурсу і дае ўласныя "сольнікі", якія збіраюць нават больш паклоннікаў, чым канцэрты ейнага бацькі.

Дарэчы, нядаўні аўтарскі вечар С. Бельцюкова ў Камернай зале на Залатой Горцы, прымеркаваны да 20-годдзя яго творчай дзейнасці, стаўся повяззю ўсіх гэтых загадак. У ім сапраўды было усё: і уменне кампазітара штогод упрыгожваць "Мінскую вясну" сваёй музыкай (вось яна, прадпрымальнасць — у лепшым сэнсе гэтага слова), і прэм'ера фрагментаў ужо згаданай араторыі "Светлае азарэнне" на тэксты Сяргея Іванова (у выкананні чытальніка В. Анісенкі, Камернага хору і аркестра "Sonorus" пад кіраўніцтвам А. Шута) і, вядома ж, саліруючая Даша. Амаль не было толькі калег-кампазітараў — як, між іншым, і на ўсіх аўтарскіх імпрэзах. Можа, іх не цікавяць таямніцы "чужой" творчасці? Ці яны ўжо іх разгадалі — у адрозненне ад мяне?..

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота К. ДРОБАВА

на-белы фільм Эйзенштэйна вытрымлівае любую канкурэнцыю".

І не толькі нямы. Адна з найцікавейшых гістарычных эпапеяў у савецкім кіно — гукавы фільм "Іван Грозны" (1944). Эйзенштэйн ізноў пад уплывам тэатра. Бо твары з рухавай мімікай, паказаныя буйным планам, нагадваюць маскі акцёраў антычнага тэатра: маска дабрыні хутка змяняецца маскай злосці. Якія закаханыя вочы ў Грознага (М. Чаркасаў), калі ён глядзіць на сваю жонку Анастасію (Л. Цалікоўская) і якія калючыя, звар'яцелыя, калі размаўляе з мітрапалітам Філіпам (А. Абрыкосаў). Як падымаюцца ражкі вуснаў Ефрасінні Старыцкай (С. Бірман) на сустрэчы з сынам (П. Кадачнікаў), і як яны апускаюцца, як наогул сціскаюцца ўсе зморшчынкі на яе твары, калі падсыпае атруту ў кубак царовай жонкі. З гісторыі вядома, што Іван Грозны вельмі любіў разгул ды скамароства. Захапленне цара відовішчамі Эйзенштэйн паказаў у другой серыі "Івана Грознага", потым забароненай Сталіным.

Паводле рэжысёра, ствараючы вобраз Грознага ён ішоў перш за ўсё за натхненнем і выкладаў усё так, як дыктавала менавіта яно (фільм, безумоўна, аўтарскі, а не ілюстрацыйны). Таму можна смела сказаць, што існуе эйзенштэйнаўскі Іван Грозны (тыран, якому цяжка ад сваіх злачынстваў). Думаю, без акцёра М. Чаркасава, які быў нібыта народжаны для гэтай ролі — высокі, хударлявы, з вострымі рысамі твару — непаўторнай маскі "Іван Грозны", можа, ніколі б не было. Ніколі б не было ў кіно, а вось на паперы... Фільм "Іван Грозны" Эйзенштэйн спачатку намаляваў. Цікава, што абрыс галавы Грознага, з доўгім чэрапам ды клінападобнай бародкай рэжысёр убачыў... у галінах дрэва "насупраць майго акна па вуліцы Кірава, 75, кв. 2". Фінал першай серыі "Івана Грознага" — супастаўленне буйнога (профіль Івана) і агульнага (чарада людзей) планаў, — Эйзенштэйн замаляваў 29 снежня 1942 года. Цудоўны кадр! Паводле доследу М. І. Андронікавай, яго вытокі — у векавой традыцыі сусветнай мастацкай культуры, у прыватнасці — японскай (Эйзенштэйн нават вывучаў японскую мову).

Аднак былі і фільмы, за якія Эйзенштэйн не атрымаў аніякіх прэмій. У канцы 30-х быў знішчаны "Бежын луг" (засталося некалькі фотаздымкаў). Засталася незавершанай і стужка аб Мексіцы. Толькі ўжо пасля смерці Эйзенштэйна яе нарэшце змантаваў А. Даўжэнка, а летась перарабіў на свой капыл расійскі рэжысёр А. Кавалаў (яго "Мексіканская фантазія" ды "С. Эйзенштэйн. Аўтабіяграфія" ў студзені дэманстраваліся ў Мінску). На жаль, ёсць карціны, якія наогул засталіся толькі ў марах (ды малюнках) рэжысёра: напрыклад, "Чорны консул" аб паўстанні на Гаіці, "Вялікі Ферганскі канал", "Шкляны дом"...

Чарадой ішлі людзі да цара Івана. Чарадой ішлі яны, каб пакланіцца мёртваму Вакулінчуку ў "Браняносцы "Пацёмкіне". Аднак з пачатку XX стагоддзя расейцы, і не адны яны, здымаюць капелюшы ўжо не толькі перад царамі і героямі. Таксама — і перад мастацтвам кіно. Прарок С. Эйзенштэйн быў у чарадзе мастакоў першым.

Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА

З Гданьска на вакацыі

Завітаў ненадоўга ў Мінск Яўген Паплаўскі, вядомы наш кампазітар, які праходзіць мастацкую стажыроўку ў Гданьскай акадэміі музыкі. Польскія калегі, якія добра ведаюць Яўгена паводле розных музычных імпрэзаў, паспрыялі таму, каб наш творца атрымаў магчымасць на працягу года наведваць "кухню" падрыхтоўкі польскіх кампазітараў, карыстацца бібліятэкай і багатымі нотнымі сховішчамі. Прычым, цалкам — за кошт гаспадароў. Жыве наш зямляк побач са стажорамі ды аспірантамі з Галандыі, Францыі, Японіі ў гожым будынку ля мора (курортны Сопат, Гдыня і Гданьск, можна сказаць, адно цэлае). Тут жа ёсць абсталяваныя для індывідуальных заняткаў класы. Ёсць магчымасць працаваць у бібліятэцы Польскай акадэміі навук. Вывучае партытуры сучасных кампазітараў, а заадно шукае што-небудзь цікавае для даследавання даўняй беларускай музычнай культуры.

А яшчэ Яўген Паплаўскі стараецца зрабіць штосьці плённае для развіцця творчых стасункаў паміж беларускімі ды польскімі музыкантамі. Раззнаёміўся з госцем сёлетняга з'езда нашых кампазітараў, віцэ-старшынёй Польшчы, лідэрам кракаўскіх творцаў і чыннікам Міжнароднага фэсту кампазітараў Кракава — Ежы Станкевічам. Аказалася, паходзіць ён з Віленшчыны, па лініі продкаў "мае сваяцтва" з Дуніным-Марцінкевічам; бацькі жылі ў Астравецкім раёне, цяпер — на Беласточчыне. І таму цікавасць да беларускай культуры ў пана Станкевіча шчырая.

Дык вось, намаганнямі Е. Станкевіча на сёлетнім фестывалі ў Кракаве (31.05. — 7. 06.) упершыню адбудзецца канцэрт беларускай музыкі. Запрошаны піяніст Алег Крымер, старшыня БСК Ігар Лучанок, музыказнаўца Радаслава Аладава, кампазітары Галіна Гарэлава, Яўген Паплаўскі. А падчас нашай традыцыйнай "Беларускай музычнай восені" мяркуецца наладзіць сустрэчу з польскімі музыкантамі: канцэрты, майстаркласы, лекцыі...

У маі Мінск чакае гданьскага арганіста Рамана Пяруцкага, які сярод іншага прапануе прэм'еру Я. Паплаўскага — "Пераламленне" для органа і чатырох ударных інструментаў.

Аматар незвычайных тэмбраў, кампазітар марыць у хуткім часе папоўніць сваё "ўлюбёнае сямейства" з кайракаў, бонгаў, том-томаў ды гуіры экзатычнымі галасамі ветраных кітайскіх сігнальных звонікаў, якія напаткаў у гданьскай краме. Магчыма, іхні "дэбют" адбудзецца ў чарговай партытуры. А працуе кампазітар зараз над глыбокай і захапляючай тэмай: Барбара Радзівіл, ейны ўнутраны свет, ейны лёс, ейнае атачэнне і эпоха... Праштудзіраваў "Уладара Вялікага Княства" Вітаўта Чаропкі, шэраг артыкулаў, польскіх кніжак. З'ездзіў у легендарны замак Мальбург, дзе ёсць музей і архіў. Чаго чакаць слухачам? У кожным разе, не гістарычнага сімфанічнага палатна. Хутчэй гэта будзе сімфонія жаночай душы і кахання пад імем "Барбара Радзівіл".

С. БЕРАСЦЕНЬ

ЛіМ ЧАСАПІС

Паэт, філосаф, перакладчык

ГЕНАДЗЮ БУБНАВУ — 50

Генадзь Фёдаравіч родам з вёскі Цяляткава Мсціслаўскага раёна, нарадзіўся 9 мая 1948 года ў сям'і калгасніка і настаўніцы. У 1966 годзе скончыў сярэднюю школу ў Мсціслаўлі, у 1972-м — факультэт журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава. Працаваў рэдактарам Галоўнай рэдакцыі прапаганды, а з 1974 года — старшым рэдактарам літаратурнай рэдакцыі Беларускага радыё. У 1975-1977 гадах — літаратурны супрацоўнік, у 1977-1984 гадах — рэдактар аддзела крытыкі і бібліяграфіі, а з 1984-га — намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Нёман".

Дэбютаваў у 1963 годзе. Аўтар кніг паэзіі "Связующая нить" (1975), "Ржаной полдень" (1978), зборніка балад і паэмы "Вещий камень" (1987), гісторыка-філасофскіх даследаванняў "Левый і правый, или Время умирать и время жить", "Красный жезл запрета, или Тот покой, который не ожидается" і іншых, апублікаваных у "Нёмане". Друкаваўся Т. Бубнаў у часопісах "Новый мир", "Юность", калектыўных зборніках. Яшчэ са студэнцкіх гадоў займаецца перакладамі на рускую мову. Пераклаў з беларускай мовы "Першую кнігу" І. Мележа, раманы-эсэ А. Лойкі "Янка Купала" (з І. Бурсавым) і "Скарына", што выйшлі ў Маскве ў серыі "Жыццё выдатных людзей", аповесць І. Шамякіна "Галіны і карані", паасобныя вершы Р. Барадуліна, А. Лойкі, А. Разанава, В. Зуёнка і іншых.

Віншуем Генадзя Фёдаравіча з поўднем веку! Зычым яму новых жыццёвых і творчых вышынь!

Фрагменты ўкраінскай культуры ў часопісе "Фрагменты"

На жаль шырокаму чытачу пакуль мала вядомы "галоўны" часопіс беларускіх інтэлектуалаў "Фрагменты", які друкуе філасофскія, культуралагічныя і літаратурныя тэксты як айчынных, так і замежных аўтараў. Часопіс выходзіць раз на квартал і толькі што ў продажы з'явіўся першы, веснавы, нумар за 1998 год. У пэўным сэнсе ён не зусім традыцыйны, бо пераважная большасць яго тэкстаў прысвечана дыялогу беларускіх і ўкраінскіх культур. Украінскую культуру на старонках "Фрагментаў" прэзентуюць артыкулы і даследаванні такіх, вядомых не толькі на Украіне, аўтараў, як М. Рабчук, Р. Кісь, Н. Белацэрківец, Н. Якавенка, Я. М'як, В. Панамароў, В. Саладоўнік, М. Стрых.

Беларускі бок у гэтым дыялозе прадстаўлены тэкстамі І. Бабкова, А. Анціпенкі, В. Акудовіча, В. Булгакава, Ан Дынь Ко, К. Невяроўскага. І нават эсэ вядомага польскага культуролага К. Чыжэўскага "Вяртанне Сярэдняй Еўропы", якое фармальна стаіць наўзбоч тэмы нумара, бадай, не разбурае яго, а толькі мацуе, бо ўключае праблему беларуска-ўкраінскага дыялога ў больш шырокі кантэкст, Сярэдняй Еўропы.

Для тых, хто зацікавіцца чарговым выпускам часопіса "Фрагменты", паведамляем, што яго можна набыць у кнігарнях "Цэнтральная", "Светач", "Беларусь" альбо замовіць па тэлефоне 256-36-13.

Юбілей сябра

Вядомы ўкраінскі пісьменнік Станіслаў Рап'ях, з аднолькавым поспехам працуе і як паэт, і як перакладчык. Нашай рэспубліцы Станіслаў Апанасавіч прысвяціў шэраг твораў, сярод якіх вершы "Гасцяванне", "Праменне"... Шмат займаецца перакладамі. Ён укладальнік, аўтар прадмовы і перакладаў асобных твораў А. Пысіна, што ўвайшлі ў кнігу А. Пысіна "Жураўліныя горны", якая пабачыла свет на ўкраінскай мове. Чынны ўдзел прыняў С. Рап'ях у падрыхтоўцы кнігі Н. Гілевіча "Выбранае". Да ўсяго пераўвасобіў па-ўкраінску асобныя творы М. Багдановіча, Я. Коласа, М. Танка, А. Грачанікава, С. Шушкевіча, Я. Янішчыц, В. Зуёнка, а таксама апавяданні Л. Гаўрылкіна, М. Даніленкі, Я. Каршукова і іншых. Хораша "загаварыў" С. Рап'ях і па-беларуску, у чым яму дапамаглі А. Пысін, Н. Гілевіч, І. Кірэйчык, А. Пісьмянкоў, В. Ярац...

З 60-годдзем, дарагі сябар! Плёну Вам у жыцці і творчасці цягам многіх гадоў!

ВІНШУЕМ!

"Хачу адкрыць такія скарбы..."

Васілю ІВАШЫНУ — 85

Радок, вынесены ў загаловак гэтай нататкі, узяты з верша Васіля Уладзіміравіча Івашына "Багацця мне так мала трэба...". Пра вершы шаноўнага юбіляра скажам крышку далей. Але пачаць хацелася б з гэтага верша і засяродзіць увагу на тым, што менавіта пошук духоўных скарбаў і шчырае, гуманістычнае імкненне "людзей пазбавіць гора, усіх іх шчасцем адарыць" было і сёння з'яўляецца вызначальным, дамінантным жыццёвым і творчым крэда гэтага яркага, неардынарнага чалавека — слыннага літаратуразнаўца, педагога, акадэміка НАН Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара, члена Саюза пісьменнікаў, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны.

З пошукаў і памнажэння духоўных скарбаў Васіль Уладзіміравіч распачынаў сваю працоўную дзейнасць, і гэты яго глыбокі інтарэс застаецца нязменным па сённяшні дзень. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова хоць бы пункцірам акінуць позіркам кола яго заняткаў. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут, аспірантуру пры Акадэміі навук БССР. Працаваў выкладчыкам у Віцебскім педвучылішчы, Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КПБ, старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам сектара ў Інстытуце літаратуры АН БССР, дырэктарам НДІ педагогікі Міністэрства асветы БССР, старшым навуковым супрацоўнікам-кансультантам, а з 1995 — галоўным навуковым супрацоўнікам Нацыянальнага інстытута адукацыі.

Нярэдка можна пачуць, што для кіраўніка пэўнай установы дастаткова і таго, каб быць добрым арганізатарам, а самому яму ў стваральным працэсе працы ўдзельнічаць нібыта неабавязкова. Пэўная доля ісціны ў такіх меркаваннях, відаць, ёсць, але В. Івашын уносіць тут сур'ёзную карэктыву. Займаючы (і часта працяглы час) кіруючыя пасады, ён надзвычай прадуктыўна ўмеў спалучаць адміністрацыйную працу з творчай.

В. Івашын апублікаваў звыш 250 прац, прысвечаных пытанням гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры, праблемам развіцця рэалізму, беларуска-рускіх, беларуска-ўкраінскіх узаемасувязей, метадалогіі і методыкі выкладання літаратуры ў школе. Сярод іх такія важкія і сур'ёзныя манаграфіі, як "Янка Купала: Творчасць 1905—1907 гг. і развіццё беларускай літаратуры", "М. Горкі і беларуская літаратура пачатку XX стагоддзя", "Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму", "Да вышынь рэалізму", "Выверанае жыццём" і інш.

Кожная з гэтых кніг заслугоўвае асобнай сур'ёзнай гаворкі. Большасць з іх вытрымала выпрабаванне часам. У святле новых ведаў, фактаў і пасвяжэлага палітычнага клімату нам прыадчыніліся і глыбей адкрыліся змястоўнасэнсавыя і эстэтычныя асаблівасці шэрагу мастацкіх твораў. Не пашкодзіла б належным чынам перачытаць і пераасэнсаваць і лепшыя набыткі айчыннай крытыкі і літаратуразнаўства. Тады б, напэўна, мы сталі больш ашчаднымі і беражлівымі да нашай духоўнай спадчыны і мастацкай традыцыі, без апоры на якія цяжка ды і немагчыма разлічваць на эфектыўныя творчыя пошукі і здабыткі. Ці не гэта самае падчас і з'яўляецца адной з істотных прычын, што збядняе і паслабляе тэндэнцыю наватарства ў літаратуры і нярэдка знижае ацэначную шкалу ў вызначэнні самой сутнасці навізны ў крытыцы і літаратуразнаўстве.

Вось тут, як нам уяўляецца, шмат карыснага маглі б сказаць і падказаць грунтоўныя навукова-тэарэтычныя кнігі В. Івашына. Нават у той з іх, якая на цяперашні час мае некалькі нязвычны, у пэўным сэнсе ідэалагізаваны загаловак "Ля вытокаў сацыялістычнага рэалізму", ставяцца і вырашаюцца фундаментальныя, сацыяльна-псіхалагічныя, маральна-этычныя і эстэтычныя праблемы, глыбока панарамна і поліфанічна асвятляецца літаратурнае жыццё Беларусі двух перадкастрычніцкіх дзесяцігоддзяў, а слова-эпітэт "сацыялістычны" калі зрэдчас і ўжываецца тут, то часцей выступае ў якасці вонкавай атрыбутыкі. Даследчыцкая думка В. Івашына і ў нялепшыя часы для мастацкага слова і навукі аб літаратуры імкнулася ўтрымліваць сябе на прыстойным узроўні грамадзянскай, маральна-этычнай сумленнасці і аб'ектыўнай навуковай заглыбленасці.

Таму зусім натуральным бачыцца актыўны і плённы творчы ўдзел В. Івашына ў адукацыйна-педагагічнай сферы жыцця краіны. На гэтай дзялянцы павінны працаваць, безумоўна, людзі з асабліва чуйным сэрцам, чыстым сумленнем і грунтоўным, універсальным патэнцыялам ведаў. Як чалавек і вучоны В. Івашын адпавядае і гэтым высокім патрабаванням. Досыць багатыя на свежую думку і канцэптуальную метадалагічную і метадычную ідэю з'яўляюцца працы, напісаныя ім у саўтарстве ("Вывучэнне рускай літаратуры ва ўзаемасувязі з беларускай", "Канцэпцыя рэфармавання літаратурнай адукацыі", "Урок літаратуры"). Чынны ўдзел прымаў В. Івашын у стварэнні падручнікаў па беларускай літаратуры для сярэдняй школы. Некаторыя з іх у добрым сэнсе слова можна назваць "доўгажыхарамі" на ніве народнай асветы. Так, падручнік для 8-га класа выпрымаў 19 выданняў, а падручнік для 8-га і 9-га класаў — 10 выданняў. Сёлета атрымалі падручнік па беларускай літаратуры (напісаны ў саўтарстве з М. Лазаруком) нашы дзесяцікласнікі.

В. Івашын — навуковы рэдактар многіх літаратуразнаўчых і метадычных даследаванняў, у тым ліку "Гісторыі беларускай савецкай літаратуры". Акрамя таго, ён аўтар зборніка вершаў "Слова", выхад у свет якога з'явіўся, паводле заўвагі У. Гніламёдава, нешта накшталт сенсацыі, бо В. Івашына мы доўгія гады ведалі як паслядоўнага, "закаранелага тэарэтыка літаратуры". Аднак спрактыкаваны крытык (ён жа і адзін з першых "дэгустатараў" паэзіі Івашына) дакладна заўважыў, што ў вонкавых адзнаках выпадковасці тут мела месца заканамернасць развіцця і выяўлення творчай індывідуальнасці асобы. На думку У. Гніламёдава, паэтычнае слова В. Івашына з'яўляецца адбіткам тонкай і гуманістычна-чуйнай душы, зацікаўленай дапоўніць і ўзбагаціць рацыянальнае эмацыянальным,спалучыць у адзін дыялагічны саюз алгебру і гармонію пазнання, паспрабаваўшы такім чынам дашукацца глыбінь "ісціны праз прыгажосць, маральную дасканаласць". На наш погляд, нельга не пагадзіцца і з такім меркаваннем крытыка: "Вершы яго (Івашына. — **В. Ж.**) празрыстыя і чыстыя, напоўненыя спакойнай, спелай мудрасцю, незалежна нават ад таго, пра што ён піша".

Васіль ЖУРАЎЛЁЎ

ЖЫВЕ І БУДЗЕ ЖЫЦЬ!

(Працяг. Пачатак на стар. 8—9)

— Здзівіў, нават збянтэжыў ты мяне, дружа!

— І пябе? — весела пасміхнуўся Войшалк, які за ўвесь вечар, лічы, толькі мачыў пітвом вусны.

— І мяне. Бацька твой будзе вельмі незадаволены і мной, і табою.

— Так, яму, гарачаму, будзе нялёгка выцерпець такое.

Сапраўды, гэтае "такое" было няпростае для Міндоўга: яно азначала для яго калі не дзяржаўную канчыну, дык сутон. Навагародак мацаваў яго, узвысіў, а цяпер адкідае ўбок. І на гэта згадзіліся лепшы сябра і сын. І, канешне ж, не будзе для яго суцяшэннем тое, што дзяржаўныя інтарэсы вышэй асабістых. Хто хоць крыху спазнаў вялікую ўладу, той адчуў і ненасытную прагу яе.

Неўзабаве Войшалк дадаў:

— Бацька ўжо споўніў сваю місію. Цяпер час новых ідэй, новых дзяржаўных мужоў.

— А я? — усміхнуўся Усяслаў. — Таксама ўжо не падыходжу для новага часу?

— Ты — іншае. Ты датуль будзеш не толькі патрэбен, але і незаменны, пакуль будзе жывая ідэя навагародскага баярства пра сваю волю і дзяржаву. Яно, баярства, цябе ўзвысіла, яно ж, калі што якое, то і рошыць твой, мой, бацькаў лёс.

— Малайчына! — не мог не прамовіць з захапленнем Усяслаў. — Расцеш, мудрэеш як дзяржаўны муж. Душой прадчуваю: якраз табе прыйдзецца дарабіць тое, чаго не змог зрабіць бацька.

— Цяпер і табе, і мне трэба назапасіць цярпенне. Няхай нейкі час Даніла павесялуе, а яго сынок-няўдачнік пакіруе ў нас ці, лепш сказаць, сваімі рукамі зробіць тое, што мы павінны рабіць, а я адыду ўбок. Буду на вачах у Данілы, але і ён з братам ды сынамі будзе пад маім назіркам!.. А крыху пазней... Войшалк затоена ўсміхнуўся, — мы з табой паглядзім, што і як рабіць са словам Божым ці мячом!..

— Абхітрыў ты старога ліса! — пахваліў свайго выхаванца Усяслаў. — Твой гэты нібы ахвотны палон — вельмі хітры ход! Прызнаюся, я нават адразу яго не зразумеў. Палічыў: ты захацеў усперагчы маіх дзяцей.

— І гэта падштурхнула мяне пайсці замест іх у закладнікі. Ты патрэбен Навагародку не бядотны, слабы і нясмелы, а спакойны і моцны! Дык і будзь такім!

— Дзякуй, дружа, — Усяслаў расчулена прыабняў свайго любімца. — Я шчаслівы і тым, што ёсць ты такі на свеце! Не, у нас!

— Князь Усяслаў і ты вінаватыя, што я якраз такі! Болей займаўся б мною бацька, дык я мог бы быць зусім іншым. Але цяпер табе, баярын, дзядзька-пястун любы, будзе найпяжэй.

— Чаму?

— Іменна табе прыйдзецца наша паражэнне ўвасобіць у перамогу! І, паўтарыўся, рукамі Данілавага сына! Адным словам, каб рыбу есці, трэба ў раку лезці! Так, настаўнік?

— Я ўжо не настаўнік табе, — зусім не засмуціўся, а парадаваўся Усяслаў. — Ты — ужо далёкавідушчы палітык і дзяржаўца. Я — усяго толькі ваявода. Вядзі, сынок, рэй далей! Жыве Навагародак!

— Жыве і будзе жыць! — прытуліўся да Усяслава Войшалк. — І дзеля гэтага не пашкадуем жывата свайго!

...Гэтую таемную размову маглі запісаць у навагародскім летапісе. Але паколькі мы яго сёння не ведаем, то пра тыя перамовы ёсць вось такі запіс [1]: "В лето 6763.[2] Потом же Воишелк створи мир с Данилом и выда дщерь Миндовгову за Шварна, сестру свою, и приде в Холм к Данилу, оставив княжение свое и восприем мниский чин; и вдасть Романови, сынови королеву, Новогордък от Миндовга и от себе Вослоним и Волковыеск, и все городы, а сам просися ити во Святую Гору[3]; и найде ему король путь у короля угорьского, и не може дойти Святое Горы и воротися в Болгарех".[4]

Войшалк цяпер жа, гэтай вясною, застаўся ў Холме, каб хутка падацца з яго ў Палонінскі манастыр нібы заўзята маліцца, пасціць, як просты манах длубацца на манастырскай гаспадарцы — карацей, быццам адлучыцца ад усіх зямных, у тым ліку і навагародска-літоўскіх варункаў, ад усяго таго, што яму можна ці трэба было рабіць як княжычу, яшчэ нядаўна Міндоўгаваму пасадніку на паўднёвых навагародскіх землях; Усяслаў таксама мусіў затрымацца ў Холме: Даніла зажадаў, каб менавіта ён не толькі паслаў у Навагародак ганца з весткай, да чаго тут дамовіліся і хто цяпер заўладзіць на Навагародскай зямлі, але і каб сам павёз Рамана ў сваю сталіцу на княжанне як васала двух гаспадароў, Данілы і Міндоўга.

Калі спала паводка і падсушэла зямля, пырснула маладая зелянота, выбраліся ў няблізкую дарогу, па шляху завярнуўшы ў Ваўкавыеск, дзе княжыч Раман пазнаёміўся з дачкой тутэйшага князя Глеба Агапай (Усяслаў павінен быў па Данілавым настойванні быць за свата); князя Глеба і яго жонку-княгіню, княжну Агапу з іхнімі сваякамі і з ваўкавыескім баярствам далучылі да сваёй світы і рушылі ў Навагародак, каб там неўзабаве пышна пашлюбаваць Рамана і Агапу пры ўсім навагародскім людзе, а пасля Рамана пасадзіць на княскі трон і мець за свайго "гаспадара-ўладара"...

---

[1] "Ипатьевской летописи". Там, хоць аўтары і перапісчыкі ўслаўлялі князя-караля Данілу і ўсяк ганьбілі навагародска-літоўска-яцвяжскіх уладароў, усё ж цікавыя звесткі пра ВКЛ.

[2] Па новым стылі 1255 г. Як і ў іншых выпадках, у летапісе тут дата адвольная.

[3] Войшалк хацеў (прыкідваўся, што жадаў?) трапіць у Грэцыю, у Афонінскі манастыр, каб там набраць манахаў для свайго будучага манастыра.

[4] У Балгарыі тады ішла вайна, з-за яе Войшалк не мог (ці не імкнуўся?) дайсці да Грэцыі.

АЛГАМОСКІ

Нашы прагнозы

НАДТА Ж СПАКУСЛІВЫМІ з'яўляюцца спробы зірнуць у будучыню. Бяздольныя хацелі б верыць, што яны пазбавяцца ад сваіх бедаў, багатыя — бачыць памножанымі свае набыткі, а цэлыя народы? Тым больш канкрэтна — беларусы? Спробу такую зрабіў Алесь Гібок-Гібкоўскі ў артыкуле "Куды ідзём мы... з Пятачком, або Некалькі шляхоў будучыні Беларусі" ("ЛіМ" ад 3 красавіка г.г.). Ён разглядае розныя варыянты магчымых пошукаў той будучыні для нашага народа — тут і нейкія перспектывы палітыкі сучаснага кіраўніцтва, і разважанні над ідэйнымі канцэпцыямі лідэраў БНФ ды і такіх людзей або грамадскіх сіл, якія ў перспектыве — і бліжэйшай, і далейшай — ніякага ўплыву на лёс Беларусі аказаць не здолеюць. Наогул жа я з уласнага вопыту і, магчыма, з вопыту можна зрабіць было б і з Гордзіевым вузлом). І што атрымаецца з такога саштукоўвання? Нас, аднак, пераконваюць: "Мы ж прыціснулі кавалак да кавалка, два кавалкі зусім шчыльна аб'ядналі". Ну і паспрабуйце такой прыцягай абгарнуць воз сена. А нам кажуць: "Мы ўжо ў саюзе жывём".

Можа, тыя, што так робяць, не разумеюць таго, што адбываецца? Яны ж з такім сур'ёзным выглядам усё гэта дэманструюць? І нават цалуюцца пры гэтым. Але мы ўжо не першы раз становімся сведкамі палітычных спектакляў на найвышэйшым узроўні. Згадаем, як у 1993 г. так упэўнена набліжалася аб'яднанне беларускіх і рускіх грашовых сістэм, закліканае нас ашчаслівіць. Усё ўжо было канчаткова ўзгоднена двума прэм'ерамі — Кебічам і Чарнамырдзіным. Шмат шуму было, у выніку чаго знаходзіліся людзі, якія змікіцілі, што ў сувязі з такім блізкім аб'яднаннем дзвюх нераўнацэнных грашовых сістэм нешта ўдасца нам, беларусам, падзарабіць. І калі ў каго-небудзь была замежная валюта, то выгадна было яе чым найхутчэй збыць, каб пасля аб'яднання купіць сабе значна большую колькасць долараў або марак. Такую магчымасць падказвалі і некаторыя газеты. Можна толькі сабе ўявіць, што рабілі людзі з асяроддзя Кебіча, якія загадзя ведалі, што тое так званае аб'яднанне — усяго толькі буйнамаштабная махлярская аперацыя, якая ажыццяўлялася на ўзроўні прэм'ераў. Адзін Бог ведае, колькі людзей такім хітрым чынам удалося абкебічыць.

А ўсё ж такі што нам свеціць? Справа саюза або аб'яднання — рэальная, ці гэта ўсяго толькі прывід, які мроіцца ў тумане? Мне чамусьці думаецца, што пакуль у прэзідэнцкім крэсле сядзіць Ельцын або калі б на змену яму прыйшоў нейкі Яўлінскі, то рэальны саюз не прадбачыцца, як бы з-за гэтага ні перажывалі адны і ні цешыліся іншыя. Аднак эра Ельцына канчаецца, ён здзейсніў антысавецкі пераварот, але па новых законах палітычнай гульні ён вымушаны будзе неўзабаве пакінуць свой трон у Крамлі. А яшчэ ў Расіі адбудуцца парламенцкія выбары. І як гэта ні дзіўна, але лёс Беларусі будзе вырашацца на чарговых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбарах у Расіі. Бо калі там да ўлады вернуцца камуністы, то на працягу вельмі кароткага часу Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка стане часткай і надзейнай апорай адноўленага (праўда, у вузейшых памерах) "саюза рэспублік свабодных", заняўшы там ганаровае месца. Пры гэтым я не надта здзівіўся б, калі б нашы ды і не толькі нашы стратэгі прыдумалі варыянт, пры якім беларускі прэзідэнт прыняў бы ўдзел у расійскіх прэзідэнцкіх выбарах. Улічваючы яго злаквентнасць, г. зн. красамоўства, ён мог бы значна апярэдзіць розных канкурэнтаў і дасягнуць таго, чаго не даў бы рады, напрыклад, Зюганаў. Калі б рускія камуністы знайшлі спосаб пазбавіцца розных персанальных амбіцый і зрабіць сваім лідэрам нашага прэзідэнта ды яшчэ падабралі яму штаб мудрых саветнікаў, то іх шанцы ў значнай меры выраслі б. У свой час палякі-каталікі бралі сабе ў каралі то нехрысця Уладзіслава Ягайлу, то француза Генрыха Валуа, то сяміградскага ваяводу Стэфана Баторыя, то прадстаўнікоў шведскай дынастыі Вазаў, то саксонскай дынастыі Ветынаў. На гэтую ж тэму вяліся гаворкі і з рускімі царамі, у тым ліку і з Іванам Грозным. То хіба ж больш складана рускім камуністам было б пазычыць сабе кіраўніка ў Беларусі? Але для рэальнага поспеху ўсё роўна трэба было б вельмі ж крытычна падысці да свайго палітычнага радаводу, а затым і паспавядацца перад народам.

А ўсё ж такі ці можа Бог дазволіць камуністам зноў вярнуцца да ўлады? Бо кажуць, што ўсякая ўлада ад Бога. Каб пашукаць адказ на пытанне, паспрабуем зірнуць па баках. Як бы гэта ні ўяўлялася нерэальным па самых розных прычынах, але ў суседняй Рэчыпаспалітай, небывала прававерны каталіцкі народ якое ніколі не грашыў празмернай любоўю да сацыялістычнай сістэмы, аднак у свабодных дэмакратычных выбарах неяк раней памяняў сваю родную "Салідарнасць" на колішніх камуністаў ды і прэзідэнтам абраў былога лідэра камуністаў Квасьнеўскага, адправіўшы ў адстаўку легендарнага, але неадукаванага і касалапага на язык Валэнсу. Ды і ў Літве ў свой час найбольш папулярным палітыкам аказаўся колішні кіраўнік камуністаў Бразаўскас. І прэзідэнтам выбралі яго, а не Ландсбергіса, найбольш непрымірымага праціўніка саветчыны і маскалёў. А народ літоўскі не такі ціхамірны, як беларускі, і абы-каму падпарадкоўвацца не захоча.

Калі браць наогул, то ў Расіі ўмовы для камуністаў павінны быць непараўнальна больш ласкавымі, чым у Польшчы або Літве. Нядаўна гаварылі па тэлебачанні з Масквы, што недзе там шахцёры аб'явілі галадоўку, бо ў красавіку гэтага года атрымалі зарплату толькі за май мінулага года. Што-што, а ўжо своечасовую выплату зарплаты камуністы могуць гарантаваць. А чаго варта ўся гісторыя з Чачнёй? Ды згадаем яшчэ такую небывала важную дзяржаўную праблему, як справа пахавання апошняга цара. Колькі тут было праяўлена клопату на найвышэйшым дзяржаўным узроўні, колькі мерапрыемстваў ажыццявілася, як плённа і самаахвярна працуюць урадавыя камісіі! Дзе тут будзеш думаць пра нейкую там своечасовую зарплату, калі тут такія важныя справы нахлынулі!

А калі быць шчырым, то вось дзе камуністам можна было б паказаць сваю вынаходлівасць і прынцыповасць. Яны чамусьці прапускаюць "пенкную аказію" дамагацца найбольш урачыстага абвяшчэння цара Мікалая II святым-найсвяцейшым усёй зямлі Беларускай — і гэта за небывалыя заслугі перад справай сацыялізму і перад нацыянальна-вызваленчым рухам. Бо хіба ж хто-небудзь дасць рады аспрэчваць, што калі б ён не ўцягнуў Расію ў першую сусветную вайну, то ці адбылася б Лютаўская рэвалюцыя, а ўслед за ёю і Кастрычніцкая? І ці вызваліліся б канчаткова Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Літва і, вядома, Польшча? І ці нарадзілася б савецкая ўлада на шостай частцы планеты? Колькі помнікаў за ўсё гэта трэба было б паставіць! Але чамусьці дзяржаўныя камісіі, губернатары ды і камуністы маўчаць пра гэтыя заслугі. Дык дзе ж тут справядлівасць?

Калі ўжо гаварыць сур'ёзна, то ў камуністаў рэальных шанцаў не будзе, пакуль яны дакладна не прааналізуюць і не пакажуць грамадству тыя прычыны, якія прывялі да краху іх сістэму. Бо калі б яны праявілі мужнасць і асудзілі ўсе злачынствы бальшавіцкага кіраўніцтва (прыкладам тут мог бы паслужыць XX з'езд КПСС), то маглі б змяніцца адносіны да іх і творчай інтэлігенцыі і тэлебачання, і радыё, і наогул грамадскасці. Тут трэба было б зрабіць шмат балючых прызнанняў і пра калектывізацыю, і пра лагеры здзеку і смерці, і пра тое, якой цаной на працягу ўсіх гадоў рыўся дол для капіталу ды і як прыціскаліся найэлементарнейшыя правы грамадзян у паўсядзённым жыцці.

Для чаго нашай былой краіне трэба было выкідваць штогод многія мільярды долараў на вецер? Ідэя сусветнага бальшавіцкага панавання з'явілася адной з прычын краху сацыялістычнай сістэмы. Бо велізарнейшыя рэсурсы шостай часткі ішлі не на павышэнне дабрабыту народа, а на розныя авантуры ў Азіі, Афрыцы, Лацінскай Амерыцы ды на ваенныя базы ў Еўропе, а потым на вайну ў Афганістане. Між тым нашы гора-палітыкі яшчэ і сёння ўяўляюць, быццам там савецкія салдаты выконвалі свой інтэрнацыянальны доўг і таму называюцца воінамі-інтэрнацыяналістамі. Вось якое абсурднае ўяўленне ўкаранілася ў мазгі некаторых дзеячаў.

Як бы там ні было, але за гістарычным парогам аказалася тая дактрына, ад якой так лёгка пазбавіліся ды адхрысціліся некаторыя колішнія правадыры нашага роднага пралетарыяту накшталт Якаўлева, Шэварднадзе, Аліева або галоўнага чырвонаармейскага палітрука Валкагонава. А чаго вартымі без улады аказаліся такія колішнія лідэры, як Лігачоў, Рыжкоў, Лук'янаў? А ці ачысціўся Зюганаў ад усіх тых хвароб, якія пагубілі сацыялістычную сістэму? Не будзем забываць, што ў XIX і пачатку XX ст. іменна з сацыялізмам нашы продкі звязвалі свае светлыя надзеі на выратаванне чалавецтва, на ўсталяванне найбольш справядлівага грамадскага сацыяльнага ладу. Ды і савецкі лад шмат чаго даў людзям: права на працу і адпачынак, права на адукацыю і ахову здароўя, на танны праезд у гарадскім транспарце, на танную кніжку... Ды хіба ж можна ўсё пералічыць?

А чаго можна чакаць ад БНФ? Калісьці можна было чакаць ад аб'яднання сур'ёзных здзяйсненняў. Аднак лідэр фронту неаднаразова бліскуча даказваў, што ён зусім не разумее беларускіх рэалій — перш за ўсё ўплыву рускіх культурных і моўных традыцый, прытым не толькі ў асяроддзі людзей, якія прыбылі сюды з усходу і тут знайшлі сабе надзейнае прыстанішча і найбольш спрыяльную ва ўсіх адносінах атмасферу. Але і ў асяроддзі карэнных жыхароў зямлі, многіх "тутэйшых". Вядома, беларус сёння мог бы паўтарыць ясенінскае "в своей стране я словно иностранец". Аднак любыя спробы супрацьпастаўляць гэтаму становішчу адкрытую русафобію, нянавісць да ўсяго рускага могуць мець толькі сумныя вынікі і закончыцца безнадзейным правалам. Тут не Эстонія і не Латвія, і рускія тут адчуваюць сябе лепш, чым беларусы ў Расіі. Бо і беларусы ў Расіі, і рускія ў Беларусі аднолькава карыстаюцца рускай мовай. Іншай мовы і наш прэзідэнт не прызнае, адкрыта, усенародна парушаючы законы аб роўных правах дзвюх дзяржаўных моў. А па прыкладзе прэзідэнта і ўсё кіраўніцтва дзяржавы. Ствараецца ўражанне, што камусьці законы не пісаны.

Наогул жа калі разглядаць нашу будучыню, то трэба мець на ўвазе не толькі магчымыя варыянты палітычнага жыцця, але таксама і моўную сітуацыю і справу развіцця нацыянальнай культуры. Бо на нашым хітрым свеце ўсё ўзаемазвязана і ўзаемаабумоўлена.

Уладзімір КАЗБЯРУК

УГОДКІ

Бярозка на літаратурным узлессі

ЛЕАНІДУ ЯКУБОВІЧУ СПОЎНІЛАСЯ Б 50...

Паэт і салігорскі шахцёр Леанід Якубовіч тым ранкам 1970 года, як заўсёды, спяшаўся на работу. Першая змена, у якой ён працаваў, пачыналася ў шэсць гадзін раніцы. У шахту спускаўся адзін. І тут здарылася непрадбачанае — трос абарваўся. 8 чэрвеня 1970 года стала апошнім днём жыцця дваццацідвухгадовага юнака.

Нараджаемся не для смерці,
Нараджаемся мы, каб жыць,
Ды страла нацэлена ў сэрца,
Праз вякі ўжо страла ляціць.

Кніжка Л. Якубовіча — пажыццёвая і адзіная — "Я з вамі, вёсны...", рупна складзеная сябрамі паэта, у выдавецтве "Юнацтва" выйшла ў 1979 годзе. Гэта яго вершы і вершы прысвечаныя яму, гэта — успаміны пра яго... Са старонак зборніка Л. Якубовіч паўстае летуценна-засяроджаным юнаком, які спяшаўся жыць (і хацеў, зразумела, жыць), які пісаў вершы і любіў паэзію. Асобныя з іх, канечне, падаюцца ў чымсьці дэкларацыйнымі, у некаторых няма той адшліфаванасці радка, што прыходзіць з гадамі. Але яны — часцінка нашай паэзіі, паэзіі канца 60-х гадоў. Іншыя, з кім Л. Якубовіч пачынаў, пайшлі далёка наперад, ён жа назаўсёды застаўся ў "сваіх вёснах".

Леаніду Якубовічу больш удаваліся радкі пяшчотна-пранікнёныя, сонечна-прасветленыя, бо ён быў лірыкам па складзе характару і таленту. Запамінаюцца тыя вобразы, што народжаны нязмушана, быццам падгледжаны ў самім жыцці. Як у вершы "Бліскавіцы грознай навальніцы...":

Травы захлынаюцца ад росаў —
Помачы няма адкуль чакаць,
Ці то дождж, ці то дзяўчыны косы, —
Сцежкі пад нагамі не відаць.

Традыцыйнасць матываў не адмаўляла свежасці паэтычнага ўспрымання рэчаіснасці, калі аўтар умеў быць назіральным, дапытлівым і адначасова крыху па-дзіцячы наіўным. Наіўным у добрым сэнсе слова — значыць, больш адкрытым, непасрэдным, а тым часам і даверлівым. Як у гэтым вершы:

Ну і раніца — уся з'інелая!
Па калені загрузла ў снег
І застыла снягуркаю белаю
У чароўным і дзіўным сне.

. . . . . .

Спі ж, снягурка — белая раніца,
У цяпле маладых снягоў...
Мне так хораша, добра марыцца
На руках тваіх дзіўных сноў.

У кніжцы "Я з вамі, вёсны..." — партрэт паэта. Летуценна-засяроджаны. Але чым больш узіраешся, тым больш заўважаеш у гэтай летуценнай засяроджанасці нейкую не надта прыхаваную павалоку тугі. Быццам чуеш голас самога Л. Якубовіча: "Я з вамі, вёсны, вам я свой!"

Яго паэзіі доўга квітнець маладзенькай бярозкай на літаратурным узлессі.

А. М.

Даследаваў і наш фальклор

Аляксей Грузінскі, з дня нараджэння якога споўнілася 140 гадоў (памёр 22 студзеня 1930 года), найбольш вядомы як рускі літаратуразнаўца. Аднак пачаткам яго навуковай дзейнасці стала даследаванне этнаграфічнай творчасці. Вывучаў Аляксей Яўгенавіч і беларускі фальклор, этнаграфію. Прынамсі, у артыкуле "З этнаграфічных назіранняў у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні" (1891) расказваў пра побыт сляпых старцаў-жабракоў з Лоеўшчыны, якія жылі за кошт таго, што выконвалі духоўныя вершы і псалмы ў суправаджэнні колавай ліры, ператварыўшы гэты занятак у прафесійны. У артыкуле багаты пазнавальны матэрыял. Паведамляецца пра рэпертуар спевакоў, апісваецца сама ліра, звяртаецца ўвага на адметнасць яе канструкцыі. Цікавы і артыкул А. Грузінскага "Духоўныя вершы. Мінская губерня, Рэчыцкі павет" (1898), у якім падрабязна гаворыцца пра асаблівасці гэтага жанру вусна-паэтычнай творчасці. А ў 1901 годзе А. Грузінскі апублікаваў артыкул "П. В. Шэйн", расказаўшы пра вядомага беларускага этнографа і фалькларыста.

У імя беларускасці

У Глыбокім... глыбока закраналіся праблемы развіцця сучаснай беларускай літаратуры, творчасці асобных пісьменнікаў. А адбывалася гэта ў мясцовай сярэдняй школе N 3. Яно і не дзіўна, што гаворка прайшла так шчыра, зацікаўлена і адразу была скіравана на адраджэнскі лад. Дырэктар школы, а ў ёй, дарэчы, навучаецца 1500 вучняў, Віталь Гарановіч — сам паэт, нядаўна прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў, вельмі шмат робіць у імя беларускасці. А да ўсяго на сустрэчу былі запрошаны вядомыя пісьменнікі — Генрых Далідовіч і Мікола Мятліцкі, а таксама мясцовыя літаратары Алесь Жыгуноў, Тамаш Ляшонак, Уладзімір Сауліч, чыя творчасць вядома за межамі Глыбокага.

Н. К.

Золата — пароўну!

У красавіку ў Беларускі універсітэт культуры прыйшла хвалюючая і радасная вестка ад прэзідэнта Беларускага фонду па аказанні дапамогі спартсменам-інвалідам, заслужанага трэнера Рэспублікі Беларусь В. Каламійца. Упершыню ў гісторыі спартыўных танцаў на інвалідных калясках і чэмпіянату свету, які праходзіў 27 лютага 1998 г. у Японіі, чэмпіёнамі свету сталі студэнтка IV курса Беларускага універсітэта культуры Вольга Цяцёркіна і інвалід I групы Барыс Бачкоўскі. У працяг поспеху — залатыя медалі заваявалі на кубку свету (12 красавіка 1998 г.) па спартыўных танцах на інвалідных калясках у Галандыі студэнт III курса Беларускага універсітэта культуры Раман Красько і студэнтка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка інвалід I групы Ганна Жукава.

Л. ДОЎНАР

Быць новаму прыходу

У сталіцы ствараецца новы царкоўны прыход, дзе рабочымі будуць мовы царкоўнаславянская і беларуская. Дзеля гэтага ў Мінскім епархіяльным упраўленні пры старшынстве Мітрапаліта Філарэта адбыўся ўстаноўчы сход. У ім удзельнічалі як актывісты Брацтва трох віленскіх мучанікаў, так і праваслаўная моладзь. Стаць прыхаджанамі новага прыходу пажадала звыш сарака чалавек (дарэчы, згодна правілу, хапіла 6 і 10 заяў); сярод іх — урачы, архітэктары, будаўнікі, пісьменнікі, мастакі, студэнты. На сходзе выбраны савет і яго старшыня. Абмяркоўвалася месца будучай царквы Усіх Святых зямлі беларускай, хаця галоўнае слова ў гэтым пытанні, безумоўна, належыць гарадскім уладам.

У хуткім часе, пасля афіцыйнага дазволу на ўзвядзенне храма, паўстане праблема фінансавых сродкаў. Крыніцай фінансавання могуць стаць дзяржаўныя і недзяржаўныя прадпрыемствы, дабрачынныя фонды, фізічныя асобы. Укласці грошы ў царкву — справа, вядома ж, высакародная...

Г. З.

XII З'ЕЗД САЮЗА БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Мастак служыць праўдзе і ісціне

(Працяг. Пачатак на стар. 5—7)

творчых, юбілейных, мемарыяльных... І што — хіба ўсё гэта пад корань? Ці не таму богу Дом літаратара маліўся?.. Ды толькі згаданыя імёны класікаў нашай літаратуры сведчаць і заклікаюць: Дом літаратара павінен жыць і дзейнічаць!

Напэўна ж, усе мы ўсведамляем, што і сённяшняе, і будучае літаратуры вызначаецца і здзяйсняецца не ў гэтых сценах, а ў сэрцах і думах мастака, творыцца за рабочым сталом. І дзякаваць богу, творчы настрой не здраджваў, здаецца, нашым пісьменнікам. А самае важнае — нягледзячы на ўсе нягоды і перашкоды, на заклікі некаторых гарачых галоў — "зруйнаваць стэрэатыпы" — заставаліся вернымі прыродзе свайго таленту, сваёй творчай асабістасці.

Захаваць непаўторнасць свайго творчага аблічча пад шалёным націскам абставін, не ператварыцца ў літфлюгер, а ўгрунтоўваць заваяваныя пазіцыі, каб рухацца далей, — гэта добрая прыкмета любой сур'ёзнай літаратуры, у тым ліку і нашай, беларускай. Яна знае сабе цану, і ёй няма патрэбы шарахацца — куды кан'юнктурны вецер павее.

На зломе часу застацца самім сабой — гэта таксама творчая перамога.

Трагічныя пласты, характары і сітуацыі па-ранейшаму з аналітычнай глыбінёй і вастрынёй адкрывае Васіль Быкаў — асабліва ў нядаўна наглуха закрытых куточках нашай гісторыі. Не перастае радаваць прамянямі сваіх лірычных мініяцюр — мудрых і жыццёва дасціпных — Янка Брыль. Дарэчы, ён тут не толькі самасцвердзіўся, але — мы сведкі гэтага — з'явіўся ў сучасным літаратурным руху неаспрэчным родапачынальнікам. Увачавідкі ствараецца літаратурная школа, а разам з ёй — літаратурны жанр. Паглядзіце, як дружна ідуць ў друк з творамі гэтага кшталту Леанід Галубовіч і Вячаслаў Адамчык, Лідзія Арабей і Алесь Пісьмянкоў, Уладзімір Ліпскі — і вось зусім нядаўна падаў голас Мікола Гіль... Гэты метад спавядальнага роздуму вывеў Віктара Казько на прасторы аповесці — "Да сустрэчы..."; у тым жа шэрагу і "Сны пра маму..." Алеся Жука, і гістарычныя эсэ Уладзіміра Арлова...

Служыць тэме злабадзённай, як бы працуючы па "хуткай дапамозе" Іван Шамякін. Іван Навуменка, побач з прозай, не здраджвае сваёй другой музе: даследаванні жыцця і творчасці Купалы і Коласа маюць працяг — творчыя партрэты Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі... Застаецца майстрам важкай і па-мастацку дакладнай дэталі Іван Пташнікаў, — прыгадаем яго "чарнобыльскіх" "Ільвоў"... Бытавая шматфарбнасць зайздросна вылучае апавяданні Анатоля Кудраўца, — і вось толькі што: "Баёк" у "Полымі"...

Тое ж самае і ў паэзіі: Ніл Гілевіч — гэта грамадзянскі боль, палымянасць; Анатоль Вярцінскі — асацыятыўныя, роднасныя афарыстыцы, паралелі; Алесь Разанаў — заглыбленыя формулы быцця, схільныя іншы раз да філасофскага шыфру...

Яшчэ адна сімптаматычная тэндэнцыя: да чытача прыходзяць не наспех скіданыя зборнікі, а цэласныя, прасякнутыя адзінствам задумы, кнігі: "Евангелле ад Мамы" Рыгора Барадуліна, "Прошча" Уладзіміра Някляева, "Бабчын" Міколы Мятліцкага, "Хаос" Георгія Марчука, кніга апавяданняў пра жаночую долю-нядолю Генрыха Далідовіча; і як тут не ўспомніць першапраходцу з нашага пакалення, які таленавіта выходзіў да такой кнігі і ў паэзіі, і потым у прозе, — Янку Сіпакова...

У адной са сваіх новых мініяцюр Янка Брыль заўважыў: "Ад кожнага літаратурнага пакалення патрабуецца новае, — і дадаў: — за любую цану"... Заўважце: "За любую цану" — г. зн. гранічным намаганнем духоўных, творчых чалавечых сіл, а не "Любой цаной" — што значыць: усе сродкі добрыя...

Не першы раз ужо назначалася цана: адмаўленне папярэднікаў. Спакусіўся гэтай "цаною" і Сяргей Дубавец ("Руковы туман" у "ЛіМе"). Таленавіты крытык, публіцыст, а вось жа так беспадстаўна заносіць яго...

Імкненне ўзвесці ў "закон пастаянства", "замацаванага" на генетычным узроўні, метаду "сацыялістычнага рэалізму" сапраўды нагадвае ў сваёй аснове часы "лысенкаўшчыны". Розніца толькі ў тым, што Лысенка,

Алесь Разанаў і Аляксандр Станюта.

Фота А. ПРУПАСА

змагаючыся з класічнай генетыкай, адмаўляў генны механізм захавання і перадачы спадчыннасці: толькі знешнія ўмовы існавання, сцвярджаў ён, ствараюць новы від і замацоўваюць яго спадчынна, — а Сяргей Дубавец ужо з пазіцый генетыкі даводзіць, што метад "сацыялістычнага рэалізму" замацаваўся ў нашых літаратараў (маецца на ўвазе старэйшае пакаленне) на генным узроўні — і тым самым лічыць яго, ну, скажам так, прапашчым і акамянелым... Такая вось "літаратуразнаўчая" "лысенкаўшчына наадварот", ці бальшавізм у літперабудове... Спроба вырваць літаратуру з гістарычнага кантэксту, антыгістарызм... А да таго ж яшчэ — і таптанне на магілах... Пад адмоўным знакам — Куляшоў, Танк, Панчанка... Паставім шматкроп'е і працытуем: "Панчанка як паэтычны характар надзвычай гарманічны і цэльны... здаўна і надоўга яго цікавяць "ісціны простыя, як хлеб, і праўдзівыя, як плач дзіцяці"... Балявы парог паэтычнай натуры Пімена Панчанкі надзвычай нізкі, а ягоная здольнасць да суперажывання ўсяму сапраўды чалавечаму зайздросна абвостраная нават як для паэта"...

Вы, канешне, не падумалі, што гэтыя словы належаць Дубаўцу? І правільна зрабілі. Гэтак сказаў пра Панчанку Васіль Быкаў... А Васіль Уладзіміравіч, па нашай агульнай згодзе з Дубаўцом, не ў "руковым тумане", ён ведае, што гаворыць...

Я так падрабязна мушу спыняцца на гэтай, здавалася б, прыватнай, публікацыі, бо гэта момант не прыватны, гэта прапаноўваецца тэндэнцыя ацэнкі нашай спадчыны. І тут па-бальшавіцку размахваць шабляй не выпадае...

Адмаўленне папярэднікаў — не лепшы спосаб, а скажам так: бесперспектыўны — сцвердзіцца ў літаратуры. Шлях тут адзін — і беспамылковы: асабістая творчасць кожнага. Назаву, не для прыкладу, а "назидания ради" двух-трох самых непрыкметных (у сэнсе паставы і мітуслівасці): Юрась Свірка, Віктар Гардзей, (пачытайце яго томік выбранага "Зялёныя дажджы"), Мар'ян Дукса, Фелікс Баторын, Андрэй Федарэнка, Алесь Чобат... Нават Анатоль Сыс знаходзіць у іншых — паэтаў-сучаснікаў — анталагічныя вершы для "Звязды", дзе вядзе адпаведную рубрыку...

Я мог бы больш дэталёва спыніцца на аналізе творчасці толькі што згаданых сяброў, але абмяжуюся адно чытацкім сцвярджэннем — па іх апошніх публікацыях. Гэтак жа як і акрэсленнем, што названыя зараз і раней імёны, напэўна ж, не вычэрпваюць увесь спектр творчых індывідуальнасцей — проста яны найбольш скандэнсавана выяўляюць пэўную тэндэнцыю.

Гавару гэта з перакананнем, што ў кожнага, каму бог шапнуў узяцца за пяро, ёсць свая залацінка — хай сабе верш, апавяданне, — а гэта ўжо так нямала. Лічы, пяцьсот пегасаў, — і кожны са сваім норавам... Няхай не ўсе аднолькава высока ўзлятаюць, але нораў ёсць!..

Мне хацелася толькі падкрэсліць: кожны мае плён, хто не здраджвае прыродзе свайго таленту — без усякай "генетычнай" закамплексаванасці.

І ўцешна, што такімі вольнымі, не зашоранымі, адкрытымі жыццю ідуць у літаратуру самыя маладыя, зусім юныя, якія гуртуюцца, напрыклад, пад крылом "Першацвету" і Алеся Масарэнкі...

Ні адна літаратура не можа паўнакроўна развівацца ў ізаляваным стане. Творчыя кантакты патрэбны мастаку, як паветра. Прасцей было, калі нашы ўзаемасувязі ішлі ў гатовым рэчышчы дзяржаўных структур. Быў СССР, быў Саюз пісьменнікаў СССР, — сістэма была адладжаная...

Цяпер трэба як бы ўзнаўляць, у новых умовах усталёўваць спосабы і шляхі творчага супрацоўніцтва. Справа нялёгкая — і перш за ўсё з-за фінансавых праблем.

Што найперш вызначае літаратурныя ўзаемасувязі? Гэта — узаемапераклады і ўзаемавыданні. Тут якраз усё, ці амаль усё, і затармазілася. Падпісваюцца пагадненні ці пратаколы аб намерах па супрацоўніцтве, а далей справа не ідзе.

Гэта ў поўнай меры тычыцца і нашых дзелавых кантактаў з расійскімі літаратурнымі коламі. Былі такія прапановы — і неаднойчы: фінансуйце пэўнае выданне, а мы будзем перакладаць і выдаваць... Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што ў Маскве не адзін Саюз, а некалькі — галоўныя два: Саюз пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі і Саюз расійскіх пісьменнікаў. І кожны адразу крыўдуе, калі ўступаеш у кантакты з саюзам альтэрнатыўным. А гэта тут жа адгукаецца цэнтрабежнымі тэндэнцыямі ў нашай арганізацыі. І таму нам неаднаразова даводзілася тлумачыць: мы адкрытыя для творчага супрацоўніцтва з усімі, — тым больш што і ў адным расійскім саюзе і ў другім ёсць нашы сябры, перакладчыкі, вядомыя пісьменнікі.

Гэта ж тычыцца і міжнародных пісьменніцкіх аб'яднанняў на абсягах былога СССР. На апошнім, ліквідацыйным, будзем так называць, пісьменніцкім з'ездзе, ужо ва ўмовах СНД, перад нашым, беларускім, Саюзам пісьменнікаў, як і перад іншымі былымі рэспубліканскімі Саюзамі, стаяла пытанне аб уступленні ў Международное **Сообщество** писательских Союзов, — назву дадзім па-руску для дакладнасці, бо к гэтаму часу ўжо было ўтворана Международное **Содружество** союзов писателей, — яно таксама заклікала пад свае штандары. Наша дэлегацыя прыняла тады рашэнне ўстрымацца ад арганізацыйнага ўваходжання ў Сообщество (як і ў Содружество таксама), каб вырашыць гэтае пытанне, параіўшыся ў сваім творчым калектыве. Як помніце, наш агульны пісьменніцкі сход падтрымаў пазіцыю дэлегацыі — з той жа самай насцярогай ад расколу нашага Саюза і з гатоўнасцю творча супрацоўнічаць з літаратурнымі

арганізацыямі, як у Расіі, так і ў іншых краінах блізкага і далёкага замежжа. Быў бы плён, апроч агульных дэкларацый... Адпаведныя дамовы заключаны ў нас з Саюзамі пісьменнікаў Польшчы, Балгарыі, Латвіі, Літвы, зусім нядаўна — з Саюзам пісьменнікаў Расіі (з боку апошняга была прапанова "обсудить возможность создания единого Союза писателей России и Белоруссии" — праўда, няясна было: хто ў чый саюз уступаць будзе; сышліся на дамоўленасці аб творчым супрацоўніцтве).

Двухбаковыя кантакты апошняга часу даюць першыя абнадзейваючыя парасткі. Так, нашы балгарскія сябры прысвяцілі цалкам нумар альманаха "Панарама" беларускай літаратуры, а ў адказ наш часопіс "Полымя" даў добрую творчую панараму сучаснай балгарскай літаратуры. Адбыліся дні беларускай літаратуры ў Балгарыі і дні балгарскай — у нас, у Беларусі. Балгарскімі сябрамі рыхтуецца анталогія беларускай паэзіі. Тут трэба добрае слова ўдзячнасці за падтрымку сказаць Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму паслу Рэспублікі Беларусь у Балгарыі Аляксандру Міхайлавічу Герасіменку, а таксама беларускаму Таварыству дружбы з замежнымі краінамі. Наогул, у Саюза пісьменнікаў Беларусі з Таварыствам наладзіліся вельмі добрыя кантакты, праводзяцца сумесныя літаратурныя вечары, сустрэчы, прэзентацыі кніг. У актыве Таварыства нямала нашых пісьменнікаў — Васіль Быкаў, Анатоль Вярцінскі, Раіса Баравікова, Сяргей Панізнік і многія іншыя. Таму і супрацоўніцтва плённае.

Добрыя весткі ёсць і з кнігавыдавецкай нівы. У Германіі, Польшчы, Балгарыі чытачы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з новымі творамі Алеся Разанава, Святланы Алексіевіч, Галіны Тварановіч, Сяргея Законнікава. Літоўскія сябры выдалі "Крыж міласэрнасці" Валянціны Коўтун, — прэзентацыя кнігі адбылася ў Вільні і Мінску, з удзелам як літоўскіх, так і беларускіх пісьменнікаў. У перакладзе на сербскую мову стараннямі Івана Чароты выдадзена анталогія беларускай паэзіі. Сяргей Законнікаў атрымаў Міжнародную літаратурную прэмію ў Польшчы і ў Украіне — прэмію Р. Скаварады — за паэтычную і перакладчыцкую працу.

Даўняе наша непаразуменне — арганізацыйнае вызначэнне Літаратурнага фонду. Калісьці гэта было Беларускае аддзяленне Літфонду СССР. Тады было цэнтралізаванае фінансавае жыўленне: на пуцёўкі, дамы творчасці, на кватэры, — а сродкі складаліся ў асноўным з размеркаваных прыбыткаў выдавецтва "Советский писатель", "Литературной газеты", плюс (калі мець на ўвазе Беларускае аддзяленне) адлічэнні рэспубліканскіх выдавецтваў ад выдання кніг мастацкай літаратуры. Пасля, па вядомых усім прычынах, на самастойнае, незалежнае гаспадарчае існаванне перайшла "Литгазета", гэтак жа — і "Советский писатель" — з новым пашпартам на імя "Современный писатель" (гэта ён слаў пісьмы у рэспубліку: плаціце грошы — а мы выдаваць будзем...); беларускія выдавецтвы на падставе законаў аб прадпрыемствах і падатках, заявілі: мы плацім дзяржаўны падатак, і якія яшчэ незразумелыя "працэнты" павінны адлічваць нейкаму "Літфонду"?.. Так былы пісьменніцкі забеспячэнец і апякун сам застаўся без граша ў кішэні... У гэтым незайздросным становішчы ён знаходзіцца і сёння.

Фактычна асноўныя функцыі матэрыяльнай дапамогі пісьменнікам і іх сем'ям апошнім часам узяў на сябе Саюз пісьменнікаў.

Сродкі выкарыстоўваліся з рэшткаў, якія заставаліся ад арэндная платы пасля закрыцця ўсіх функцыянальных выдаткаў Дома літаратара.

У меру магчымага аказвалася фінансавая дапамога на будаўніцтва ці выкуп кватэр, — Валянціне Аколавай, Уладзіміру Арлову. Апошні, наогул, трапіў быў у складаную сітуацыю, разам з іншымі пісьменнікамі, якім Літфонд замовіў кватэры ў гарвыканкаме, але не маючы сродкаў, сабраў іх з саміх "кватэраздабытчыкаў". А пакуль кватэры будаваліся ды даваліся, іх кошт падскочыў невымерна. І пісьменнікі нашы засталіся ні з чым, і грошы ім вярталі, але ў тых жа, ранейшых "знаках". Пацярпелыя справядліва патрабавалі кампенсацыі, Літфонд ухіляўся, як мог... Справа да суда даходзіла... Тады Саюз пісьменнікаў, па ўзаемнай дамоўленасці, і дапамог пацярпелым хоць у нейкай ступені перакрыць іх страты...

Арлоў жа "выпаў і са спісаў", калі даваліся кватэры ў доме для творчай інтэлігенцыі: нешта каля І кв. м. лішняга было ў яго: двухпакаёўка на чатыры душы, — два члены Саюза пісьменнікаў — і такая "бухгалтэрыя"... Прытым пра дадатковую плошчу для творчай працы і гаворкі не было. Праўда, праблему колькі месяцаў таму Уладзімір Арлоў і Валянціна Аксак усё ж вырашылі...

Дапамагаць у такіх сітуацыях, ясна ж, патрэбна.

І Саюз дапамагаў. Як дапамагаў матэрыяльна і ветэранам, і хворым — на лекі, і ўдовам, і проста таварышам, якія траплялі ў тую ці іншую бяду. Як тут не дапамагчы?

Вось учора літаральна па просьбе Брэсцкага аддзялення СП бухгалтэрыя аформіла дапамогу Святлане Курылёвай — 70 год, хворая, — невялікія грошы, але ўвага, можа, даражэйшая.

Спісы гэтыя доўгія...

Ну і самае сумнае — апошняе развітанне з сябрам, з паплечнікам па творчай працы. Усе выдаткі на пахаванне Саюз пісьменнікаў браў на сябе, — а гэта зараз — мільёны і мільёны...

Дом творчасці "Іслач" (як і ўсе дамы творчасці наогул — раней і цяпер) таксама не можа абысціся пакуль што без датацый. Саюз пісьменнікаў выкройваў пэўную падтрымку і "Іслачы": з арэндных сродкаў кампенсаваў кошт пуцёвак, выдзяляў грошы на паліва...

Зараз і гэтага няма... Арэндныя сродкі пайшлі на іншы рахунак...

Як быць далей? Трэба шукаць выйсце... У вырашэнні сацыяльных пытанняў Саюзу пісьменнікаў і Літфонду патрэбна адзіная структура, адзінае кіраўніцтва.

Справа ж ускладняецца тым, што беларускі Літфонд мае статус самастойнай арганізацыі, незалежны ад Саюза пісьменнікаў і замацаваны адпаведнымі актамі Мінюста... Помніце быў сход: я выступаў супраць "адлучэння" Літфонду ад СП, аднак адбылося тое, што адбылося: людзі адны і тыя ж, а арганізацыі — розныя...

Пэўна, ёсць сэнс нам вярнуцца да пытання і прывесці Літфонд у падначаленасць Саюзу пісьменнікаў. Хай застаецца ён, як і раней, юрыдычнай асобай, але ў статут ягоны і Саюза пісьменнікаў трэба ўнесці адпаведныя ўдакладненні. Пытанне, аднак, павінна быць вырашана, хай сабе і фармальна, асобным сходам — сходам членаў Літфонду.

Такая арганізацыйная карэкціроўка дапаможа спрасціць, зробіць аператыўнай дзейнасць творчага Саюза ў сферы сацыяльна-эканамічных праблем, — і выдавецкіх у тым ліку... Без гэтага падпарадкавання Літфонд успрымаецца паўсюль як нейкае камерцыйная структура... І, сама меней, патанае ў безлічы фондаў, якія адкрываюцца і множацца амаль па метастазнаму прынцыпу...

...Ці бачылі вы тэлевізійныя кадры аб разгоне амапаўцамі студэнцкай дэманстрацыі ў Екацярынбурзе (Свярдлоўску), дзе восем дзесяткаў гадоў таму было ўчынена д'ябальскае забойства? Дык вось — д'ябал зноў загрукаў там капытамі... Не-не, гэта не толькі тыя, раз'ятраныя, са шчытамі — гэтымі д'ябальскімі крыламі, і дубінкамі — гэтымі д'ябальскімі скіпетрамі, — яны ўсяго толькі выканаўцы волі д'ябла...

А ён — вы помніце? — з шалёным, скрыўленым тварам, штосьці істэрычна выкрыкваў сваім падначаленым, гэтым шчытападобным пачварам, што ў нейкай нечалавечай лютасці накідваліся з дубінкамі на юных, безабаронных студэнтачак і студэнцікаў... Думалася, што той, галоўны, дае каманду, каб спынілі гэтыя наскокі. А як выявілася, гэта ён "выраўніваў" шэрагі... Быў незадаволены, што "паламаўся" "баявы строй"... І глядзеўся ён назаўтра з экрана амаль святым анёлам — такі прычэсаны, прыгладжаны, з лагоднай — усмешкай ці што?, з прывабным жаночаму воку паласатым трохкутнічкам цяльняшкі з-пад расшпіленай кашулі... А ўчора — вы бачылі? — ужо не твар ягоны быў страшны, а рука — з канвульсіўна выцягнутымі ўздоўж сцягна, як удвая падаўжэлымі, пальцамі, нягнуткімі, схопленымі сутаргаю (гэта кадр ці мізансцэна ў будучую п'есу Аляксея Дударава, — такое не прыдумаеш, такое не ўбачыш і ў кашмарным сне, — такое можа паказаць толькі само жыццё, наша жыццё, рэальнае, сучаснае...).

Ці бачылі вы гэта і ці задумаліся: перад якімі бедамі і перад якімі страшылішчамі ў вобліку чалавека мы стаім, апынуліся?..

І ці не ясна цяпер: якая вялікая праца чакае літаратуру. Ужо не місія, а праца — "асенізатарская", як сказаў бы Маякоўскі (мы яшчэ не раз успомнім яго "Клапа" — клапы павыпаўзалі з усіх шчылін, клапы прагнуць крыві... Гэта іх спажытак, штодзённы харч іхні...).

Праца па ачышчэнні душ людскіх ад маральнай пошасці і брыдоты, малітва натхнёным словам мастака за ўратаванне боскіх пачаткаў у чалавеку чакае нас...

Дзякуй за ўвагу!..

ПАМЯЦЬ

Лепшае — у музыцы

У Магілёўскім музычным вучылішчы імя М. Рымскага-Корсакава прайшоў юбілейны вечар у гонар 100-годдзя першага дырэктара вучылішча Лазара Зісмана (1897—1964).

Ягонае імя добра ведалі ў свой час на Беларусі. У 1919 годзе ў Магілёве на базе рабочай музычнай студыі адкрылі першую дзяржаўную музычную школу ў Савецкай Беларусі. Хутка яе дырэктарам стаў Лазар Зісман, 23-гадовы таленавіты музыкант-самавук, сталяр па прафесіі.

Яркі музычны талент (ён граў на некалькіх інструментах), талент арганізатара, справядлівасць і патрабавальнасць у спалучэнні са шчодрай і добрай душой, — усе гэтыя якасці дырэктара першай у рэспубліцы музычнай школы дазволілі Лазару Маркавічу захаваць найвысокі аўтарытэт на многія гады і стаць дырэктарам Магілёўскага музычнага вучылішча, адкрытага ў 1937 годзе.

Ад пачатку 20-х Л. Зісман ствараў у школе калектыў з адукаваных і спрактыкаваных музыкантаў. Сярод іх былі скрыпач А. Яўстратаў — выпускнік Пецярбургскай кансерваторыі, А. Боркус — выпускнік Маскоўскай кансерваторыі, вучань У. Сафонава. Гісторыю і тэорыю музыкі вёў Ю. Дрэйзін, пазней вядомы беларускі музычны крытык (з ім Лазара Маркавіча звязвала вялікая дружба на працягу многіх гадоў). Дырэктар школы заражаў усіх выкладчыкаў сваім энтузіязмам і адданасцю справе. У цяжкія гады НЭПу, калі школа працавала на гасразліку, а выкладчыкі атрымлівалі жабрацкую зарплату, гэты энтузіязм дапамог школе выжыць.

Менавіта тады аркестр школы ўдзельнічаў у выкананні твораў М. Чуркіна: першай беларускай савецкай оперы "Вызваленне працы" (яна была пастаўлена ў Магілёўскім гарадскім тэатры) і сімфаньеты "Беларускія малюнкі".

З першых гадоў свайго існавання магілёўскія школа і вучылішча, дзякуючы ініцыятыве Л. Зісмана, давалі шматлікія канцэрты для гараджан, наладжвалі лекцыі-канцэрты і публічныя экзамены. На штогадовыя справаздачныя канцэрты школы ў гарадскім тэатры цяжка было трапіць: зала не змяшчала ўсіх жадаючых.

Лазар Маркавіч любіў арганізоўваць конкурсы выканаўцаў і нават у самы цяжкі час знаходзіў сродкі для падарункаў пераможцам. Таленавітых дзяцей ён накіроўваў на вучобу ў сталічныя ўстановы. Так, напрыклад, паслаў вучыцца ў Маскву дзяўчынку з дзетдома Таню Скародкіну — яна стала потым салісткай Вялікага тэатра Т. Талахадзе. Перавёў на вучобу ў Мінск скрыпача Мікалая Браценнікава — цяпер ён прафесар Беларускай акадэміі музыкі.

Да ўсіх студэнтаў Д. Зісман ставіўся як бацька — строгі, патрабавальны. Але і любіў іх. Ён разумеў патрэбы студэнтаў, дапамагаў ім, спачуваў. І кожнага ўцягваў у канцэртную дзейнасць: ці ў якасці салістаў-выканаўцы, ці як удзельніка аркестра, хору (у хоры спявалі ўсе студэнты вучылішча). Вучылішча ён змог зрабіць родным домам для кожнага. Невыпадкова выпускнікі, закончыўшы ўжо і кансерваторыю, вярталіся сюды выкладаць. Гэта зрабілася традыцыяй.

Л. Зісман быў дырэктарам школы і вучылішча да 1956 года, а потым да канца свайго жыцця ўзначальваў толькі школу. Закладзеныя ім традыцыі з'явіліся тым падмуркам, які трывала трымае вось ужо 60 гадоў адну з вядучых музычных навучальных устаноў Беларусі — Магілёўскае музычнае вучылішча імя М. Рымскага-Корсакава. Тыя ж традыцыі дазволілі сем гадоў таму адкрыць у Магілёве педагагічны факультэт Беларускай акадэміі музыкі.

На юбілейны вечар прыйшлі шматлікія вучні Лазара Маркавіча. Сярод іх — былая студэнтка, прынятая ў вучылішча ў год яго адкрыцця, — Б. Гелер, старэйшыя выкладчыкі, якія многія гады адпрацавалі з Л. Зісманам, — А. Мысаў, М. Нікіцін, І. Паўлаў.

У канцэртнай праграме ўдзельнічалі выкладчыкі і студэнты вучылішча, а таксама ягоныя выпускнікі — цяпер студэнты педагагічнага факультэта БАМ. Гэта салісты, лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў; духавы і цымбальны аркестр; акадэмічны і народны хоры; ансамбль скрыпачоў, струнны квінтэт і квартэт медных духавых інструментаў. Дастойна закончыў праграму аркестр народных інструментаў педагагічнага факультэта пад кіраўніцтвам выпускніка школы і вучылішча, цяпер дырэктара вучылішча і дэкана педагагічнага факультэта, заслужанага дзеяча мастацтваў і заслужанага настаўніка Беларусі Л. Іванова. (Дарэчы, арганізатара вечарыны).

Зала была поўная... Удзячную памяць пра Л. Зісмана захоўваюць нават людзі, якія не навучаліся музыцы. Гэтага чалавека ў Магілёве ведалі ўсе, бо ён здолеў зрабіць вучылішча і школу культурным цэнтрам горада, тым духоўным асяродкам, да якога цягнуліся магілёўцы. З яго жыватворных спраў пачыналіся лепшыя музычныя традыцыі сённяшняга Магілёва.

Вольга МАРОЗАВА,
выкладчык Магілёўскага музычнага вучылішча імя М. Рымскага-Корсакава

АБЯВЫ

ЛІЦЭЙ БЕЛАРУСКАГА ГУМАНІТАРНАГА АДУКАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАГА ЦЭНТРА

Абвяшчае прыём навучэнцаў на 1 курс (8 клас)

У ліцэі на паглыбленым узроўні вывучаюцца літаратура, гісторыя, родная і замежная мовы, гісторыя культуры, матэматыка (з 10 класа). Як першая замежная мова вывучаюцца: англійская, нямецкая, французская, іспанская, як другая — лацінская, польская, чэшская, англійская, нямецкая і іншыя мовы.

У ліцэй прымаюцца на конкурснай аснове навучэнцы, якія паспяхова скончылі 7 класаў. Свайго інтэрната ліцэй не мае.

Навучанне бясплатнае. Асноўная мова навучання — беларуская.

Пры паступленні праводзяцца наступныя іспыты:

28 мая — беларуская мова (пераказ ці твор на выбар).

30 мая — гісторыя Беларусі (вусна).

2 чэрвеня — замежная мова (вусна).

4 чэрвеня 1998 г. праводзіцца гутарка членаў прыёмнай камісіі з абітурыентамі, якія атрымалі найбольшую колькасць балаў. У гэтую колькасць залічваецца гадавая адзнака за 7 клас па матэматыцы.

Абітурыенты павінны прадставіць у камісію наступныя дакументы: асабістую заяву, мед. даведку (форма 286), завераны пячаткай табель паспяховасці за 7 клас.

Дакументы прымаюцца з 25 красавіка па 27 мая (табель паспяховасці — 27—28 мая) па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Кірава, 21, пакой сакратара. Тэлефоны для даведак: 2270467, 2275512.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Алесю МАРЦІНОВІЧУ з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.

Калектыў рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва" і часопіса "Крыніца" выказвае глыбокае спачуванне свайму калегу Алесю МАРЦІНОВІЧУ ў сувязі са смерцю бацькі.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Зіновію ПРЫГОДЗІЧУ з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці маці.

Нялёгка быць сейбітам

ПЕРАЧЫТВАЮЧЫ СПАДЧЫНУ ФЁДАРА ЯНКОЎСКАГА

Як і кожны студэнт-філолаг, я не мог не ведаць імя выдатнага мовазнаўцы Фёдара Янкоўскага. Тым большай была радасць сустрэчы ў 1975 годзе з кнігай яго абразкоў.

Мініяцюра, быль, невялікі аповед — гэта звычайна падгледжаная ў жыцці з'ява або падзея, у якой, нібы ў расінцы, адлюстравана быццё ў яго шматколернасці і разнастайнасці, высвечаны парыў чалавечай душы ці момант праявы мудрасці. Таму кожны радок нібы "наэлектрызаваны" думкай і пачуццём, уражвае маральнай цнатлівасцю і ўнутраным тактам асобы, якую льга ўбачыць як у горадзе, так і ў вёсцы.

Ф. Янкоўскі пражыў яркае і змястоўнае жыццё, шмат бачыў у ім і шмат перабачыў, досыць перажыў і меў уражанняў ад сустрэч з людзьмі і прыгожым, з людскасцю і чалавечнасцю, са злом і бядою. Ён не толькі хацеў, а і ўмеў расказаць пра ўсё гэта цікава і запамінальна.

Гэта цудоўна засведчана ў некалькіх кнігах яго прозы. Прозы па-свойму адметнай у нашай літаратуры, якая прыцягвае ўвагу не толькі саміх пісьменнікаў, а і таго дасціпнага чытача, які пастаянна мае патрэбу ў далучэнні да роднага слова.

Мова ў яго творах крынічна-народная, вобразная і каларытная, трапная і першародная, у ёй беражліва захаваны лад расповеду і гутарковасці. Яна мае адзнаку добрага густу, пазначана "пячаткай майстра" (М. Стральцоў).

Народ — гэта носьбіт і захавальнік найважнейшага свайго скарбу: Мовы. Рупліва, слоўка да прыказу, прымаўка да прыказкі, залацінка да залацінкі, збіраўся гэты скарб на працягу многіх стагоддзяў. Таму і не дзіўна, што гэткім самабытным дыяментам зіхціць у россыпе славянскіх моў наша родная мова. І як жа раўніва патрэбна берагчы яе сёння, калі гвалтам звужаецца сфера яе ўжытку і побыту!..

Выключна такою трывогай за яе лёс жыў увесь час Фёдар Янкоўскі. Пра гэта патрэбна памятаць, згадваючы яго і аддаючы даніну пашаны ўробленаму ім і зробленаму дзеля роскві нашай нацыянальнай культуры. Над яго кнігамі не задрэмлеш, не засумуеш. Іх ніколі не адкладзеш не дачытанымі да апошняй старонкі. А над тымі старонкамі ўзрадуешся і засумуеш, узрушышся і пагаруеш, адчуеш далучанасць да духоўнага ў чалавеку і прасвятленне ўласных думак. Ёсць людзі без прэтэнзій і амбіцый, якія жывуць, каб спаўна спраўдзіць наканаванае ім на зямлі і цаніць кожнае імгненне быцця, каб пакінуць пра сябе самую сціплую памяць. Такім можна толькі шчыра зайздросціць. Яны былі і ёсць соль нашай нацыі...

Заўсёды з нязменным хваляваннем бяру ў рукі, перачытваю і гартаю старонкі кніг "Абразкі", "Прыпыніся на часіну", "Радасць і боль", "Само слова гаворыць". Але штораз асабліва кранае мяне абразок "Развітанне"...

Настаўніца Алена Адамаўна цяжка захварэла. Не памагла ёй і аперацыя. Яна ўсведамляе, што дні яе злічаны. Але не гэта трывожыць жанчыну. Яна не дарае сабе, што не змагла да канца правесці ўрокі ў выпускным класе, непакоіцца, як здадуць юнакі і дзяўчаты экзамены.

Хлеб педагога не з лёгкіх. Яна і цяпер не ведае, які след пакінула ў душы кожнага з вучняў. Хоць заўсёды старалася аддаваць ім усе душэўныя сілы і веды, жыла іх радасцю і трывогамі.

А ў выпускнікоў свае клопаты. Ад дырэктара яны ведаюць, што дактары прасілі як мага менш трывожыць настаўніцу. Але яны любілі яе і хацелі б паслаць запрашэнне на свой баль. Ды што напісаць, чым суцешыць дарослага чалавека? Ну які ў іх жыццёвы вопыт? А мо і няма такіх слоў, якія здольны памагчы безнадзейна хвораму...

Атрымалася так, што дзеці не напісалі і не паслалі настаўніцы ніякага запрашэння. Цяжкае выпрабаванне для неакрэплых душ. Магчыма, адно з самых першых. Іх будзе нямала. Да гэтага льга рыхтавацца. Такая мудрасць пазнаецца праз вопыт і страты.

Ф. Янкоўскі напісаў такі сказ: "Алена Адамаўна труднавала дні і ночы". Якое трапнае знойдзена слова — **труднавала**?! Яно ёмкае і экспрэсіўнае. На жаль, яго няма ў пятым томе ТСБМ.

Труднавала — значыць **стамлялася, выбівалася з сіл і цярпела пакуту, хвалявалася, што нарабіла небыту блізкім, і гаравала пра сваю бездапаможнасць.** Ды ці мала яшчэ колькі сэнсу можна адчуць і ўбачыць у гэтым харошым народным слове!

Перад выпускным вечарам настаўніца папрасіла, каб яе ўмылі, пераапранулі, памянялі бялізну і паклікалі майстра з цырульні. Яна рыхтавалася да сустрэчы з вучнямі і хацела б выглядаць такой, як заўсёды, — сабранаю, элегантнай.

Змучаная хваробай, роздумам і спадзяваннем, што вучні не забылі пра яе і ведаюць, яна знепрытомнела, заснула. Пісьменнік не тлумачыць прычыны яе знебыцця. Піша сцісла і не збіваецца на лішноты і тлумачэнні. Абразок мае свой тон, сваю напружанасць на пачуццё і думку. Таму многае ў ім "прачытваецца" па-за тэкстам.

Ачнулася яна прыцемкам, калі ў школе якраз павінен быў пачацца выпускны баль. Гэтаму верыш. Чалавек высокай духоўнасці не можа не быць чуйным. У яго нашмат шырэйшае біяполе, а таму ён "чуе" покліч блізкай душы яшчэ зводдаль.

А дзеці сапраўды ў гэты момант думалі пра яе. Сваім абуджэннем яна як бы загадзя зрэагавала на іх намер. Хоць на астатку сілы, але яна павінна была чакаць іх прыходу.

Яны гэта ведалі, яны ў гэта верылі. Гэта і абавязвала іх пайсці з вечара і пабачыцца са сваёй настаўніцай. Не выключана, што ў апошні раз.

Алена Адамаўна была вельмі добрым педагогам і чалавекам. Яна аддала сваім вучням шмат душы і сэрца, шмат ведаў і розуму. Усё гэта патрэбна ім пранесці па самастойным жыцці. Ужо тады, калі яе на свеце не будзе. Яны многім ёй абавязаны, за многае ёй удзячны.

Выпускнікі падышлі да балкона настаўніцы і "...неяк асабліва мякка пачалі паўтараць: "Алена Адамаў-на! А-ле-на А-да-маў-на! А-лена А-да-маў-на!"

Які тонкі псіхолаг пісьменнік Фёдар Янкоўскі! Як трапна і пераканальна перадае ён унутраны стан вучняў, што **"...без слоў і, здаецца, не кранаючыся зямлі"** падышлі, **"...сталі, замерлі як здранцвелыя"**, а потым **"...неяк асабліва мякка пачалі паўтараць..."**

Як бачна, выпускнікі — гэта не толькі выхаваныя дзеці. Гэта ўжо і людзі, што стаяць на парозе сваёй сталасці. Яны робяць усё ўсвядомлена і асэнсавана. Яны ведаюць, да каго і ў які момант прыйшлі. Іх не трэба ўжо вучыць чуласці і далікатнасці.

Настаўніца свайго дачакалася. На шчасце, яна не памылілася ў іх, сваіх вучнях. Урэшце яна зразумела, што нездарма стала настаўніцай і пражыла сваё жыццё.

Гэта не магло не надаць Алене Адамаўне дадатковых сіл і ўпэўненасці ў сабе.

Таму "...першы раз за апошнія чатыры тыдні яна сама ўстала з пасцелі. Першы раз за апошнія чатыры тыдні прайшла пакой, выйшла на балкон..."

Гэтая сустрэча значыла для настаўніцы вельмі шмат. Менавіта цяпер, перад смерцю. Яна, спакойная за свой адыход, лёгка мовіла: "Цяпер можна..."

Не, не пасля гэтага апошняга радка, а яшчэ за чатыры-пяць абзацаў да канца абразка на вочы міжволі нагортваецца сляза і пад горла падкочваецца камяк нязвыклай чуллівасці. Як не расчулішся, калі ў гэтым жыцці знакам трагізму памечаны сам лёс чалавека, калі сустракаеш асобу і адчуваеш вышыню яе памкненняў і духу?!.

Але на свеце ёсць шмат чалавечнасці і чалавечнага. Трэба толькі ўмець іх заўважаць і бачыць. Трэба іх толькі належна цаніць.

Пісьменнік Фёдар Янкоўскі гэта бачыў, цаніў і расказваў пра прыгожае і харошых людзей гожа, мудра і ўсхвалявана. І мы ўдзячныя яму за такое бачанне жыцця і за такія маральныя ўрокі.

Але я мушу прызнацца, што асабіста мяне "Развітанне" гэтак кранае з другое прычыны. Я шчыра зайздрошчу тым, у каго ў школе была такая настаўніца. А яшчэ больш зайздрошчу тым, у каго ў школе быў выпускны вечар.

У мяне яго, на жаль, не было. Не па ўласнай віне. Проста пасля дзевяці класаў мяне ўмоўна выключылі са школы. Каб папомсціцца і прыпалохаць. І, галоўнае, што без дай жа прычыны! Толькі за тое, што зрэдчас падпускаў "шпількі" праз раёнку на адрас выпівохі — старшыні калгаса. А недалёкі дырэктар школы паслугаваў свайму лепшаму сябру. Дробная і нікчэмная помста.

Яна насмяшыла ўсю вёску. Але гэта не ўсцешвае, бо прамаўчалі тады настаўнікі. А былі ж сярод іх і неблагія...

Перачытваючы "Развітанне", я абавязкова штораз згадваю і сваю дарагую настаўніцу — выкладчыцу Мазырскага педінстытута Лідзію Іванаўну Прашковіч, сястру добра знанага ў свой час Міколы Прашковіча. Не толькі таму, што яна заўважыла мяне і падтрымала. Хоць і гэта значыць нямала.

Перадусім гэта быў выдатны спецыяліст, улюбёны ў літаратуру, вельмі сціплы і сарамлівы чалавек.

Згадваецца такое. Аднойчы перад званком выкладчыца аб нечым папрасіла маіх чатырох аднакурснікаў. На лекцыі я астаўся адзін з дзяўчатамі. Было крыху і няёмка. Таму запытаў, куды ж пайшлі хлопцы.

Выкладчыца сумелася, адале патлумачыла, што папрасіла іх пакалоць дровы. Разам з сяброўкай яны жылі ў старым інтэрнаце, дзе паліліся грубкі. Я сказаў, што пайду з імі. Яна не пярэчыла.

Піла і сякера — звыклыя для рук вясковых хлопцаў прылады. Працавалася нам усмак і ўвішна. Крыху больш як праз дзве гадзіны яшчэ здалёку я заўважыў выкладчыцу. Яна спяшалася з інстытута. Лёгка было здагадацца, што потым яна абавязкова запросіць памочнікаў на пачастунак.

Сядзець з ёй за адным сталом, нешта браць з талерак і есці пры ёй? Не, на падобнае святатацтва мяне не хапала. Я ж уяўляў, што жыве яна зусім не так, як усе людзі, што яе жытло акружана нейкай адметнаю аўрай. Ёсць жа мяжа, якой нельга пераступаць у чалавечых адносінах!

Было тут яшчэ і вясковае, прывітае змалку. Калі ў хаце госць, то на стол абавязкова ставілі лепшае, з прыхаваных запасаў. Нам тады катэгарычна забаранялася быць пад рукамі ў дарослых. Можна было толькі прашмыгнуць у другі пакой з вуліцы ці на вуліцу. Так прывівалася нам пачуццё сарамлівасці.

Гэтаксама ў гасцях. Можаш нешта і ўзяць, але не капрызь і не скнарнічай. Ва ўсім трэба знаць меру!

Святая навука нашых мудрых бацькоў!

Упэўнены, што менавіта твой адгалосак пачуў я тады перад прыходам выкладчыцы. Таму і пакінуў сваіх аднакурснікаў.

Потым яны расказвалі, што выкладчыца гэтаму не здзівілася і нават не папытала, чаго ж мяне няма. Распавядалі, як і чым яна іх частавала, і ніяк не маглі зразумець майго ўчынку.

І што я мог ім патлумачыць?!

...Павечная людская ўдзячнасць Сейбітам: за хлеб і спагаду, за мудрасць і дабрыню.

Алесь ЛІСІЦКІ
г. Петрыкаў

Марцін КОЎЗКІ

Доля праўды

Спартыўныя гульні? Глыбокі ўздых, знак расчаравання. Няма пакуль што ў нас сваіх майстроў забівання... "Народны мастак", "народны артыст", а дзе, скажыце, "народны рэгбіст", дзе "хакеіст народны"? Чуеце на трыбунах свіст, не атрымліваецца ў нас са спартыўнымі гульнямі, згодны? Ды ёсць усё ж надзея, што і ў Забалоцці заднее, вунь колькі нас на стадыёнах балдзее! Адчайвацца не будзем, з намі лепшыя людзі!

●

Хто там смяецца апошнім, апошнім можа кожны. Гэтак як проста, браткі, апошнім запляскаць у ладкі. А вось рассмяяцца першым ты, разявака, зможаш? Смех — экзамен на дзёрзкасць, а на дзёрзкасць здольны не кожны. Вечная няўвязка з гэтым смяяцца ці пляскаць.

●

Пагалоска наперадзе цябе бяжыць, будзь ты летуценнікам ці зухам. Пра ката казалі: "Мышэй пайшоў лавіць", а ён толькі шум лістоты слухаў. А што да шуму спрычыніліся мышы, дык так яно выйшла.

●

— У цябе столькі ног, як ты іх не ламаеш? — спытаўся конік у сараканожкі. — Што ты на дваіх скачаш — гэта твая ўдача, — адказала сараканожка, — але колькі да тых дваіх у цябе запасных? Маўчыш, нядбалец, не стракочаш. То-та ж!

●

Абураўся: колькі ў нас вьяў гэтага карніка маскоўскага, ці не ў кожнай установе з кратамі. А хіба не было ў Вялікім княстве Літоўскім сваіх катаў! Дык ад якой спадчыны мы адракаемся і якую прымаем, каго з карнікаў бяром у напарнікі? І каму ставіць абеліскі — далёкім ці блізкім?

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА — ЛіМ — ТВОРЧЫ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ТЫДНЕВІК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Галоўны рэдактар Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Мікола ГІЛЬ — *намеснік галоўнага рэдактара*
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ,
Жана ЛАШКЕВІЧ,
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,*
Віктар ШНІП — *адказны сакратар*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 2332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2332-525, 2331-985

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 2332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 2331-985
літаратурнага жыцця — 2332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2331-985
паэзіі і прозы — 2332-204
музыкі — 2332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2332-153
выяўленчага мастацтва, аховы помнікаў — 2332-462
навін — 2332-462
мастацкага афармлення — 2332-204
фотакарэспандэнт — 2332-462
бухгалтэрыя — 2366-071

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856.
Наклад 4282
Нумар падпісаны ў друк 7.5.1998 г. у 17.30.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 999
Заказ 2481/Г

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12